НАША НІВА

Беларуская газэта

№11, 1994

КЭН КІЗІ, аўтар «Палёту над зязюліным гняздом», пасьля шматгадовага перапынку выдае новы раман і дае аптымістычнае інтэрвію.

КАЎКАЗ вяртаецца ў расейскую літаратуру. Адоеўскі, Лермантаў... Хто наступны паедзе туды, каб са зброяю вырашаць свае «душэўныя» праблемы?

ЭДУАР БАЛЯДЗЮР кажа, што нам трэба выбіраць: альбо СНГ, альбо Эўрапейскі Зьвяз. У кожным выпадку эўрапейская стабільнасьць закончыцца на нас.

АЛЬБЭР КАМЮ. Праз трыццаць гадоў пасьля гібелі пісьменьніка яго дачка згадзілася на публікацыю апошняга рамана Камю. Сёлета кніга выйшла ў Парыжы.




Здымак Алены Адамчык

НОВАЭЎРАПЕЙСКІ РЭГІЁН

МАГІЛЁЎСКІ НУМАР «НН»

Фундатар гэтага нумару — Магілёўская Рада БНФ



Магілёўская кафля XVII стагодзьдзя

Мясакамбінат і элеватар

Сяргей Мацёры

Мяне накіравалі да другога ці трэцяга намесьніка мэра.

— Вы ўжо пішаце? — сказаў малады чыноўнік, — я буду чытаць запар, а вы натуйце, што трэба, — і апусьціў вочы ў свой нататнік. — Гісторыю я апускаю, прачытаеце ў энцыкляпэдыі, — ён перагарнуў некалькі старонак. — Ага. Самае буйное прадпрыемства — мясакамбінат.

— Мясакамбінат? — дзелавым голасам перапытаў я.

— Так. Мясакамбінат. І элеватар. Элеватар.

— Зразумела. Элеватар. А які зь іх буйнейшы?

— Мясакамбінат.

— Мясакамбінат?

— Так. І элеватар. Яны аднолькавыя.

— Зразумела.

— Пойдзем далей. Дзьве школы. Сярэднеадукацыйныя. Рэстаран... — раптам ён нэрвова падняў вочы, — а што вас уласна цікавіць? Я не разумею. Што тут увогуле можа цікавіць? Вы прыехалі на адзін дзень, але тут ня Рым ці якая там Аўстралія. Тут нічога цікавага няма.

— А элеватар? — сказаў я, баючыся, што ён успрыме гэта як зьдзек. — А мясакамбінат?

— Яны аднолькавыя, — мэханічна адмахнуўся чыноўнік. — Я, ведаеце, сам тут не надоўга. Неабходная прыступка ў кар'еры. Звычайна турысты абмінаюць гэты край. Хіба што нехта заблукаецца. Тады ходзяць, фатаграфуюць, абмяркоўваюць... Нейкія руіны, цэрквы нейкія. Ім гэта цікава. Але вы ж мясцовы чалавек...

Пры гэтых словах ён азірнуўся. Але мяне ў кабінэце ўжо не было...

Адваротны бок сэнтымэнтаў

Андранік Антанян

ПАДАНЬНЕ

Назва гораду — Магілёў — мае не такую відавочную этымалёгію, як, скажам, Прапойск або які-небудзь Брагін, але й не хавае сваіх каранёў, як Масква, што напачатку была толькі Кучкай, бо пачатак сталіцы Расейскай Фэдэрацыі даў баярын Кучка, а распавёў пра гэта мне й маім аднакурсьнікам выкладчык старажытнай расейскай гісторыі з прозьвішчам Кучкін.

Што тычыцца Магілёва, то адныя гісторыкі кажуць, што назва паходзіць ад уласнага імя аднаго з князёў Льва Могія (Магутнага), які валодаў местам на берагох Дняпра й Дубравенкі; другія кажуць, што магутнасьць тут ні пры чым, што гэта толькі «мох і лоў», маўляў, у старадаўнія часы тут толькі й рабілі, што рыбу лавілі ды мох скублі. Але бадай у кожнай кніжцы па гісторыі гораду можна прачытаць сэнтымэнтальнае паданьне пра паходжаньне назвы сёньняшняга абласнога цэнтру й яго амаль мітычнага заснавальніка.

Жыў-быў хлопец Машэка й кахаў ён дзяўчыну Наталку, і ўсё было б добра, каб не зьявіўся на даляглядзе злы й пажадлівы Пан, натуральна не казланогі (бо тыя зблашаля вясёлыя й на флейтах граюць), які й адбіў у Машэкі яго каханую ды зьвёз яе ў свой замак. Ці ўмеў спакусьнік граць на флейце — паданьне маўчыць, але дакладна вядома, што ён меў багацьце. І вось багацей пры першай жа нагодзе быў забіты мужным Машэкам. Але й Машэка пасьля гэтага ня вельмі прыгожага ўчынку пражыў ня доўга, і сам неўзабаве прыняў сьмерць з рук жанчыны сваёй мары, якой, як высьветлілася, хацелася не каханьня, а багацьця. Хлопцы зь непадзеленымі пачуцьцямі пахавалі ў кургане, ды назвалі курган Магілай Льва. А пасьля на тым месцы пачаў расьці горад. У памяць аб гэтых падзеях адзін з раёнаў і сёньня называць Машэкаўкай. Пясьняр «касы й сахі» напісаў на гэтым матэрыяле ажно цэлую паэму, а магілёўскі піўзавод, які яшчэ ня так даўно славіўся якасьцю сваёй прадукцыі, выпускаў піва «Машэка», якое вельмі любілі сябры адзінай у горадзе больш-менш нацыяналістычнай суполкі «Машэка». І я там быў, і піва піў...

...

Дзіўны народ магілёўцы. Яны самі ня ведаюць, да якога этнасу яны адносяцца, на якой мове размаўляюць. Гэта ня віленскія «тутэйшыя», што будуць размаўляць з табою па-беларуску, але ніколі не прызнаюцца ў сваім беларускім паходжаньні. Гэта нават ня менскі варыянт, калі людзі ў хаце, на вуліцы, на працы гавораць падкрэсьлена па-расейску, а як толькі выходзяць у сыботу з электрычкі на роднай станцыі, адразу ж «расслабляюцца» — гавораць па-беларуску. У Магілёве ж

Працяг на старонцы 8

Дзёньнік прыватнага чалавека



1.

Да сярэдзіны 80-х, калі беларушчына была яшчэ зусім неафіцыйная, падпольшчыкі гаварылі пра вонкавыя правакацыі расколу Беларусі — дзьве рэлігіі, два моўныя й культурныя магнэсы за межамі: польскі й маскоўскі. Сёньня, калі Беларусь становіцца суб'ектам, гэтыя правакацыі як бы перамяшчаюцца ўсярэдзіну. Расейскае праваслаўе зь яго антызаходніцтвам і саборнасьцю з аднаго боку і каталіцкія сымпатыі да «ўсялякіх» палякаў ці літоўцаў, індывідуалізм — з другога. Тут варта зазірнуць у Абдзіраловіча: усход непрымірымы ў сваёй адназначнасьці, захад — каварны, але кампрамісны. Як прымірыць і захаваць ад расколу? Сам тып адносінаў, зразумела, мусіць быць абраны заходні, г.зн. кампрамісны. Але калі такі тып адносінаў прыме (дакладней, верне сабе) беларускае праваслаўе?..

2.

Школьная парачка Пушкін-Лермантаў, калі прыглядзецца, выглядае парай антонімаў. Як і сацрэалістычная пара Колас-Купала. Спакусьліва параўнаць іх паміж сабою. Пушкін хто? Па-мойму, Колас. А Купала — Лермантаў. Цяпер мы ўтварылі сапраўдныя сынанімічныя пары.

Першыя — людзі з багатымі жыцьцяпісамі, пэрсанажы, самасьці. Другія — людзі безь біяграфіі, праваднікі, абалонкі.

Першыя — дубы славяншчыны, традыцыі, гаспадары ў літаратуры, сьцьвярджальнікі мовы, пасьлядоўныя нацыяналісты. Другія — падпалыя польскім і жыдоўскім уплывам, мадэрнізму, разгубленасьці ў сьвеце.

«Мадэрнізм» Лермантава знайшоўся пасьля ў Лесьмяна:

Хай дзяўчына, якой авалодаць ня здолеў,
Ляжа ў холад магільны той змрочнай юдолі!
Непрытомная, слабкая, змружыўшы вочы,
Хай заходзіцца юрам адна сярод ночы!
Хай ня плача, ня сьніць і ня верыць нікому
— Хай ляжыць для мяне —
хай ляжыць нерухома!

Каханьне, не падзеленае пры жыцьці, мусіць усё ж зьдзейсьніцца ў магіле. Лермантаў:

Когда ж стеснится уж кладбище,
То ваше узкое жилище
Разроют смелою рукой...
И гроб поставят к вам другой.
И молча ляжет с вами рядом
Девица нежная, одна,
Мила, покорна, хоть бледна...

Слова, якое зьвязвае гэтыя два настроі — «адна»...

Гэты «мадэрнізм» праз «Маладую Польшчу» і прывандраваў да Купалы...

А ўспомнім процілеглыя рэакцыі Пушкіна й Лермантава на польскае паўстаньне 1831 г...

Культ першых — здароўе, моц, зямля, дом, дзяржаўнасьць. Культ другіх — пакута, марнасьць жыцьця, хвароба, нуда, дарога. Гэта душы прыкаяныя і душы непрыкаяныя.

А ўзгадаем канфармізм Пушкіна й Коласа, і пакуту ад канфармізму Лермантава й Купалы, рэвалюцыйнасьць апошніх.

Гэта працяг тэмы «песьняры й паэты», якая была распачатая ў адным зь мінулых нумароў «НН». Лермантава й Купалу ад Пушкіна й Коласа адрозьнівае схільнасьць да прароцтва й трапнасьць прадказаньняў. Нават тое, што згубіла Купалу, прадбачыў Лермантаў:

Настанет год, России черный год,
Когда царей корона упадет;
Забудет чернь к ним прежнюю любовь,
И пища многих будет смерть и кровь..
И зарево окрасит волны рек:
В тот день явится мощный человек,
И ты его узнаешь и поймешь,
Зачем в руке его булатный нож:
И горе для тебя! — твой плач, твой стон
Ему тогда покажется смешон...


Ці зможам мы ў Купалы вычытаць тое, што згубіць нас?


3.


Калі б палітбюро працягнула яшчэ гадоў 10, то, магчыма, першыя зародкі незалежніцтва 70-80-х у Беларусі пры сучасных тэмпах разьвіцьця маглі б разьвіцца ў паважны дысыдэнцкі рух. Тады, ва ўмовах выразнага падзелу дабра й зла, усё, што рабілася й прымалася на сьветлым баку, было чыстае і як бы адзіна магчымае. А сёньня, калі нехта спрабуе дамаляваць недаробленую карціну нацыянальнае ідэі, абавязкова знойдзецца й нехта, хто падумае, што той робіць гэта нячыстымі рукамі. Паступова ўсе пачынаюць разважаць так: лепш не дамалёўваць, бо ўсё адно сапсуеш. «Час ня той». А час прыйшоў такі, што абраз нацыянальнае ідэі мусіць быць выстаўлены на покуці. І недамаляванасьць замінае разважаць пра *sacrum*.

У нас ёсьць герб і сьцяг, таму што мы вызначыліся зь імі яшчэ пры палітбюро. Але ў нас няма гімну, таму што пры палітбюро ў якасьці гімна мы сьпявалі некалькі песень.

Што яшчэ не было зроблена там, і ўжо немагчыма так зьлёту зрабіць тут?







Два гады з Лабановічам

Сяргей Шыдлоўскі

Слова мае свавольны нораў і амаль чалавечую прагу да жыцьця. Аднойчы зьявіўшыся, адліўшыся ў мастацкі вобраз, яно не жадае ўжо зьнікаць. Гэтыя нататкі, па сутнасьці, — мая капітуляцыя перад яго ўпартай сілай, кроніка двухгадовай барацьбы.

* * *

Упершыню як інтэлігенцкі архетып, носьбіт ідэалаў, прымхаў і хібаў адраджэнскага пакаленьня, Лабановіч паўстаў у маёй сьвядомасьці два гады таму. Яго досьвед быў тоесны досьведу некалькіх генэрацыяў сьвядомых беларусаў, што ад нашаніўскіх да нованашаніўскіх часоў складалі сапраўды АДНО пакаленьне, — мала таго — адзін народ: інтэлігенцкі, выкрышталізаваны ў славянскіх нетрах. Была ў яго альтэрнатыва — пераўтварыцца ў касту, ці зрабіцца стрыжнем фармаванай беларускай нацыі, скіравацца да сацыяльна-эканамічнага й палітычнага посьпеху... Такім, якім я пабачыў яго тады, ён быў ужо няздатны ані да першага, ані да другога.

... Гэта адбылося аднойчы на лекцыі па беларускай літаратуры, — Лабановіч матэрыялізаваўся на маіх вачох у абліччы выкладчыка-лектара.

Прафэсійнай тугой была афарбаваная яго манэра размаўляць і трымацца на людзях....

З акцэнтаваным замілаваньнем ён казаў аб той жаласьлівай моташнасьці, якая мела назоў «курс па гісторыі дакастрычніцкай і пакастрычніцкай беларускай літаратуры»...

Ён жаліўся на былыя часы й неспрыяльныя ўмовы, але дзіўнай настальгіяй сьвяціліся ягоныя вочы. Якую радзіму аплакваў у ягоным сэрцы мэлянхалёвы палянэз Агінскага (ён казаў нешта тады аб ім). Чаму вольныя рытмы незалежнага жыцьця не складаліся для яго ў новы гімн? Ён быў малады... але якой архаічнай безнадзейнасьцю патыхала ад ягонай манумэнтальнай паставы...

Менавіта тады я й зразумеў, што гэта Лабановіч, і ягоная беларускасьць ня мае нічога агульнага ані з жывой сучаснасьцю, ані з будучыняй Беларусі. Неяк хутка пасьля гэтага ў мяне зьявілася задума апавяданьня, галоўным героем якога быў беларускі інтэлігент, хворы на адраджэнскі сплін, абцяжараны постперабудовачным скепсісам — гэткі Лабановіч-дэкадэнт. Прадчуваючы закалот і розную безнадзейнасьць, ён зьяжджае ў вёску, дзе займаецца зьбіраньнем ручнікоў ды калаўротаў. Уважаючы сябе Апошнім беларусам, ён бядуе аб лёсе Бацькаўшчыны й наракае на тых, хто намагаецца нешта палепшыць, парушаючы сваёй мітусьнёю гістарычную веліч моманту — згасаньне нацыі...

Задума, зрэшты, так і засталася задумай, што не замінала ёй разьнявolена разьвівацца ў маёй падсьвядомасьці, — мой Лабановіч-дэкадэнт стаў цікавіцца гісторыяй апошніх часін Пампэі. І вось аднойчы, калі ён, седзячы ў сваёй хаце, вывучаў нейкую манаграфію, раптам зазьвінелі шыбы, пасыпаліся кніжкі з паліцаў — землятрус... Лабановіч у сполаху выбягае на двор, мкне некуды па дарозе, падае тварам у глей, і такім чынам знаходзіць нарэшце духовую раўнавагу.

... Далей ужо нельга было марнаваць гэтую задуму, — яшчэ крыху, і над вёскаю Лабановіча-дэкадэнта пачалі б лётаць цмокі. Задуму трэба было рэалізаваць, прычым у найбольш цьвярозай і рацыянальнай форме. Гэтак зьявіўся артыкул «Разьвітаньне з Лабановічам», дзе ён паўстаў нарэшце такім, якім і быў, — не ахвярным чалавекам, а ахвяраю, нязвыклай да вольнага жыцьця, якое ў сёньняшняй Беларусі азначае Канкісту — стварэньне канкурэнтаздольнай цывілізацыі.

Але й гэтая рэч не пабачыла сьвету. Я яе зьнішчыў.

Зьнішчыўшы артыкул, я зрабіў вялікую памылку, бо зьнішчанае слова робіцца толькі больш агрэсыўным і неадчэпным. Гэтак і адбылося. Вобраз Лабановіча працягваў тэрарызаваць маю фантазію й вымагаць свайго літаратурнага ўвасабленьня, не зважаючы на ўсе перасьцярогі і довады аб немэтазгоднасьці.

Перасьцярогаў сапраўды хапала. Ад вялікалітоўскай ідэі, што высьпявала ў магнацкім асяродку — праз фальклёрнае бытаваньне ў сялянскіх нетрах — да постмадэрновых гульняў сучасных інтэлектуалаў. Вось ён Беларускі шлях, — цяжкое выпрабаваньне, — і ці варта ўшчуваць папярэднікаў, якія йшлі па ім, за апатыю — яны ЗДАРОЖАНЫЯ людзі.

Сапраўды, гэты артыкул ня меў бы сэнсу, калі б не мацавалася ўпэўненасьць, што на зьмену адраджэнскаму пакаленьню Лабановіча йдуць новыя сілы, што іх імпэт скіраваны на тое, каб замураваць тую шчыліну безыніцыятыўнасьці, пасыўнасьці, што хавалася пад найменьнем «рахманасьці» — пад аховай якой Лабановіч прызвычаіўся ўнікаць чыннасьці ды пасьлядоўнасьці. Новыя людзі могуць зрабіць беларушчыну нэрвам тутэйшага жыцьця і стаць урэшце стрыжнем фармаваньня беларускае нацыі.

* * *

Калі я пачынаў пісаць гэты артыкул, то зьбіраўся пільна сачыць за сваёй інтанацыяй, каб ня зьбіцца ані на сэнтымэнты, ані на дыдактызм, — іншымі словамі, авалодаць тэмай, не падпадаючы пад яе ўплыў. Урэшце мяне зацікавіла прырода гэткага падсьвядомага адштурхоўваньня — ад Лабановіча.

Я БАЧУ ЭЎРОПУ НАРОДАЎ

З інтэрвію Эдуара Балядзюра, прэм'ера Францыі, газэце «Polityka»



Мая канцэпцыя Эўропы не палягае на уніфікацыі дзяржаваў — у працэсе адміністрацыйнага прыпадабненьня, які адбываўся б з айчынамі. Я бачу Эўропу народаў — якія захоўваюць сваю спэцыфіку, культуру й гісторыю. У такім кантэксьце сувязі паміж краінамі, навязаныя за стагодзьдзі, захоўваюць усю сваю вартасьць і значэньне. Гэтыя сувязі крыху паслаблі ў часе халоднай вайны. Новая сытуацыя ў Эўропе дазваляе вярнуць ім усю колішнюю прыветнасьць...

— З вашым імем зьвязваецца плян стабілізацыі ў Сярэдняй і Ўсходняй Эўропе. Ці ня думаеце вы, што Эўрапейскі Зьвяз — найлепшая «спакойная прыстань», якая створыць стабілізацыю? Ці ваш плян гэта таксама задача тыпу: найперш пакажэце, што можаце?

Абедзьве канцэпцыі дапаўняюцца. Я згодны, што Эўрапейскі Зьвяз праз сам факт свайго йснаваньня адыгрывае стабілізацыйную ролю на кантынэнце... Справа найперш у тым, што ўсе ўдзельнікі Зьвязу дзейнічаюць *en bonne entente*, у добрай згодзе. Гісторыя француска-нямецкага паяднаньня — найлепшы прыклад гэтага. Калі б нам не ўдалося гэтае паяднаньне, настолькі беспрэцэдэнтнае, то ясна, што Эўрапейскі Зьвяз ня быў бы сёньня полюсам стабільнасьці. Вось чаму ў часе, калі Зьвяз пастанавіў пашырыцца — мы зьвяртаемся да краінаў-кандыдатаў: найперш усталюйце між сабою правілы добрага суседзтва, асабліва ў справе межаў і нацыянальных меншасьцяў — каб яшчэ больш узмоцніць стабілізацыйную сілу Зьвязу.

— Як атрымалася што вы здолелі паяднаньне зь Нямеччынай пасунуць так далёка?

Што да Францыі й Нямеччыны — праўда, што мы дайшлі да такога стану супрацоўніцтва, які рэдка дасягаецца паміж дзвюма краінамі. Трэба аднак узяць пад увагу факт, што гэтае супрацоўніцтва пачалося даўно і ёсьць плёнам імпульсу, які надалі яму два выдатных чалавекі: генэрал дэ Голь і канцлер Адэнаўэр.

— Бяз гэтага француска-нямецкага фундамэнту Эўропа ня мае сэнсу, так?

Калі француска-нямецкае паяднаньне было такое хуткае, такое поўнае й такое шчырае, то толькі таму, што адносіны паміж дзьвюма краінамі ўпісаліся ў эўрапейскія рамкі. Я не люблю казаць пра «француска-нямецкую вось», але факт, што калі Францыя й Нямеччына згаджаюцца — будаваньне Эўропы пасоўваецца хутчэй, і выразна кульгае, калі абедзьве дзяржавы стаяць наўзбоч.

Аднак гэты двухбаковы саюз не выключае іншых. Асабліва маю на ўвазе Польшчу: у апошнія гады разьвілася абяцальнае трохбаковае супрацоўніцтва зь Нямеччынай і Францыяй. Я хацеў бы, каб яно ўмацавалася яшчэ болей — у пэрспэктыве пашырэньня Эўрапейскага Зьвязу.

— «Айцы Эўропы» — Робэр Шуман, Жан Манэ — французы. Францыя належыць да ініцыятараў Зьвязу. Але здаецца, што «тэндэнцыі адзінства» слабнуць. Растлумачце, як сталася, што ў гучным рэфэрэндуме ў Францыі Маастрыхцкія пагадненьні прызнала нязначная большасьць галасоў? У Англіі пра спадара Дэлёра кажуць амаль выключна ў кплівым тоне. Хіба будаваньне Эўропы пайшло ў кепскім кірунку?

Вашае пытаньне ўключае два аспэкты. Я не лічу, што можна сказаць, што «праэўрапейскія тэндэнцыі» сёньня аслаблі. Наадварот, мінулы год даверў зацікаўленасьць аб'яднанай Эўропай. Перамовы GATT, якія маюць падставовае значэньне для Францыі і ўсіх эўрапейскіх краін, не маглі б прывесьці да пасьпяховага вырашэньня для эўрапейцаў, калі б яны не былі аб'яднаныя. Грамадзяне розных краін Эўрапейскага Зьвязу хочуць, каб Эўропа была ўсё больш моцная на міжнароднай сцэне, напрыклад, у югаслаўскім крызысе.

Іншая справа, пытаньне, ці францускія грамадзяне, грамадзяне іншых краін, задаволеныя спосабамі функцыянаваньня Супольнасьці. Не ўваходзячы ў дэталі і не ацэньваючы па дробязях эўрапейскую адміністрацыю — якая зрэшты адыгрывае карысную ролю — лічу, што істотна нарастаюць крытычныя настроі адносна чагосьці, што ўспрымаецца як занадта тэхнакратычная структура, якая не шануе спэцыфікі ці нацыянальных традыцыяў. Гэты настрой цалкам зразумелы. Дзеля гэтага францускі ўрад хоча вярнуць народам іх месца ў будаваньні Эўропы, а асабліва запэўніць прымат палітычным вырашальным інстанцыям — тым, якія прадстаўляюць дзяржаву — над інстанцыямі адміністрацыйнымі. Выпраўляючы скажэньні, да якіх дайшло апошнімі гадамі — мы ўмацоўваем падтрымку грамадзкай думкі асобных краін для будаваньня супольнай Эўропы. Да такой мэты мы ідзем пад клічам: «наблізіць Эўропу да грамадзян». Гэта будзе адной зь першых нашых амбіцый, калі Францыя прыме кіраўніцтва Зьвязам з 1 студзеня 1995 г. Гэта таксама будзе адна з падставовых тэм Міжурадавай Канфэрэнцыі ў 1996 г.

— Ці тая «палітычная й абаронная Эўропа» будзе расьцягвацца ад Атлянтыкі да Камчаткі — як прапануюць некаторыя — ці ад Атлянтыкі да Ўралу, як хочуць іншыя — ці ад Брэста ў Брэтані да Берасьця над Бугам?

Трэба прыбраць усялякую двузначнасьць у пытаньні межаў гэтай эўрапейскай канструкцыі. На нашым кантынэнце існуюць дзьве галоўныя падсуполкі *(sous-ensembles)*. Адна зь іх — Эўрапейскі Зьвяз, які пашыраецца. Другая — гэта Расея й Садружнасьць Незалежных Дзяржаваў. Гэтыя дзьве падсуполкі злучае сувязь з супольнымі падставамі, выказанымі ў КБСЭ. Неабходна паглыбляць супрацоўніцтва паміж гэтымі двума палюсамі. Трэба ўсталяваць сапраўднае «партнэрства даверу» ва ўсіх аспэктах, якія датычаць стабільнасьці кантынэнту. Зрэшты, ясна, што Эўрапейскі Зьвяз не намерваецца расьцягнуцца на ўсю Эўропу — у геаграфічным сэнсе — і не мяркуе растапіцца ў панэўрапейскім руху. У кожным разе не ў агляднай пэрспэктыве.

«Товарищ, верь...»

Антон Сіюль

Кізьляр, адзін зь нешматлікіх горадоў — «герояў грамадзянскае вайны», — шэры й малапрыкметны райцэнтар у Дагестане. Тут няма нават славутых гораў. Адзіная тутэйшая прыкмета — чыгунка, рух па якой адбываецца толькі ў двух накірунках — на Поўдзень і на Поўнач, на Каўказ і з Каўказу. Насельніцтва Кізьляру ў сорак тысячаў чалавек належыць да трох дзясяткаў асноўных нацыянальнасьцяў, палова зь якіх — карэнныя...

Была аксамітная паўднёвая ноч. У лінейным упраўленьні міліцыі Кізьляра мы чакалі да раніцы вырашэньня сваіх праблемаў. Міжволі кідалася ў вочы расавая разнастайнасьць тутэйшых міліцыянтаў. Неўзабаве высьветліўся і сэнс гэткай укамплектацыі...

Па чыгунцы сюдою праяжджаюць цэлымі вагонамі людзі розных моваў. Часам яны ледзьве валодаюць расейскай. Асабліва тыя, хто не служыў у войску, каго ня бралі з-за малалікасьці этнасу. Фактар неразуменьня мовы, тут прывычны й вядомы, змушае мясцовых людзей трымацца за цывільныя ўстановы, або наадварот — спэкуляваць гэтым. Дзеля паразуменьня зь людзьмі патрабуецца пэўная колькасьць работнікаў, якія ведаюць іхнія мовы. Інакш рады не дасі. Вось чаму ў дагестанскую міліцыю набіраюць пярэсты штат.

... Сярод начы зьмяняюцца міліцэйскія пасты. Цыбаты й руды чачэнец адмаўляецца йсьці ў нарад з расейцам, настойваючы, каб зь ім ішоў чачэнец. У выніку выхад у нарад затрымліваецца. Не дапамагаюць угаворы начальніка. Размова вядзецца ў жорсткіх, але вельмі роўных танах. Падобна, гэта ня першы раз. Чачэнец усё ж настаяў. Міліцыянтаў перараразмяркоўваюць наноў.

Міліцыянт-расеец, стомленага выгляду немалады чалавек, туга ўвабраны ў партупею, моўчкі выходзіць на ганак. Раптам ён абрынаецца лаянкай. На чачэнцаў, на таго міліцыянта Ахмета, на ўвесь сьвет. «Ды гэтыя чачэнцы павінны рускім ногі мыць і ваду з таго піць!» — шалее расеец (які, высьвятляецца, украінец), ледзьве не глытаючы папіросу. «Ты гэтаы вялікадзяржаўны шавінізм кінь», — нарэшце флегматычна адгукаецца адзін зь міліцыянтаў, каржакаваты, але інтэлігентны з твару лакец. Астатнія (усе каўказцы) абыякава маўчаць. Іх ня тычыцца. Прывыклі. Разыходзяцца. Застаецца адзін лакец. Апраўдвае Ахмета.

Інтэлігентны лакец нам спачувае. Распавядае: вучыўся ў Магілёве (прывітаньне Лене), Рызе, Маскве, але вярнуўся. Хоць міліцыянт, але на радзіме. Падрабязна тлумачыць, дзе які народ тут жыве. У самога жонка лачка, пяцёра дзяцей. Малодшы сын — Шаміль. Ён нікуды ня зьедзе, мусіць быць пры бацьках. За тое яго песьцяць. Спадчына будзе за ім... Чаму Шаміль? Шаміль жа быў чачэнец.

— Шаміль быў наш герой.

Разьвіднела. Нашы праблемы ўлагоджаны. На разьвітаньне п'ем моцную гарбату, дзякуем за пачастунак.

— А цябе самога як завуць?

— Шаміль.

«Товарищ верь, взойдет она,
Звезда пленительного счастья...»

Шаміль памёр у Мэцы. Скончыўся вялікі хадж. Сівы імам-хаджы перамог. Памёр так, як схацеў.

Ён ня быў першы. Першы быў Мансур. Але той памёр у вязьніцы. Былі й яшчэ. Перад ім быў Казі-Магамед, які са сваімі мюрыдамі ўзьняў сьцяг газавату. Яго забілі. Гэта пасьля яго стаў Шаміль імамам. А бацька Шаміля быў каваль.



Шаміль ваяваў 40 гадоў, пакуль расейскае войска не ўзяло ў аблогу чачэнскі аул Гуніб. А праз 11 гадоў зьняволеньня ў Калузе Шаміль выправіўся ў хадж. Памёр там, дзе хацеў.

Калі Шаміль быў простым мюрыдам, сынам каваля, і толькі пачыналася вайна з Расеяй, Аляксандар Адоеўскі апынуўся на катарзе за ўдзел у аднадзённым студзеньскім паўстаньні. Ён быў расейскім паэтам. У Сыбіры Адоеўскі ня ўседзеў. Як афіцэр ён прасіўся на Каўказ, на вайну. Пісаў пра свабоду...

Нарэшце ён атрымаў прызначэньне. Ваяваць яму давялося ў Адыгеі.

Аднойчы разам з атрадам казакаў Адоеўскі ўдзельнічаў у апэрацыі па расчыстцы ад тубыльцаў-шапсугаў даліны рэчкі Псэзуапсэ, што цячэ да Чорнага мора ў абдоймах вялікіх гор. Калі праходзілі чарговы пусты аул, заўважылі нарэшце і вяароў-шапсугаў. Нецярплівы афіцэр Адоеўскі з казацкай дзідай у руках кінуўся на ворагаў. Фатальным чынам ён апынуўся далёка наперадзе сваіх казакоў, якія не пасьпявалі за ім і дзівіліся ягонаму азарту. Расейскі паэт быў пасечаны на кавалкі, а тубыльцы ўцяклі.

На беразе каламутнае ракі, што шырака выплёскваецца на жвір морскага пляжу, у маленькай крэпасьці, што тады называлася ад рэчкі Псэзуапсэ, паўднёвым вечарам Адоеўскі быў пахаваны. Тут і сёньня стаіць яму помнік, на ўскрайку тлумнага гарадзкога пляжу, зарослы жорсткім калючым хмызьняком, сярод засьмечаных падмуркаў старое фартэцыі.

«... И на обломках самовластья...»

Першая бальшавіцкая газэта была названая ў памяць пра Адоеўскага словам зь ягонага верша.

МАГІЛЁЎСКАЯ ПАЭЗІЯ

№1

Ой вы голыбі ой вы сізыя
Ой вы голыбі ой сізенькія

А ты цела маё цела белае
А што ж ты са мной ды падзелала

Табе цела ўва гробе ляжаць
А мне душы на суд стаці

Пыляцела душа ды на ўсход сонца
А там раі зачынёныя
А там раі затварёныя

Пыляцела душа ды на захад сонца
А там пекла адчынёнае
грэшнымі душамі напаўнёнае

Гыряць смолы кіпучыя
Кіпяць душы душы грэшныя

А грэшная душа сілна плакала
А нет у мяне атца мацеры
Атца мацеры ні сястры брата

Зачуў жа тое сам Госпадзь Бог
Ты ня плач душа душа грэшная
Я сам зь неба сыйду і цябе вазьму
І цябе вазьму у рай увяду

№2

Ішоў кызак з Дону
З Дону дадому
Ён сеў пад ракою
Падперся рукою
Ён еў хлеб з вадою
Ён кляў сваю долю
Бы й тая доля
На 'гні пыгарэла
На вадзе патанула
Як зачула доля
На тым баку мора
Дурэнь кызак дурэнь
За што долю клясьці
За што праклінаці
Не хадзіць было ў ранду
Ня піць горкай гарэлкі
Не любіць краснае дзеўкі
Тыя цябе гулі
Чыбаточкі разулі
Тыя цябе танцы
Завялі малайца ў старцы

№3

А ў тых кустах дый агонь гарыць
што на том агні ды кацёл вісіць
што ў тым катле дый вада кіпіць
што ў той вадзе дзеўка крычыць
А хто там ідзе дый спысай мяне

....

Лучшэ я ў катле скіплю
чым за цябе замуж пайду

№4

Як пайшлі нашы рыбалоўчакі
рыбачку лавіць
Не ўлавілі рыбы шчучачкі
улавілі ліна
Палядзеліся, рассматрэліся
малое дзіця
Як узялі таго дзіцятачку
на белыя рукі
Панясьлі таго дзіцятачку
на казёны двор
Палажылі таго дзіцятачку
на цісовы стол
Ударылі па дзіцятачку
у громкі калакол
Сабірайцесь раскрасавіцы
будзець перабор
А ўсі ж нашы раскрасавіцы
вясёла ідуць
Адну нашу Настасячку
пад пашкі вядуць
А за ею айцец мамачка
горкі сьлёзы ліюць
Ты ня плач айцец мамачка
яшчэ дома пяць
Не пускайце па начлежачках
пускай дома сьпяць
Не давайце распустачкі
як мне маладзе

№5

Як у полі у полі
Тры дубы стаяць
Ой тры дубы стаяць

Пад тымі дубамі
Тры палкі салдат
Ой тры палкі салдат

А ў першым палочку
Конічак іржэць
Ой конічак іржэць

А ў другім палочку
шабелькі брешчаць
Ой шабелькі брешчаць

А ў трэцім палочку
Брат брата забіў
Ой брат брата забіў

А забёмшы брата
Сеў пісьмы пісаць
Ой сеў пісьмы пісаць

Сеў пісьмы пісаць
Ды матулі слаць
Ой ды матулі слаць

А служылі ж мамка
Мы ў адным палку
Ой мы ў адным палку

А любілі мамка
Дзявіцу адну
Ой дзявіцу адну


А я ж яго мамка
Пачэсьці прасіў
Ой пачэсьці прасіў

А ён жа мне мамка
Ды не паступіў
Ой ды не паступіў

А я ж яму мамка
Галаву зрубіў
Ой галаву зрубіў

Ляцела зязюленька
борам летучы
Ой плакала матуленька
к сыну ідучы

Здымак Алены Адамчык



Першасная эстэтызацыя

Сяргей Паўлоўскі

1. Настае дзень, калі народны паэтычны тэкст чытаецца цікавей за прафэсійныя вершы. І калі песьня, якая некалі прывандравала з-за мяжы, цікавейшая за «чыста нашу». Настае дзень самапазнаньня. Мы самі сабе пра сябе нічога ня скажам, не параўноўваючы сябе зь іншымі. А тут, калі яшчэ можна ўявіць сабе расейскі, напрыклад, арыгінал, і разгледзець усе «дэфармацыі» й напластаваньні, — убачыш жывыя рухі, у якіх выяўляюцца ўнутраныя прырода й культура краю.

13 гадоў назад я падарожнічаў у гэтым краі разам зь сябрамі. Мы зьбіралі песьні й этнаграфічныя рэліквіі. Часам якая-небудзь бабка, ня могучы ўжо сьпяваць, расказвала песьню, як верш. Я запісваў у нататнік, і пачуцьцё фатуму ў гэтай бязьлюднай вёсцы пасярод дрымучага лесу ахоплівала мяне.

І яшчэ — адчуваньне першакрыніцы. Першасная эстэтызацыя ў гэтых магілёўскіх лясох і была ўласна беларуская, бо не зазнала ўплываў эстэтызацыі другой, прафэсійнай. Так, як на захадзе Беларусі, дзе праз касьцёл і школу культывавалася пальшчызна. Або ў гарадох, дзе першасная эстэтызацыя была начыста выціснутая расейшчынай.

2. У вёсцы Хадунь нам зладзілі сапраўдныя вячоркі ў хаце Ганны Пракопавай Таўтонавай. Сама яна з 1917 году, жыве адна, «дзявіцаю», трымае дзьве казы, парсюка, гоніць гарэлку. Але жыве бедна. Крыху сьпявае.

Яе сяброўка Прося Пятрова Канапелька з 1909 году, мае чатыры клясы адукацыі ў хатняга настаўніка, з тых часоў памятае безьліч расейскіх вершаў, чым і вядомая ў ваколіцы. Чытае з выразам і моцным магілёўскім акцэнтам.

Тут нішто не ўспрымаецца як іншароднае. Ці то ад старасьці, ці ад таго, што натуральныя людзі натуралізуюць сабою ўсё, да чаго ні дакрануцца. Іх натуральная культура дасканалая, як Мідасава золата. Яна памірае разам зь імі, інстынктыўна прагнымі да прыгоства.

Таўтонава Маруся Сямёнава яшчэ маладая, мае чысты дзявочы голас. Ноччу, пасьля вячорак, яна вярталася дадому праз усю вёску й сьпявала. І яшчэ доўга чуваць быў яе сьпеў, як бы адасоблены ад яе, сам па сабе. У 1999-м ёй будзе семдзесят.

Царкву ў Хатовіжы перад вайной, у 1941 годзе, разбурылі на загад старшыні сельсавета Шаўцова. Цэглу прадалі, і цяпер застаўся толькі падмурак. А ў Куляшоўцы, два кілямэтры ад расейскай мяжы, драўляная царква захавалася. Лічба «1893» на фасадзе. На макаўцы крыж з мэталу й каляровага шкла. Вакол — чыста казачны лес. Але не такі, як у «Літуаніі» Андрыёлі, і не такі, як у «Палесьсі» Шышкіна. Гэта той беларускі лес, які ведае толькі беларускую, першасную эстэтызацыю. Другой беларускай альбо яшчэ не было, альбо яна яшчэ не названая.

Назвы вёсак — Вярхоўка, Вароцькава, Батвінаўка. Бедныя хаткі й бедныя бабкі. Дзе бабцы яшчэ хапае здароўя — там падтрымліваецца акуратнасьць. Акуратная хата не ўспрымаецца як бедная, не адштурхоўвае. Але шмат і такіх, дзе вокны й дзьверы забітыя дошкамі. Гаспадыні іх — пад сінімі жалезнымі крыжамі на вясковым могільніку.

Бяззубая бабуля, якая «ўсё пазабыла», кажа, што пагарэлі яны. Калі? У вайну. У вайну ўся вёска была спаленая немцамі. Усяго за 35 гадоў тут вырас гэты заняпад, нібы яго тады адразу й будавалі нанова.

Хадоска Лісеіха Стасянкова белая, як сьмерць, глухавая, і трэба крычаць. Лісеіха — гэта мянушка, а на самой справе яна Хадосься Максімава, 1903 году.

— Даўней я завадэвуш была. Якая свадзьба, я за першым сталом сяджу... Як залезем на печ, як запяем. Усе казалі: во гэта песьні...

Поля Восіпава Нікіценка ходзіць «ракам», бо ёй сьцягае жылы сьпераду. Яна з былых заможных, і хата ў яе поўная ўсялякіх этнаграфізмаў. Грэбні, глякі, верацёны, сярпы, на покуці — абраз, на сьцяне — маляваны дыван, посьцілкі, ручнікі... хлеб, сала й памідоры... і песьні.

Аўтэнтычны фальклёр у Беларусі сьпяваюць толькі бабкі. Маладыя або не сьпяваюць наогул, або падрабляюцца пад старых, калі хочуць, каб іхныя сьпевы гучалі «аўтэнтычна».

3. Сёньня, праз 13 гадоў, я ня ведаю, ці засталіся яшчэ тыя старыя, ці таксама перасяліліся пад сінія крыжы. 13 гадоў назад у некаторых вёсках яны былі апошнімі жыхарамі й апошнімі праваднікамі першаснай эстэтызацыі.

Але культура любіць трансфармацыі. Магчыма таму сёньня, калі гэтыя песьні страчваюць свайго натуральнага носьбіта, а штосьці заўважнае ў пісанай паэзіі здараецца рэдка, народны паэтычны тэкст чытаецца цікавей за прафэсійны верш.

ІМПЭРЫЯ СТРАСЬЦІ

Славамір Адамовіч. Зваротныя правакацыі. — Полацак, 1994.

Энтані Сміт у «Нацыяналізме ў XX стагодзьдзі» заўважыў, што зьяўленьне новай нацыянальнай дзяржавы і, адпаведна, «бюракратычнага нацыяналізму», правакуе вяртаньне часткі інтэлектуалаў да больш раньняй, «этнарамантычнай» візіі й практыкі.

Паэтычны дэкаданс «Зваротных правакацыяў» Славаміра Адамовіча прагне быць праінтэрпрэтаваным праз гэтую схему. Засяроджаны на бяздомнасьці й страсных вандроўках у нікуды, ён імкнецца да пэўнасьці, надзейнасьці й адназначнасьці — г. зн. да ідэалёгіі.

Зрэшты, ідэалягічная прачытаньне гэтых эстэцкіх тэкстаў магло б быць найбольш адпаведным — яно б задало неабходную сэміятычную дыстанцыю паміж мовай тэксту і мовай выглумачэньня і мела б за плён некалькі ўжытковых агульна-сацыялягічных высноваў.

Але тое, што мяне найбольш уразіла ў гэтай кнізе — гэта фэномэн *«страсьці»*. Беларускай паэзіі заўсёды бракавала (і бракуе) вытанчанай страснасьці, бязмэтнага й непатрэбнага памкненьня, ірацыянальнае прагі сьвету.

Так, Анатоля Сыса любілі не за ягоныя вершы (іхні зьмест банальны або ідэалягічны), а за страсьць, на якую не былі здольныя іншыя. Але страсьць Анатоля Сыса была мэтанакіраваная й прагматычная, ён страсна прамаўляў агульначаканае.

Страсьць Славаміра Адамовіча парушае ўсе межы, падманвае ўсе чаканьні. Ён прысьвячае «таварышам па арганізацыі "Правы рэванш"» кнігу, поўную эратычнага пацыфізму і інтэлектуальна-паэтычных няпэўнасьцяў. Ён «вядзе агонь» мальвамі й ластаўкамі, падае з гары «ў белую гурбу грудзей», блытае «жывую кроў зь віном». Ён прагне «патануць вуснамі» ў Эве Браўн і спавядаецца (выдаючы ўсе тайны "Правага рэваншу") маэстра Картасару.

«Зваротныя правакацыі» — найлепшая паэтычная кніжка году і, як здаецца, паваротная для беларускай паэзіі. На тле ўзмацненьня адраджэнскага прагматызму й дзяржаўнае ідэнтычнасьці беларуская паэзія раптам пачынае разумець сваю новую ролю: яна дзёрзкая й непатрэбная правакацыя. Правакацыя — гэта патрабаваньне адказу, і дарма што пытаньні цьмяныя й невыразныя, — адказы сьвету мусяць быць такія ж страсныя й апантаныя.

Застаецца дадаць, што тое, што ў беларускай паэзіі завецца «страсьцю» — у іншых культурах мае іншую назву — «мэлянхолія».

Францішак Эн.

НОВАЭЎРАПЕЙСКІ РЭГІЁН

Магілёўшчына // Беларускі гістарычны часопіс. 1994, № 3 (7). С. 24-46.

Рэдакцыя БГЧ прысьвяціла трэці нумар выданьня Магілёўшчыне. Часопіс пачынаецца з ужо досыць традыцыйнай памылкі — знакамітая фрэска Станіславаўскага касьцёла падпісаная на другой старонцы вокладкі як «Наданьне граматы каралём Сігізмундам манахам-кармэлітам». З усіх вэрсій у подпіс вынесена самая фантастычная. Кароль Жыгімонт не прыяжджаў у Магілёў. У іншым выпадку факт прысзду караля кармэліты сапраўды скарысталі б у рэпрэзэнтатыўных мэтах.

Тымі днямі, калі зьявіўся нумар, у Менску жартавалі, што ў Беларусі не засталося нічога, акрамя Магілёва й Канстытуцыі. Сацыялёгіі няма — мы памятаем перадвыбарчыя прагнозы. Няма й царквы — мы памятаем таксама, за каго заклікаў галасаваць Экзарх. Прэса й тэлебачаньне не зьяўляюцца ў Беларусі сродкамі інфармацыі. Тут ёсьць толькі Канстытуцыя, таму што дзякуючы ёй адбыліся выбары. І ёсьць Магілёў, хваля «перасяленцаў» зь якога запаланіла сталіцу.

Таму да тэматычнага блёку «Магілёўшчына» варта далучыць артыкул галоўнага рэдактара БГЧ Васіля Кушнера пад назваю «Першы прэзыдэнт рэспублікі» (С.3-5). Аляксандар Лукашэнка ўсьміхаецца зь першай старонкі часопіса. Выслужыліся?.. Між тым, усе памянёныя падзеі парадаксальным чынам прывялі да ўмацаваньня дзяржаўнасьці. Гэта значыць, што дзяржаўны мэханізм Беларусі мае пэўны запас трываласьці й здольны асыміляваць нават варожыя яму элемэнты.

Але адна прынцыпова важная тэрміналягічная заўвага да артыкула В.Кушнера: А.Лукашэнка — першы прэзыдэнт Рэспублікі Беларусь (ці яшчэ ў тэрмінах артыкула — «наш першы прэзыдэнт»), але не Беларусі й Рэспублікі наогул. Інстытут прэзыдэнцтва БНР (Старшыняў Рады БНР), гэта значыць Беларусі й Рэспублікі, бярэ пачатак у 1918 годзе.

Адзін з найбольш дакладных у фактах матэрыял блёку — артыкул Якава Рыера «Матэрыяльная культура вясковага насельніцтва Магілёўшчыны ў X-XIII ст.» Але менавіта гэтая дакладнасьць прасьвятляе штучнасьць вылучэньня для X-XIII ст. такога рэгіёну — Магілёўшчыны. Прынамсі археалягічных падставаў для падобнага вылучэньня няма. І гэта пры тым, што можна казаць пра тагачасную Полаччыну, пра Панямоньне. Але ў вялізных усходніх абшарах губляецца той край, які потым назавуць Магілёўшчынай.

Сытуацыя канкрэтызуецца нейкім чынам толькі з XVI ст. Як піша Барыс Сідарэнка («Магілёў у сыстэме ўзаемаадносін Вялікага Княства Літоўскага й Маскоўскай дзяржавы XVI ст.»), «да пачатку XVI ст. з адноснай глыбінкі Магілёў ператвараецца ў памежны горад». Гэтая памежнасьць разглядаецца хутчэй як мілітарная, у кантэксьце «ваенна-стратэгічнага ланцуга гарадоў ВКЛ». Таму, піша Б.Сідарэнка, «Жыгімонт I, а потым і Жыгімонт II Аўгуст справядліва разглядалі падняпроўскія землі як пляцдарм будучых баёў». Але прысутнасьць Магілёва ў згаданай сыстэме ўзаемаадносін больш праявілася ў сфэры гандлёва-эканамічнай. І магілёўцы самі зрабілі свой горад.

Дасягненьне Магілёвам магдэбурскага самакіраваньня дае рэдкі прыклад дакумэнтальна зафіксаванай актыўнасьці ў гэтай справе саміх месьцічаў. Першай магдэбургію ў нас атрымала Вільня (1387), потым Берасьце (1390), Слуцак (1441)... Але ў гэтых выпадках былі разьлікі вялікіх князёў. Магілёўцы ж да сярэдзіны XVI ст. выконвалі амаль усе тыя павіннасьці, што й навакольныя сяляне, нават разам зь імі. У XVI ст. магілёўцы неаднаразова зьярталіся да вялікага князя, даказваючы неабходнасьць вылучэньня іх з воласьці, з насельніцтвам якой у іх паводле вытворчай дзейнасьці амаль нічога агульнага не было. Гаспадарскі вырак 1555 г. даў пачатак працэсу юрыдычнага афармленьня самакіраваньня ў Магілёве, а ў 1577 г. горад атрымаў магдэбурскае права. Актыўнасьць магілёўцаў дае прыклад клясычнай камунальнай рэвалюцыі заходнеэўрапейскага кшталту. Паўторымся, у іншых гарадох (найперш заходнебеларускіх) часта дзейнічаў мэтад аналёгій, магдэбургія ў канцы XIV-XV ст. надавалася манархамі пры здаровым разуменьні карыснасьці (у тым ліку з гледзішча падаткавага) для гарадоў пэўнай ступені аўтаноміі.

Як недарэчнасьць успрымаецца ў артыкуле Б.Сідарэнкі цытаваньне польскіх дакумэнтаў у перакладзе на сучасную расейскую мову.

У XIX — першай чвэрці XX ст. Магілёўшчына мела іншыя картаграфічныя абрысы — у Магілёўскую губэрню ўваходзіла добрая частка сучаснай Гомельшчыны. Тыя межы больш адпавядалі геаграфічным і этнаграфічным рэаліям — фармаваўся цэльны Падняпроўскі рэгіён. Але гэтаму рэгіёну былі ўласьцівыя ўнутраныя кантрасты. У аграрнай сфэры іх паказаў Валеры Маразевіч («Аграрнае пытаньне ў Магілёўскай губэрні на рубяжы XIX-XX ст.»). Тут быў самы высокі ў Беларусі працэнт абшчыннага землекарыстаньня — 79,2 %. Але й разбурэньне абшчыны ішло ў Магілёўскай губэрні самымі хуткімі тэмпамі: губэрня займала другое месца ў Расейскай імпэрыі па колькасьці гаспадароў, якія замацавалі зямлю ў асабістую ўласнасьць; працэнт сялян, што выйшлі на хутары, быў тут больш высокі, чым у цэлым па Беларусі.

Артыкул В.Маразевіча можна прызнаць найбольш удалым у дадзеным нумары БГЧ. Таму што гэта артыкул з найбольш лягічна пабудаванай структураю. Ёсьць выразная фармулёўка праблем і высноваў — нават праз курсыў. З самага пачатку абгрунтоўваецца тэзыс, што зусім не памешчыцкае землекарыстаньне прыводзіла да пагаршэньня эканамічнага становішча сялянства, а абшчыннае землекарыстаньне й архаічныя мэтады вядзеньня гаспадаркі.

Недахоп артыкула бадай у тым, што не праведзена геаграфічнае разьмежаваньне Магілёўшчыны й Магілёўскай губэрні. Праўда, вынас у загаловак вызначэньня «Магілёўская губэрня» фармальна здымае пытаньні.

Артыкул Людмілы Кандрацьевай «Праект пераносу сталіцы БССР у Магілёў» дакладней было б назваць «Апісаньне фондаў Дзяржаўнага архіву Магілёўскай вобласьці, датычных пераносу сталіцы БССР у Магілёў». Апісаньне цікавае. Між тым важныя дакумэнты захоўваюцца і ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Менску, і яны ўжо былі прадметам аналізу (Свабода, 1994. №3).

Гэта былі сапраўды грандыёзныя пляны. Сацыялістычны горад мусіў выглядаць наступным чынам: «Праз два-тры гады Магілёў стане непазнавальным. Канчаткова зьнікнуць аўрагі і канавы на ўскрайках... Усе рэчкі, што цякуць па тэрыторыі горада, будуць адзеты ў бэтон...» З усіх падрабязна расьпісаных гіпэрпраектаў да канца выкананыя практычна толькі два: разьвіцьцё хіміі й вынішчэньне старога Магілёва. «Калі паглядзець на схему цэнтра Магілёва, які падлягаў рэканструкцыі ў першую чаргу, то можна заўважыць, што на сыстэму вуліц, якія склаліся гістарычна, ляглі новыя кварталы з 4-5-павярховых будынкаў». «Мікалаеўская царква падлягала зносу: яна знаходзілася на шляху адной з алеяў парку». «Адному толькі драмтэатру ўдалося ўпісацца ў новую пляніроўку».

Дзьве рысы — самазробленасьць і ўнутраныя кантрасты, вызначылі лёс Магілёва. Гэтыя рысы выразна прасочваюцца з XVI ст. У такім разе Магілёўшчына, як позьні рэгіён на гістарычнай мапе Беларусі — штучны рэгіён. Ці яшчэ так — новаэўрапейскі рэгіён. Як малады край, Магілёўшчына здольная на моцныя палітычныя ды культурныя экспрэсіі.

Ян Грэчыц

МАСКОЎСКІ ПОГЛЯД ЗЬ БЕЛАРУСІ

Сусьветная гісторыя. Дапаможнік для 10 кл. — Менск, 1994.

Згодна з новай канцэпцыяй гістарычнай адукацыі, якая на дзяржаўным узроўні была зацьверджаная летась, падзеі айчыннай і сусьветнай гісторыі ў нас павінны разглядацца з пункту гледжаньня беларускага народу. Але, на жаль, гэта не заўсёды так...

На асьвятленьне матэрыялу, прысьвечанага гісторыі Расеі ў XVII-XVIII ст., у новым дапаможніку адводзіцца восем параграфаў (51-58). Назва разьдзела: «Расея на шляху ўмацаваньня абсалютызму». Аўтар — доктар гістарычных навук, прафэсар, загадчык катэдры гісторыі Расеі БДУ І.Аржахоўскі. Сам тэрмін «абсалютызм» ён тлумачыць як «форму дзяржаўнага ладу, пры якой манарх надзяляецца неабмежаванай вярхоўнай уладай». Між тым пад такое вызначэньне можна падвесьці большасьць аўтарытарных рэжымаў: ад старажытнаўсходніх дэспатый да таталітарных дыктатураў XX ст.

З тэксту на С.289 зусім не зразумела як суадносяцца паміж сабой паняцьці «саслоўна-прадстаўнічая манархія» й «самадзержац». Тэарэтычныя высновы робяцца для XVII ст., а фактычны матэрыял падбіраецца з папярэдняга (напрыклад, дзяржаўная пячатка з двухгаловым арлом, якая ў маскоўскіх гаспадароў зьявілася ў XVI ст.)

Без усялякага сумлеву І.Аржахоўскі кваліфікуе дзяржаўны лад Пятроўскай Расеі як абсалютызм, забываючы пры гэтым пра меркаваньні іншых гісторыкаў. Так В.Ключэўскі адзначаў, што ў Расеі пры Пятры І адбывалася «запрыгоньваньне ўсіх саслоўяў», а Я.Анісімаў падкрэсьлівае таталітарны характар створанай Пятром сыстэмы (Евг.Анисимов. Время петровских реформ. Ленинаград. — 1989. С.13).

Падзел Рэчы Паспалітай і гвалтоўнае ўключэньне беларускіх земляў у Расею І.Аржахоўскі тлумачыць сілавымі падыходамі Расеі, маўляў, «у тыя часы ўсе эўрапейскія дзяржавы імкнуліся павялічыць свае ўладаньні і замацаваць межы». І ані слова пра інтарэсы й памкненьні беларускага народу.

Каб яшчэ больш упэўніць вучняў у законнасьці гэтага акту, І.Аржахоўскі нагадвае, што паняцьця «агрэсія» ў той час яшчэ не існавала. І потым... «шматнацыянальная Расейская імпэрыя істотна адрозьнівалася ад сучасных ёй каляніяльных імпэрый, створаных Англіяй, Галяндыяй, Іспаніяй, Партугаліяй, Францыяй і іншымі эўрапейскімі дзяржавамі. Народы, якія добраахвотна або па прымусу ўвайшлі ў склад Расеі, ня зьведвалі нацыянальнага прыніжэньня, бо рускія, па сутнасьці, не зьяўляліся ў імпэрыі пануючым народам». Вось жа пры апісаньні прыгнёту палякаў, украінцаў, балгараў, сэрбаў і іншых славянскіх народаў з боку Прусіі, Аўстрыі й Турцыі аўтар не шкадуе чорнае фарбы. Між тым, «аб'яднаньне ў граніцах адной дзяржавы ўсіх беларускіх і большасьці ўкраінскіх зямель, нягледзячы на імпэрскую палітыку царызму, аб'ектыўна садзейнічала захаваньню гэтых народаў як самастойных этнасаў».

Каб зразумець ілжывасьць гэтых тэзысаў, дастаткова праехаць з захаду Ўкраіны на ўсход і пачуць, што ўкраінская мова найбольш ужываецца якраз у тых раёнах, якія не ўваходзілі ў склад Расеі. Усход жа Ўкраіны больш нагадвае асыміляваную расейшчынай Беларусь. Тэзыс аб выратавальнай ролі Расеі ў гістарычным лёсе ўкраінцаў і беларусаў не вытрымлівае крытыкі.

Спасылкі на нераспрацаванасьць расейскай праблематыкі ў беларускай гістарычнай навуцы таксама не пераконваюць. Дастаткова згадаць артыкул гісторыка Г.Сагановіча «"Русский вопрос" с точки зрения белоруса» (Народная газета, 1993, 30 сакавіка). Яшчэ раней нацыянальная канцэпцыя выпрацоўвалася ў працах братоў Грыцкевічаў. Праф. Аржахоўскі прытрымліваецца маскоўска-пецярбурскага пункту гледжаньня. Але ў дадзенай сытуацыі такі погляд недарэчны.

Для падручніка важна пазьбегнуць аўтарытарнай манэры выкладаньня матэрыялу. Лепш за ўсё стварыць вучню магчымасьць самому выбіраць сярод кваліфікаваных канцэпцый тое, што яму здаецца слушным.

Леанід Дзікцяроў
Відзы

ПОГЛЯД З ПОЛЬШЧЫ НА БЕЛАРУСЬ

Józef Geresz. Twierdza niepokonana. Obrona Cytadeli w Brześciu nad Bugiem we wrześniu 1939 r. — Biała Podl., 1994. 78 S.

Кніга скампанаваная з матэрыялаў архіўных крыніц, успамінаў удзельнікаў абароны Берасьцейскай фартэцыі, у бібліяграфіі — каля сотні публікацыяў. У тым ліку дзьве па-расейску: Сямёна Крывашэіна «Ратная быль» (Масква, 1962) і Аляксандра Суворава «Абарона Берасьцейскай фартэцыі ў верасьні 1939 г.» (Литературная газета, 1989, 29 верасьня).

Ва ўступе аўтар піша, што абарона фартэцыі ў 1939 г. ня толькі адсунула час узброенага процiборства Польшчы з двума агрэсарамі — Нямеччынай і СССР. Яна зьдзівіла тым, што хоць спэцыяльны абарончы вузел тут не прадугледжваўся, тым ня менш 2,5-3 тыс. вайскоўцаў, дарэчы, даволі слаба ўзброеных, з 14 да 17 верасьня адбіваліся ад гітлераўскай навалы, якая налічвала каля 50 тыс. жаўнераў, больш за 150 танкаў і 250 гарматаў. «Для палякаў абарона Берасьця ў 1939 годзе мела асаблівае значэньне. Яго гарнізон ня быў разьбіты, ён выйшаў з фартэцыі непераможаны... Для дэзарыентаваных наглядальнікаў Берасьце выявіла сапраўдныя намеры Сталіна супраць Польшчы. Тут, перш за ўсё, адбыўся банкет, а потым сумесны парад агрэсараў, пасьля якога ўсе палонныя палякі былі перададзеныя ў рукі Саветаў. Пазьней іх целы былі знойдзеныя ў Катыні».

Пра тое, што ў Берасьці ў верасьні 1939 г. адбыўся сумесны парад нямецкіх і савецкіх войскаў А.Сувораў пісаў наступнае: «У халодны ветраны дзень 22.IX.1939 г. генэрал Гудэрыян і камандзір брыгады Крывашэін паўсталі на імправізаванай трыбуне на галоўнай вуліцы Берасьця Літоўскага. Загучаў аркестар. Пяхота прамаршавала перад трыбунай ва ўзорным парадку. Прарэзалі хмарнае неба й праляцелі нізка эскадроны баявых самалётаў. Потым на брук вылезьлі браняваныя машыны са свастыкай. Гудэрыян зь непрыхаваным гонарам глядзеў на калёны танкаў. Атрады Чырвонай Арміі, якая некалькі гадзінаў раней увайшла ў горад, віталі іх...»

Юзэф Герэш дадае: «Аўтар (Сувораў — У.Л.) не напісаў толькі, што перад трыбунай маршавалі таксама жаўнеры Чырвонай Арміі, якія крычалі «Ура», савецкія гарматы цягнулі малыя сьмешныя конікі... Не напісаў таксама, што адзін з трох савецкіх танкаў перавярнуўся падчас параду, у чым многія ўбачылі благі знак». 15-гадовая дзяўчынка Інка запісала ў сваім дзёньніку 22 верасьня 1939 году так: «Савецкія войскі ўвайшлі ў Берасьце. Жаўнеры йшлі пехатою, мелі шынялі ў лахманах і ледзьве валачылі ногі. Яны не рабілі ўражаньня моцнай арміі і вельмі адрозьніваліся ад немцаў...», пра якіх пяць дзён раней Інка напісала наступнае: «Першы раз убачыла нямецкія войскі... Усё новае, бліскучае, апранутыя элеганцка, усе на машынах. Ехалі дзьве гадзіны... новыя і новыя...»

Да гэтых успамінаў у кнізе ёсьць яшчэ трыццаць старонак з фотаздымкамі (на адным зь іх знакаміты пісьменьнік, мастак і філёзаф Станіслаў Ігнацы Віткевіч, які перажыў пекла нямецкіх налётаў на Берасьце і застрэліўся, калі пачуў пра надыход Чырвонай Арміі)...

Заўважная дэталь — у кнізе, якая прысьвечана беларускаму месту й беларускай гісторыі, пра Беларусь і беларусаў увогуле ня згадваецца. Толькі ў двух выпадках сустракаюцца выразы «літоўскае войска» й «літоўская пяхота» ў адносінах да батальных падзеяў канца 18 ст., калі згадваецца імя Якуба Ясінскага. Сама ж гісторыя Берасьця, паводле Ю.Герэша, пачынаецца з 1182 году, калі Казімер Справядлівы пабудаваў на беразе Мухаўца абарончы замак. Баццам бы летась горад не сьвяткаваў свайго 975-годзьдзя...

Уладзімір Люкевіч
Берасьце



Богу во Тройцы Святой Славимому

Смертелным кождый оком нехай то обачыт
И по смерти як слава добродеем вдячыт.
Затлумит земля порох чловека былого
Давности лета укажет, якобы ничого,
Леч цнот трудно тамоват — тые вечне трвают
Спотомного веку людей разжарают,
В которых ся знайдовал вселякой чти годный —
Арсеній Азарович, инок Богобойный
Фундатор монастыра тутешнего пилный
А добродей сей церкви нигды не омылный
Филяры, окна, двери его коштом стали
През школулу оздобы и муры дознали.
Монастыра будынки, муры выславляют
И нагробок вдячности ему выставляют
Звонницы фундаменты видоком всім явным
Же его суть початком сумы на то даным.

Жыл Лет 74. Умер року 1652, месяца декабря 1 дня.

Беларускі верш XVII стагодзьдзя


Гэтая пліта-эпітафія ўпрыгожвала сьцяну Магілёўскай Багаяўленскай царквы, магчыма, побач з пахаваньнем самога Арсеня Азаровіча. З канца XIX ст. яна знаходзілася ў магілёўскім царкоўным старажытным сховішчы, а цяпер — у сховішчах Нацыянальнага Музэю Беларусі.

Мэталічная пліта-эпітафія была выраблена ў 1653 г. У цэнтры выгравіраваны дзьве калёнкі надпісу паўуставам. Упрыгожаньні картушоў падобнага кшталту шырока ўжываліся ў часы рэнэсансу ў Нямеччыне. Характэрныя яны й для магілёўскага мастацтва XVII-XVIII ст. (напрыклад, гравюра Магілёва 1702 г., выкананая мясцовым майстрам Васілём Вашчанкам).

З тэксту эпітафіі вынікае, што «інак манастыра Арсень Азаровіч зьяўляецца фундатарам і дабрадзеем манастыра тутэйшага», коштам яго былі зробленыя філяры, вокны, дзьверы, а таксама вымураваны падмурак манастырскай званіцы, за што нашчадкі «нагробак удзячнасьці яму выстаўляюць».

Нам пашчасьціла знайсьці ў Нацыянальным архіве Беларусі тэстамэнт Арсеня Азаровіча — цікавы помнік духоўнай культуры XVII ст. У ім, у прыватнасьці, гаворыцца, што «інак Арсень Азаровіч завяшчаў манастыру пяць моргаў сенакосу пад Багародчыцамі, агарод Касьценскі, а таксама зрабіў шмат пабудоў у манастыры». Гэта пацьвярджаецца й сьпісам братчыкаў-ахвяравальнікаў гэтага манастыра.

Наогул прозьвішча Азаровіч ці Азарэвіч часта сустракаецца ў дакумэнтах Магілёва й Магілёўшчыны. Менавіта Арсень Азаровіч нарадзіўся ў заможнай сям'і. Ягоны бацька, Антон сын Азара, — вядомы купец, валодаў зямельнымі гарадзкімі пляцамі, сенакосамі, а таксама меў камору на рынку, фундаваў храмы Раства Багародзіцы й Сьв. Мікалая. Акрамя Арсеня ў яго былі яшчэ тры сыны, якія таксама былі дабрадзеямі Багаяўленскага манастыра й сябрамі адпаведнага брацтва.



Багаяўленскі манастыр быў адным з буйнейшых праваслаўных манастыроў у Беларусі. Яго будынкі былі разбураныя ў часе II сусьветнай вайны.

З.Я.

Сьвет Трафіма Сурты

Ігар Марзалюк

Мне здаецца, што большасьць беларускіх інтэлектуалаў стамілася чытаць «гістарычныя» опусы маладых філёлягаў ды сталага веку юрыстаў, якія ствараюць яшчэ адзін міт беларускай мінуўшчыны. І справа тут не ў адсутнасьці крыніцаў, а ў немагчымасьці для многіх (у першую чаргу дылетантаў) адэкватна разумець лёгіку паводзінаў продкаў, не накідаць на іх чыннасьць уласныя ўяўленьні. Таму, спрабуючы прааналізаваць некаторыя аспэкты сьветапогляду магілёўскага летапісца Трафіма Сурты, я буду імкнуцца паказаць мэнтальны фон ягонага асяродзьдзя.

Чаму я абраў дзеля гэтага менавіта Сурту? Па-першае, ён належаў да гарадзкога патрыцыяту, быў лаўнікам ды купецкім старастам, высокаадукаваным чалавекам. Аналізуючы ягоны сьветапогляд, мы зможам паспрабаваць ахарактарызаваць некаторыя рысы мэнталітэту гэтага страту беларускага гораду 17 стагодзьдзя.

Па-другое, ён шчыры праваслаўны, а гэта дазваляе пабачыць стаўленьне чалавека гэтай канфэсіі да ўладаў Рэчы Паспалітай. Тым больш, што час, калі пісаў Сурта, ня зь лепшых для беларускага праваслаўя.

Т.Сурта выразна не падзяляе сьвет «дольны» і сьвет «горны», у ягонай сьвядомасьці яны існуюць у жывым узаемадзеяньні і аднолькава рэальныя. Сьвет Сурты поўны дзівосаў, якія несупынна зьдзяйсьняюцца ў штодзённасьці, у іх вераць, яны ёсьць такая ж рэальнасьць, як і ўсё астатняе, што мае месца ў жыцьці. Добрае й кепскае, роскві гораду й жахі войнаў ды эпідэміяў — усё дзеецца з Ласкі ці Кары Божай. Божы промысел — вось асноўны чыньнік разьвіцьця чалавечай гісторыі. Выклік Богу, кінуты чалавекам, імгненна караецца — немец «за морам», стрэліўшы ў неба, ператвараецца ў сабаку.

У гэтым сьвеце несупынна йдзе змаганьне са служкамі нячысьціка, зь ведзьмакамі, якія на кожным кроку шкодзяць чалавеку. Прыкладам, летапісец апавядае аб нараджэньні ў 1677 г. у Вільні хлопчыка з залатымі зубамі, які разам з маці праз кароткі час паміраe з-за вядзьмарства чараўніцы. Сурта паведамляе пра спаленьне ў 1688 г. у Старым Быхаве адначасова дзесяці чараўнікоў, іх віна не выклікае ў яго сумненьня.

На жаль, ведаўскія працэсы ў Беларусі да гэтага часу практычна не вывучаліся, але, як вынікае з дакумэнтаў, пачатак іх прыпадае на XVI, а канец — на XVIII ст. Актавыя матэрыялы магілёўскага, полацкага, віцебскага, менскага ды іншых магістратаў таго часу зьмяшчаюць цікавую інфармацыю па гэтым пытаньні. Важна адзначыць той момант, што вера ў чарадзейства была неад'емным элемэнтам мэнтальнасьці грамадзтва ВКЛ ў XVI — сярэдзіне XVIII ст. Структура ж сьвядомасьці сялянства амаль безь зьменаў перахавалася практычна да канца XIX стагодзьдзя.

Гэтае сьцьверджаньне вельмі добра ілюструецца своеасаблівай справаздачай аб зьнішчэньні вядзьмарак сярэдзіны XVIII ст. аканома маёнтка графа Тышкевіча да свайго пана: «Яснавяльможны пан!.. з вашага дазволу спаліў я шэсьць чараўніц: тры прызналіся, а астатнія — не... Я зьбіраю зараз зь дзесяці касьцёлаў сьвятую ваду й буду на ёй варыць кісель: кажуць, абавязкова ўсе вядзьмаркі прыбягуць прасіць кісялю, і тады яшчэ будзе мне праца!»

У зьвязку з гэтым мне здаецца заўчаснай адмова ад тэрміну «позьняе сярэднявечча» ў дачыненьні да XVI-XVIII ст. Сярэднявечная мэнтальнасьць, як бачна з вышэйпададзенага, працягвала пераховвацца і ў гэты час, рацыяналізаваны погляд на сусьвет і дакладнае размежаваньне функцыяў «зямнога» й «нябеснага» канчаткова замацоўваецца ў эпоху Асьветніцтва. Прычым, спачатку толькі ў элітарных колах грамадзтва.

Дарэчы будзе сказаць, што ў гэтым сэнсе нашыя землі не зьяўляліся нейкім выняткам у параўнаньні з іншымі эўрапейскімі краінамі. Менавіта на эпоху Рэнэсансу й Рэфармацыі прыпадае пік ведаўскіх працэсаў ва ўсім эўрапейскім рэгіёне. Нельга не пагадзіцца з Шпэнглерам, які адным зь першых паказаў, што ў грунце сьветапогляду творцаў «клясычнага» італьянскага Рэнэсансу была пакладзеная цьвёрдая вера ў рэальнасьць д'ябальскага сьвету і ў магчымасьць выбаўленьня ад яго праз абарону сьвятых. «Людзі, якія не адчуваюць за сьпінаю д'ябла, ня здолелі б стварыць ні «Боскую Камэдыю», ні фрэскі Арв'ето, ні столь Сыкстынскай капэлы». Марыя Тэрэза спыніла працэсы супраць вядзьмарак на сваіх землях у 1746 г., у 1775 тое самае было зроблена ў Баварыі, яшчэ ў 1781 г. была спалена ведзьма ў Сэвільі, у 1782 г. — у Швэйцарыі.

Ня менш цікавым будзе для нас паспрабаваць прааналізаваць патрыятызм Трафіма Сурты. Ён мае двухузроўневую структуру — карпарацыйны (гарадзкі) і дзяржаўны. Падзеі ў «Хроніцы» разглядаюцца з пункту гледжаньня іх мэтазгоднасьці й карыснасьці для магілёўскіх месьцічаў, найперш купцоў, да якіх Сурта й належаў. З мэтай усlаўленьня ды паказу сацыяльнае значнасьці Магілёва й ягонага жыхарства і была напісаная «Хроніка». Прычым зроблена гэта было адмыслова. Кожная хроніка ў сярэднявеччы, паводле слушнай заўвагі Ж.Ле Гоффа, была «развагай аб сусьветнай гісторыі», у якой мясцовая гісторыя паказвалася як складовая частка апошняй і ўводзілася ў агульную хаду гістарычнага разьвіцьця чалавецтва ад Біблейскіх часоў. Тое ж самае зрабіў і Сурта, але ягоная навацыя палягала ў тым, што калі папярэднікі-летапісцы рабілі гэта з гісторыяй краіны, то ён узьвёў у «агульнасусьветны» кантэкст гісторыю менавіта места, зьвязваючы прычыну ўзьнікненьня Магілёва зь біблейскімі часамі. Згодна зь летапісцам, сам апостал Андрэй, легендарны Хрысьціцель Русі, блаславіў падчас сваёй місіі «і горы, дзе ёсьць Магілёў». Такім чынам, пачатак гісторыі гораду сакралізаваўся, ягонае існаваньне набывала боскую наканаванасьць ды «адвечнасьць».

Паказальнае стаўленьне праваслаўнага Сурты да ўладаў Рэчы Паспалітай. У «Хроніцы» ня зьмешчана ніводнай ад-

Магілёўскае Піва

Зьміцер Яцкевіч

Бяз гэтага цудоўнага напою немагчыма ўявіць гісторыю позьнесярэднявечнага Магілёва. Ніводная больш ці менш значная падзея не абыходзілася безь яго. Дый у будзённыя дні магілёўцы рэгулярна ўжывалі піва, якое самі й гатавалі. Гэтая традыцыя захавалася й сёньня, толькі гатуюць піва ўжо на заводзе. І варта адзначыць, што асобныя гатункі яго не саступаюць лідзкаму.

Для гатаваньня піва неабходна замачыць солад. У Магілёве гэтай справай з 1578 г. займаліся не асобныя людзі, а цэлы цэх. У 1591 г. у ім працавала 17 саладоўнікаў — не такая й малая лічба для цэхавых арганізацый. Напэўна, дзейнасьць цэху не магла цалкам задаволіць патрэбы гораду, таму, відаць, у 1604 г. зьявілася грамата караля Жыгімонта III, якая дазваляла ўсякаму магілёўцу гатаваць у сябе піва ды іншае пітво, але толькі для ўласнага ўжывньня — ні ў якім разе не на продаж.

Кіраўніцтва магілёўскага староства, якое месьцілася тут, таксама не магло абыйсьціся бязь піва. Інвэнтар Магілёўскага замку за 1604 г. сярод замкавай маёмасьці акрамя пякарні й карчмы згадвае мураваны бровар.

Мелі бровары й гараджане. У 1638 г. магілёўскі бурмістар Цімахвей Ганановіч ахвяраваў Багаяўленскаму брацкаму манастыру сваю маёмасьць: два зямельныя пляцы, студню, а таксама бровар зь лісьцём, катлом піўным і ўсім начыньнем, да варэньня піва патрэбным.

Шмат піва, зразумела, як і больш моцных напіткаў, было зварана й выпіта пры закладцы магілёўскай ратушы ў 1679 г. Прынамсі амаль ніводнае паседжаньне магістрату, брацтва й цэхаў не абыходзілася бяз гэтага напою. Кожная старонка гарадзкіх прыходна-расходных кніг сьведчыць пра тое, колькі піва, якіх гатункаў і за які кошт было набыта. Сустракаюцца нават цэлыя рэестры, складзеныя ў магілёўскім магістраце, якія распавядаюць пра прыгатаваньне і продаж піва. У XVII-XVIII ст. асаблівым попытам карысталася піва наступных гатункаў: Тутэйшае (Магілёўскае), Лупалаўскае ды Простае. Сустракаюцца таксама назвы: Аршанскае, Белае, Каралеўскае і Гданьскае.

Вельмі багата піва было зварана падчас Паўночнай вайны па патрабаваньню захопнікаў, прычым, як адзначаюць летапісцы, — як для рускіх войскаў і іх камандзіраў, так і для швэдзкіх. Вось што адзначыў магістрацкі пісар Пётра ў прыходна-расходнай кнізе Магілёва за 1706 г.: У сьнежні паны-рада замовілі прыгатаваць піва з нагоды магчымага прыезду маскоўскага цара Пятра І, які быў у Копысі. Для гэтага купілі соладу й хмелю. Акрамя гэтага было прыгатавана шмат віна, мёду, піва і розных прадуктаў. Але на гэты раз цар не прыехаў да Магілёва й панам-радзе (члены магістрату — бурмістры, лаўнікі) прыйшлося ўсё прыгатаванае выпіць і зьесьці, каб не сапсавалася й дарма не прапала. 30 сьнежня 1706 г. другі раз рабілі піва на прыезд цара маскоўскага. Тады ізноў купілі соладу, хмелю, дроў. Пры гэтым піваварам заплацілі на гарэлку й пірагі 1 злоты 15 грошаў, піввару Міне — аж 4 злотых 15 грошаў, а таксама за знасеньне таго піва — 3 злотых 8 грошаў, ды за кацёл пану Бізевічу 13 злотых.

15 сакавіка Меншыкаў выдаў мясцоваму магістрату загад, згодна зь якім магілёўцы мусілі даваць фураж, бочкамі французскае й вугорскае віно, мёд і піва. «А калі б не давана чаго, тады адразу браны магістрат пад варту й караны». Гэтыя дакумэнты сьведчаць ня столькі аб прыстасавальнасьці магілёўцаў, колькі аб элемэнтарнай перасьцярозе. Апошняя была ня лішняй, таму што 8 верасьня 1708 г. маскоўскія войскі спалілі горад. Адначасова дадзены дакумэнт даносіць да нас першае вядое імя тагачаснага півавара — Міны, які быў, відаць, адным зь лепшых сярод калег. Яго праца, як і само піва, каштавала добра.

Калі пасьля бітвы пад Галоўчынам 3 ліпеня 1708 г. галоўнае швэдзкае войска ўвайшло ў горад, то з кожнай часткі гораду (а іх было 15) было запатрабавана па 12500 фунтаў хлеба і 960 гарнцаў піва. Калі ж сотня не магла выдаць такую колькасьць прадуктаў, то павінна была заплаціць грашыма. Гарнец — гэта керамічнае начыньне ў сыстэме мер Вялікага Княства Літоўскага. Малы, ці просты гарнец змяшчаў 2,8 літра, а вялікі, ці цэхавы — 5,6 літра. Нам невядома, якімі запатрабавалі швэды, але калі й малымі, то гэта амаль 2500 літраў з адной сотні. З галадухі нельга злоўжываць ежай і пітвом, ды швэды, відаць, пра ўсё забыліся ў такім хлебным горадзе, як Магілёў. У выніку, як піша летапісец, шмат іх у той час ад пераяданьня памерла...

Звычайна ў Магілёве, як і ва ўсёй Рэчы Паспалітай, піва ў XVII-XVIII ст. каштавала па 4-6 грошаў за гарнец, і толькі фірменнае «Лавіцкае» ці «Варшаўскае» — ад 8 грошаў да злотага 16 грошаў. Падчас Паўночнай вайны ў Магілёве піва (як і іншыя прадукты) узьнялося ў кошце й цягнула на 1 злоты за гарнец.

З таго часу, як Магілёў трапіў у склад Расейскай імпэрыі (1772 г.), рамесьніцкі выраб піва паступова прыходзіць у заняпад, і ягонае месца стала займае мануфактурны й завадзкі. У 1783-84 г. у горадзе дзейнічала 7 піваварaных заводаў. Дасьледніца І.Сьлюнькова выявіла цікавы дакумэнт, што захоўваецца ў Нацыянальным архіве Беларусі. У ім гаворыцца аб існаваньні старога замкавага бровару, што месьціўся ў вусьці ракі Дубравенкі яшчэ ў 1837 г. Тады былі прадстаўленыя два варыянты рэканструкцыі будынка, распрацаваныя магілёўскімі архітэктарамі І.Фёдаравым і А.Бусыргскім для богаўгодных установаў прыказу грамадзкай апекі. Па гэтых праектах былы замкавы бровар пераўтварыўся ва ўзорны для таго часу архітэктурны комплекс і добра ўпісаўся ў навакольнае асяродзьдзе.

У другой палове XIX ст. у Магілёве дзейнічала некалькі піваварaных заводаў. Адзін зь іх, заснаваны ў 1862 г., належаў вядомаму на Беларусі купцу, уладальніку піваварaных заводаў, баварскаму падданаму Францу Міхайлавічу Лекерту. У 1879 г. завод разьмясьціўся на былым Маскоўскім (раней Лупалаўскім) прадмесьці па вул. Шасэйнай у двухпавярховым мураваным будынку са скляпеньнямі й млынамі для перамолваньня соладу. У канцы XIX ст. завод быў тэлефанізаваны й абсталяваны двума паравымі машынамі, паравым катлом, меў водазабесьпячэньне, а таксама ледавік для захоўваньня піва. У 1913 г. тут працавала 50 рабочых, якія выпускалі на 170 тыс. рублёў піва ў год. У сярэднім выпускалася каля 100 тыс. вёдраў у год. Найбольш вядомыя былі тры гатункі. Вядро «Бок-біра» (вышэйшы гатунак) каштавала 2 рублі, «Баварскага» — (другі гатунак) — 80 кап., «Рускага» (трэці гатунак) — 75 кап.

На гэтым жа прадмесьці ў 1870 г. быў заснаваны яшчэ адзін піваварaны завод, які ў 1910-1913 г. меў тры паравыя рухавікі. На ім працавала каля 50 рабочых і выпускалася каля 150 тыс. вёдраў піва ў год. У гэтыя гады ўладальніцай завода была Эсфіра Яньнік.

Вядомы магілёўскі краязнаўца І.Філіповіч сьцьвярджае, што на каталіцкіх могілках пахаваньні Яньнікаў і Лекертаў знаходзяцца ў адной агароджы. З гэтай нагоды ён выказаў меркаваньне аб сваяцтве ўладальнікаў буйнейшых піваварaных заводаў у Магілёве. На фірменных бутэльках завода Яньнікаў меліся выявы мэдалёў з розных выставаў.

Прозьвішчы ўладальнікаў адбіліся й на мясцовай тапаніміцы. У раёне сучасных праспэктаў Шмідта й Пушкіна побач з так званым пасёлкам Абісінія раней знаходзіўся Янікаў луг, дзе для патрэбы завода вырошчвалі хмель. Гэты мікратапонім захавалі пры наданьні назваў вуліц, што прайшлі па лузе.

Сёньня, калі свае смакавыя якасьці магілёўскае піва яшчэ не разгубіла, дык узровень падачы прадукцыі даволі нізкі. Няма сваіх фірмовых бутэлек, як гэта было раней. З этыкетак — эмблемаў магілёўскага піва можна прызнаць вартай толькі «Машэку». Астатнія выкананыя на даволі нізкім узроўні, а этыкетка «Магілёўскае» зьяўляецца сапраўдным зьдзекам з герба Магілёва, які, дарэчы, зацьверджаны гарвыканкамам.

моўнай характарыстыкі ў дачыненьні да ейных каралёў. «Стэфан Баторы, шчонайясьнейшы кароль і пан наш міласьцівы». Ян III «пан кемлівы, відны, здаровы, набожны, да народу рознага стану міласэрны». Для летапісца Рэч Паспалітая — *яго* дзяржава. А па колькасьці адмоўных этнічных характарыстык у тэксьце маскоўцы займаюць другое месца пасьля жыдоў.

У сягоньняшнім разуменьні Т.Сурта — шчыры антысэміт. Ягоны ўлюбёны вобраз — «жыды сьмярдзючыя». Жыдоўства абвінавачваецца ў рытуальных забойствах хрысьціянаў, менавіта ў жыдоўскім асяродку нараджаюцца пачвары, што выклікаюць жах і агіду, жыды забіваюць і крадуць, займаюцца шарлатанствам і ўсяляк шкодзяць хрысьціянам.

Апошнім часам актыўна ствараецца міт аб беларускай талерантнасьці, які тарнуецца без выняткаў да ўсіх эпохаў нашае гісторыі. Бясспрэчна, што заканадаўчыя акты ВКЛ давалі магчымасьці жыдам пачуваць сябе тут у большай бясьпецы, чым на іншых абшарах Эўропы. Аднак было б недаравальнаю памылкай лічыць, што стаўленьне грамадзтва ВКЛ да іх было дабразычлівае. Міхалон Літвін даваў ім такую характарыстыку: «У гэтую краіну сабраўся адусюль самы дрэнны з усіх народаў — іўдзейскі... народ крывадушны, хітры, шкодны. Ён псуе нашы тавары, падрабляе грошы, пячаткі, на ўсіх кірмашах адымае ў хрысьціянаў сродкі да жыцьця, ня ведае іншага мастацтва акрамя падману й паклёпу». Кляновіч у паэме «Roxolania» даваў волю сваім пачуцьцям: «Ты спытаеш, што робіць жыд у гэтым горадзе? А тое ж, што робіць воўк, патрапіўшы ў поўную аўчарню... да яго трапляюць у заклад цэлыя месты, ён уціскае іх працэнтамі й сее галечу».

Антысэмітызм хрысьціянскіх народаў быў народжаны шматлікімі прычынамі. Адной з галоўных зьяўлялася анахранічнае ўяўленьне аб прыродзе чалавека. Усе людзі, ва ўсіх пакаленьнях, нясуць адказнасьць за першародны грэх, зьдзейсьнены Адамам і Евай, таксама як усе жыды вінаватыя ва ўкрыжаваньні Збавіцеля, вышэйпамянёныя падзеі ў разуменьні людзей таго часу не належалі толькі мінуламу, але вечна доўжыліся й адбываліся ў сёньняшнім момaнце. Нянавісьць хрысьціян да жыдоў — гэта нянавісьць не да нашчадкаў забойцаў Хрыста, а да саміх забойцаў, праклятых і адрынутых за гэта Богам «... тако глаголем Господь: послю на вас клятву, и прокляну вы, и благословения ваша разору и не будет во вас благословения».

Другой прычынай, якая выклікала ўсеагульную нянавісьць да жыдоў, было тое, што ліхвярства зьяўлялася адной з асноўных сфэраў іх дзейнасьці. У той час як у хрысьціянскім сьвеце яно адносілася да самых «брудных» справаў.

У XVI-XVII ст. да гэтай аргумэнтацыі далаўся й чыста практычны аспэкт. Месьцічы не жадалі мець такога небясьпечнага канкурэнта, які перахопліваў у іх «куплі нямалыя», водкупы з мытаў і корчмаў. Так, у 1577 г. Айзік Якубовіч скардзіўся ў Магілёўскі магістрат на «Сисоя Лавровича Кузнечонка, мещанина могилёвского, на Сергея Максимовича, лавника Сегорочного», у якіх ён перахапіў права на арэнду корчмаў, што выклікала зь іх боку пагрозы й спробы выдаліць канкурэнта зь места. Магілёўскія месьцічы шмат высілкаў прыклалі дзеля таго, каб усяляк абмежаваць гандлёвую актыўнасьць жыдоўства, пастаянна выпрошваючы ў каралеўскай улады прывілеі на забарону жыдам сяліцца ў Старым горадзе.

Як бачым, законы з аднаго боку сувора каралі за забойства жыда, гарантавалі яму бясьпеку й недатыкальнасьць яго маёмасьці, а з другога — пераважная большасьць грамадзтва глядзела на іх з агідай і нянавісьцю.

Тыповым для праваслаўнага таго часу зьяўляецца й стаўленьне Т.Сурты да прадстаўнікоў іншых хрысьціянскіх канфэсіяў. Цікава, што Сурта, які ўсім сэрцам ненавідзіць уніятаў, заве іх кажанамі, разам з гэтым спакойна ставіцца да рыма-каталікоў, пры апавяданьні пра дзівосы ў Вільні спасылаецца на сьведчаньні «ягамосьці ксяндза Катовіча», занатоўваючы тую ці іншую цікавую падзею, пры яе супадзеньні з рыма-каталіцкім сьвятам абавязкова адзначае гэта. Усё гэта тлумачыцца тым, што ў разуменьні Сурты, гэтак сама як большасьці ягоных аднаверцаў, праваслаўная і рыма-каталіцкая канфэсіі існавалі ад «старыны», былі асьвечаныя традыцыяй даўнасьці йснаваньня, што добра відаць са скаргі праваслаўнай шляхты Беларусі і Украіны Варшаўскму Сойму 1623 г.: «Гэтай сягоньняшняй уніяцкай Русі ня ведаюць нашыя законы й ня ведаюць іх вялікасьці польскія каралі, бо ня ўзгадваюць аб ёй у прывілеях, дадзеных рускаму народу, узгадваюць толькі аб рускіх рымскага веравызнаньня і аб рускіх грэцкага веравызнаньня... Нашы правы й прывілеі, якімі нам належыць карыстацца, сапраўды непарушныя й адвечныя, нашы, кажам мы, бо Русь... грэцкага веравызнаньня, як і заўсёды йснавала ў той час, калі ёй былі нададзеныя гэтыя правы й прывілеі... Аб уніяцкай Русі не было ні слуху, ні духу, а таму і ў прывілеі аб ёй няма ні слова, ні згадкі».

Для праваслаўнага Сурты унія была «навіной», недарэчнасьцю, якая паўстала невядома адкуль і як. Ацэньвалася яна ім адназначна — «духоўная вайна... супраць дагматаў праўдзівай сьвятой праваслаўнай веры».

Час Трафіма Сурты у поўным сэнсе гэтага слова ёсьць часам зьмены культурнае сытуацыі на беларускіх землях. Пасьля падзеяў 1654-1661 г. няўмольна, на вачах людзей, якія памяталі «залаты век» магдэбурскіх цэнтраў, нібы прывід зьнікаў беларускі горад як культурнастваральны чыньнік. У беларускім месьце памірала ягоная душа, вуліцы й пляцы запаўняліся чужой культурнай традыцыяй і мовай, бо носьбітаў беларускай ужо амаль не было...

Глыбока сымбалічны час сьмерці самога летапісца — 1700 год. Сурта памёр разам з сваім стагодзьдзем, бліскучым аскепкам якога ён быў. Да поўнага заняпаду Магілёва заставалася восем гадоў...

ГАРАДЗКІ КШТАЛТ

Ігар Марзалюк

Нарадзінамі гораду можна лічыць XII стагодзьдзе, калі (як паказалі нашыя досьледы) на месцы гары Магілы, дзе на мяжы эраў існавала гарадзішча штрыхаванае керамікі, паўстаў замак. Ужо ў канцы X — пачатку XI ст. на гэтым месцы было паселішча, якое ў XII ст. было ўмацаванае магутным валам. Археалягічныя знаходкі паказваюць, што ў гэты час Магілёў быў цэнтрам фэўдальнае вотчыны, вакол якой месьціліся селішчы.

З XIV-XV ст. згадкі пра горад раз-пораз сустракаюцца ў летапісах ды актавых дакумэнтах, аднак то было толькі сталеньне, «падлеткавы» ўзрост, калі вакол замчышча пачынаюць фармавацца пасады...

Кажуць, што затуханьне аднае зоркі нараджае другую. Магілёў у гэтым сэнсе — узорны прыклад. Страта ў 1514 годзе Смаленска дала магутны імпульс для разьвіцьця места. Ні Шклоў, ні Ворша не маглі прэтэндаваць на пераймаьне функцыяў цэнтру транзытнага гандлю (якія меў да гэтага Смаленск), бо Ворша была ў эпіцэнтры вайсковага супрацьстаяньня паміж Масквою й ВКЛ, а Шклоў на той час ня меў такіх умацаваньняў як Магілёў.

Гандаль — вось галоўны чыньнік разьвіцьця местаў у XVI-XVII ст. Пакуль жывы быў транзытны гандаль, жывы быў і горад. Сканаьне Магілёва ў пажары 1708 году было разам з тым і сьмерцю магілёўскага гандлю. Пётар I, прасекшы «вакно ў Эўропу», падсек пад корань і само места, зьнішчыўшы неабходнасьць той функцыі Магілёва, якая давала магчымасьць ліцца залатому дажджу над горадам.

Магілёў — узорны прыклад беларускага традыцыяналізму й разам з тым культурнае адкрытасьці, што дазволіла яму выпрацаваць свой адметны кштaлт жыцьця які ён бараніў колькі было моцы. Гэты горад — мадэль шляху, па якім магла б ісьці эвалюцыйная вэстэрнізацыя беларускае культуры, калі б ня ўсе «калі б» нашае гісторыі.

Магілёўская праваслаўная выспа ў атачэньні ўніяцкага мора перakанаўча дэманстравала, што «вера грэцкая» магла быць сумяшчальная з заходняй традыцыяй, якая сталася арганічнай часткай агульнае культурнае прасторы места. Адказ на пытаньне «Усход ці Захад?» вырашаўся тут адмыслова — праз паўставаньне магілёўскіх праваслаўных крыжова-купальных базілік.

Магілёўская «эўрапейскасьць» не прыводзіла да страты нацыянальнае адметнасьці, бо зьбольшага была пабудаваная не на непасрэдным прылучэньні да заходняе культуровасьці праз рыма-каталіцкі касьцёл, а на асэнсаваньні ды праговорваньні гэтых культуралягічных навацыяў праз праваслаўную традыцыю. Магілёўскі фэномен жыцьцяздольнасьці беларускага праваслаўя трываў на гэтай эвалюцыі, яскравымі праявамі якой ёсьць і барочны фрэскавы роспіс праваслаўных бажніц (чаго вартыя толькі ацалелыя фрэскі Мікольскага храму!) і арнамэнтальныя фоны магілёўскіх абразоў, кафлі (ёсьць шматлікія аналёгіі ў нямецкім мастацтве) і штудыяваньне лаціны ў брацкай школе ды ў адметным ад расейскага праваслаўя сьвяткаваньня сьвятаў, прыкладам, Вялікадня, што адразу кінулася ў вочы напрыканцы XVII стагодзьдзя стольніку П.Талстому.

Разам з тым гарадзкая культура была аднародным полем, якое паглынала ў сябе прадстаўнікоў усіх хрысьціянскіх канфэсіяў. На братчынах кушнерскага цэху мірна цягнулі мёд і рыма-каталікі і праваслаўныя, ды што казаць пра простых вернікаў, калі сюды любілі забегчы й ксяндзы. Плаці й прыходзь. Больш ніякіх абмежаваньняў не існавала. Зусім іншыя адносіны тут былі толькі да ўніятаў...


Магілёў — ідэальны прыклад адстойваньня горадам уласных карпарацыйных інтарэсаў. Менавіта гарадзкі прагматызм быў тым грунтам, які вымагаў іх прыймаць рашэньні ў тым ці іншым рэчышчы.

Магілёўцы так зацята змагаліся з уніяй яшчэ й таму (пакінем цяпер у баку мэнтальны ды іншыя аспэкты праблемы), што яна ім была проста непатрэбная. Падпарадкаваньне клеру і трыманьне пад сваіх кантролем усіх царкоўных прыходаў дало магілёўцам той узор царкоўнай арганізацыі, які адпавядаў іх інтарэсам. Ужо гэтага было дастаткова, каб сустрэць належным чынам Я.Кунцэвіча, а потым не шкадаваць грошай на ягонае забойства. Тут інтарэсы месьцічаў і прадстаўнікоў гарадзкога клеру кардынальна розьніліся — як вынікае з дакумэнтаў, апошнія таемна дасылалі лісты Кунцэвічу. У іх яны выказваюць гатоўнасьць падпарадкавацца ўладыку, аднак рабіць гэта баяцца — з-за пагрозаў з боку магілёўцаў.

Калі жыцьцёвыя інтарэсы гораду вымагалі здацца й прысягнуць на «імя царскае» — так і рабілася. Тыя ж інтарэсы пазьней змусілі месьцічаў высекчы маскоўскі гарнізон зь немалой выгадай для сябе...

Перадача і ўзнаўленьне культурнае традыцыі йдзе праз тэкст, архітэктуру, мастацтва. І таму нягледзячы на нэндзу XVIII і расейскае чынадральства XIX стагодзьдзяў — горад працягваў жыць. Ягоныя дойліды яшчэ доўга будуць укладваць цэглу-пальчатку ў сьцены казённых будынкаў клясыцызму, а тутэйшая эліта будзе знаходзіць у сабе сілы весьці рэй Таго Магілёва, які зьнік у водблісках пажару 1708 году.

І таму апошні летапісец Беларусі — разам з тым апошні магілёўскі храніст. Так, той самы былы вуніят ігумен Арэста, які прайшоў вышкал у езуітаў і пісаў вершы на лаціне й па-грэцку, напіша тут галоўны твор свайго жыцьця — яшчэ адну Магілёўскую хроніку. І калі ў Арэсты ў 1812 годзе паўстане пытаньне, з кім быць — з акупантамі, якія зьнішчылі Ягоны Горад, ці з Напалеонам, ён абярэ апошняга. Прысягаючы разам з Варлаамам Шышацкім імпэратару Францыі, ён



Здымак з архіву Зьміцера Яцкевіча

Адваротны бок сэнтымэнтаў

Працяг са старонкі 1

большасьць насельніцтва чамусьці лічыць, што добра валодае расейскай мовай, але пры гэтым мала хто меў перад сабою мэту паставіць сабе належнае вымаўленьне і амаль ніхто не зьбіраецца «фільтраваць базар». Моўны пурызм каробіць магілёўцаў. Дастаткова паслухаць прамовы Лукашэнкі, каб прыкладна ўявіць сабе фанаграму магілёўскіх вуліц. Нават у сучасным падлеткавым слэнгу захаваліся рэшткі беларускай лексыкі. А мой бацька, пасьля таго, як прыехаў з Арменіі, доўгі час не заўсёды разумеў маналёгі маёй бабкі, хоць і старалася яна гаварыць «паправільнаму», дарма што пэдвучэльню скончыла.

У крамах я часта чуў, як гандляркі міжсобку размаўляюць па-беларуску або на трасянцы. Зьвяртаесься да іх па-беларуску, адказ — «вам чіво, парень?». У кавярнях нярэдка нацыяналістам наліваюць замест кавы — какаву. «Вы жа самі сказалі — какавы, во я вам і наліла...»

ГОГАЛЬ-МОГАЛЬ

Усе любілі гогаль-могаль у дзяцінстве, але хіба ня здрадзілі мы яму пры першай жа магчымасьці — і вы, і я, і ўсе астатнія? — пісаў Рамон Гомэс дэ ля Сэрна, чые грэгеры выклікаюць усьмешку згоды. Але я любіў ня гогаль-могаль, а малочны кактэйль, які гатавалі ў міксэрах, якія гулі, не раўнуючы самалёты, амаль ва ўсіх кафэтэрыях гораду майго дзяцінства. Гатуюць і сёньня.

Калі я жыў у Маскве, то думаў, што гэты салодкі напой ужо вымер, як некалі папулярны кактэйль таматны сок са сьмятанаю. У шматмільённай расейскай сталіцы я ня бачыў такога месца, дзе б гатавалі яго, як, дарэчы, ня ведаюць пра яго і ў Вільні. У Маскве я звычайна п'ю каву з каньякам або проста гарэлкай, у Вільні гарбату, у Магілёве ж прыходзіцца быць верным захапленьню свайго маленства — піць малочны кактэйль з коржыкам, бо кава падчас маіх візытаў звычайна абвяшчаецца дэфіцытам, а замовіўшы ў кавярні «Пінгвін» (інтэр'ер якой не зьмяніўся з часоў разьвітога сацыялізму) пяцьдзесят грамаў армянскага каньяку, атрымаеш у чарачцы прадукт гандлёвай вайны Азэрбайджана з маёй радзімай Арменіяй, ужываць які я ня раю.

У горадзе на Дняпры я пражыў большую частку свайго жыцьця, але заўсёды пачуваў сябе тут турыстам. Можа ў гэтым вінаватыя вогненна наперчаная баструма й тонкі лаваш, які не чарсьцвее ніколі? Можа й так, але да апошняга моманту я ня меў ніякіх сымпатыяў да сваіх армянскіх сваякоў, і ў іх атачэньні, не зважаючы на стракатыя паўднёвыя кампліменты «Андранік-джан, ты самы разумны (прыгожы, высокі, сьмелы, добры й гэтак да бясконцасьці)», пачуваюся чужаніцай. Праўда, гэта зусім не замінала мне пыхаць сваім хаўкаскім паходжаньнем, маўляў, адкуль я родам — там усе выхаваныя, і маё сэрца ў гарах. За гэта аднаго разу мяне нават пабілі проста пад вокнамі дому. Крычалі — бі яго, ён ня з нашага мурашніка! Армян чарнажопы! І падчас кучы-малы я абцасам пераламаў пальцы на руцэ адной узыходзячай зорцы ігры на баяне, а мо на акардэоне, не прыгадаю, толькі ўпэўнены, што гэтаму таленту граць на клявішных ці кнопачных больш не давялося. Што да мяне, то тады ўсё добра скончылася, нават гузакоў здаецца не было. І суседзкія беларусы, якія на крык нечай бабці з вакна «Паўлуша, дзетачка, хадзем паямо!» адказвалі: «Січас, бабушка!» — запаважалі мяне (каму ахвота ў гіпсе хадзіць?), і яшчэ за жарсьць да паленьня вогнішчаў у палісадніку, які на самой справе быў кавалкам сапраўднага лесу, і геразім пры будаваньні там жа буданоў.

Цікавая была гульня, тыдзень будавалі, пасьля нехта лётаў дахаты па сала, другі па бульбу, трэці па хлеб. Палілі вогнішча, пеклі бульбу, смажылі сала, усё зьядалі, а пасьля, імітуючы рухі каратыстаў, руйнавалі тую пабудову, а часам на распаленыя вуглі кідалі знойдзеныя на беразе Дняпра патроны часоў другой сусьветнай. Палісаднік, як водзіцца, высеклі й на яго месцы збудавалі жылыя дамы. Будавалі іх доўга, наколькі памятаю, дзёньнікі тры ці чатыры разам зь непажаданымі адзнакамі паляцелі праз высокі драўляны плот. Не схаваесься сам, дык хоць адзнакі схаваеш, натуральна, усё да часу.

Раён, у якім я жыў, называецца Кірава. Раён адносна новы, будаваўся ў 30-60 гадох разам з аўтамабільным заводам, што да апошняга часу выпускаў скрэпэры й аўтапагружчыкі для Кубы й Байканура, але сёньня Кубе машыны не патрэбныя, дый Байканур аб'ект ня вельмі актуальны для Казахстану, таму аўтамабільны завод амаль што памёр. Але заводзкі пасёлак застаўся. Маленькі такі, даволі чысты раёнчык, амаль як вёска. Усе ўсіх і пра ўсіх усё ведаюць. Існуе свая кругавая парука паміж кланамі, каціроўка якіх вызначалася ўплывам на кіраўніцтва заводу. Засталіся з таго часу трушчобы, інтэрнаты для сямейных, у якіх людзі жывуць дзесяцігодзьдзямі, у глыбіні душы ня верачы ў тое, што калі-небудзь ім давядзецца ўехаць ва ўласную кватэру.

Тагачасная дзікасьць «рабацяг» толькі сёньня мною ўспрымаецца з жахам. У дзяцінстве я пацяшаўся зь недаравальных рэчаў. Напрыклад, сьмяяўся з аповедаў свайго сябра Сярогі Мухартава пра тое, як адна асоба прывязвала да ног свайго немаўляці цагліны, і тлумачыла гэта тым, што дапамагае свайму сынулю ўмацоўваць мускулатуру ног. Чым дужэйшыя будуць ножкі, тым хутчэй ён на іх устане. Жалезная лёгіка, асабліва пасьля таго, як яна паспрачалася на сто рублёў з суседам, што яе дзіцёнак пойдзе на дзясятым месяцы свайго існаваньня. Пасьля такога трэнінгу малое сапраўды затупала ў запляжаваны мамашай тэрмін, толькі вось ногі ў яго скрывіліся назаўсёды. А можа, гэта ў яго ад прыроды? Ягоная старэйшая сястра вучылася са мною ў адной клясе й таксама не вызначалася роўнасьцю ног адносна восі. Цяпер яна працуе бармэнкай у адной з кавярняў, дзе ў гранёныя шклянкі наліваюць сьнежны кактэйль. І слушна, за стойкаю бара ня надта разгледзіш ногі дзяўчыны...

«БЕГУЩАЯ С ЛОВСАНА»

Ёсьць у горадзе помнік змагарам за савецкую ўладу на Магілёўшчыне. У народзе яго называюць «Бегущая с Ловсана». Пабудаваны ён у старой частцы гораду, на месцы колішняга гандлёвага пляцу. Манумэнтальны комплекс, як вадзілася, зь вечным агнём, барэльефамі з бронзы, са скульптурай, з ганаровaю вартай, у якой стаялі лепшыя камсамольцы гораду. Мала хто з магілёўцаў майго ўзросту не пастаяў каля вечнай (!) гарэлкі зь нефункцыянальным аўтаматам у руках. Я не стаяў. Па-першае, я ня быў камсамольцам, а па-другое, заўсёды вылучаўся няздатнасьцю да вайсковай муштры. Таму мяне й ня ўзялі стаяць на вятры й холадзе ў бутафорскай вайсковай форме. Я й не хацеў. А былі такія, што лічылі гэта за сапраўдны гонар. На сьвяты туды прыносілі кветкі й выступалі вэтэраны, успаміналі.

І вось адным красавіцкім днём 1988 году горад абляцела пагалоска, што 20-га прыяжджаюць з маскоўскім цягніком панкі, каб тут адсьвяткаваць дзень нараджэньня Адольфа Гітлера. Ніхто тады ў горадзе й бачыць ня бачыў панкаў. Мэталісты свае ўжо былі, ды й тое, іх час ад часу лупцавалі тутэйшыя гопнікі, якімі кіравала камсамольская брацыя, што зараз асела каля прэзыдэнцкага кабінэту, а вось панкаў не было.

Пагалоска раздражніла ўвесь горад. Гэта ж трэба, падонкі, дзень нараджэньня Гітлера яны вырашылі сьвяткаваць! Забіваць такіх трэба!.. Настаўнікі нас пужалі, маўляў, каго

Дняпроўская плынь

Валянцін Калнін

Мабыць, шмат хто, разглядаючы фізычную мапу Беларусі, заўважыў асаблівасьць нашай краіны: яе крынічныя воды разьбягаюцца ад цэнтру на ўсе бакі, нібы з парасону. Але як толькі з водаў утвараюцца рэкі ды набяруць яны моцы, то з імклівай хуткасьцю зьнікаюць з нашых вачэй, перацякаючы да сумежных тэрыторыяў.

Так і зь людзьмі — толькі пачне раскрывацца ў чалавека талент, як яго ўжо тутака няма і ён робіцца слаўным для іншых краінаў. Такімі сталіся Адам Міцкевіч для Польшчы, Ігнат Дамейка для Чылі, Марк Шагал для Францыі. Можна назьбіраць яшчэ тузін прыкладаў, пасьля чаго застаецца толькі ўпэўніцца, што сплываньне талентаў — зьява натуральная, абумоўленая геафізычнымі асаблівасьцямі роднай зямлі. А цяперашнім часам дадаліся да гэткай зьявы ўмовы эканамічныя. «Сплываюць» ня толькі таленты, але й тыя, хто мае пару моцных рук ды пару клёпак у галаве.

Што ж нам застанецца на будучыню? Хіба толькі Магілёўшчына, бо яе геафізычная сытуацыя не падлягае цалкам вызначанай вышэй заканамернасьці. Тут, на ўсходняй мяжы, назіраецца адваротная зьява: у Беларусь уліваецца моцная плынь Дняпра, што цаляе да цэнтру. Аднак хутка плынь збочвае з пачатковага накірунку і паважна, спакойна, амаль па простай лініі перасякнуўшы краіну, зьнікае на поўдні.

Магілёўшчына для мяне — край, поўны супярэчнасьцяў, вядомы й невядомы, зразумелы й незразумелы.

Край, вечна торганы ўплывамі ды сутыкненьнямі варожых бакоў. Край спрадвечных змагароў спачатку супраць уласных прыгнятальнікаў, а потым — калі спакусяцца абяцанай «свабодай», — супраць прыбышоў-вызваліцеляў.

Край шматлікіх калісьці праваслаўных манастыроў ды брацтваў зь велічнымі храмамі, увенчанымі рэнэсансовымі шчытамі заходнеэўрапейскага забарвеньня. Край з цудоўнымі збудаваньнямі ў барочным стылі каталіцкіх ордэнаў. Край унікальнага кнігадрукаваньня, багатага на выданьні як старaславянскіх, так і лацінскіх тэкстаў.

Край, які лічыўся бедным у складзе Расейскай імпэрыі, адзіны раз толькі зьведаўшы росквіту ў канцы XVIII-XIX ст., калі была кан'юнктура на ветразі для Чарнаморскага флёту, а Магілёўшчына прадукавала добры лён і палатно.

Край занядбаны культурна, асабліва ў міжваенныя й пасьляваенныя часы, калі не засталося рупліўцаў за тутэйшую культуру накшталт братоў Куторгаў, прафэсараў Пецярбурскага ды Маскоўскага ўнівэрсытэтаў, якія ў сярэдзіне мінулага стагодзьдзя штогод прыяжджалі ў родны Мсьціслаў з асьветніцкімі лекцыямі.

Край, які вынес на сьвет Божы шмат рупліўцаў беларускай мовы й культуры, сярод якіх мне асабліва блізкія І.Насовіч — складальнік першага слоўніка беларускай мовы, Е.Раманаў — этнограф, М.Гарэцкі — пісьменьнік, А.Куляшоў — паэт, М.Ткачоў — гісторык.

Польскі рэжысэр К.Занусі пажадаў ліквідаваць «чорную пляму» сваёй багатай геаграфіі, наведаўшы Магілёўшчыну. Пасьля ён не выказваўся, але выправіў за свой кошт аднаго здольнага хлопца з Мсьціслава на вучобу ў каталіцкую акадэмію.

Мне здаецца, што, нягледзячы на занядбанасьць і тарганіну, унутры Магілёўшчыны застаецца зерне некранутай, несапсаванай беларускай душы. Магчыма, менавіта цяжкія ўмовы жыцьця спрычыніліся да нейкай кансэрвацыі тут сапраўднай беларускай сутнасьці й мэнталітэту. Таму застаецца яшчэ спадзяваньне на лепшае. Папраўдзе, я не чакаю нейкага цуду накшталт Паўднёвай Карэі альбо чаго падобнага. Адзіная надзея — інтэграцыя ў Эўропу, паказ саміх сябе й погляд на саміх сябе з боку замежнікаў, пераацэнка ўласных каштоўнасьцяў і каштоўнасьцяў роднага краю.

пэўна спадзяваўся, што ягоная Patria паўстане ізноў...


А ў 1863 годзе магілёўскія юнакі будуць сьпяваць патрыятычныя гімны ды йсьці ў паўстанцкія аддзелы. А потым, калі будзе квітнець накіданьне ўсяго «истинно русского», у гэтым горадзе будзе жыць і працаваць над сваімі беларускімі зборнікамі ды штудыямі да гісторыі і археалёгіі Еўдакім Раманаў, будуць паўставаць музэі й выходзіць «Опыт описания Могилевской губернии» і «Могилёвская Старина».

І таму ў 1918 годзе ў гэтым горадзе віталі БНР, уважаючы яе за адзіную законную ўладу ў Беларусі. А ў 20-х гадох тут паўстануць беларускія маладзёжныя арганізацыі, выйдуць краязнаўчыя зборнікі.

А потым горад пачнуць забіваць. Рэпрэсаваць выкладчыкаў пэдінстытуту, нішчыць студэнцкую моладзь, нявечыць помнікі, трушчыць цэрквы, ператвараць у «крупнейший центр химической промышленности»...

Аднак прамоўленае аднойчы вельмі цяжка зьнішчыць. І менавіта таму ў 80-х тут зьявіліся вар'яты, якія размаўлялі па-беларуску, пачалася рэстаўрацыя места...

Здаецца, ён яшчэ жывы. Рэшткі спляжаных падмуркаў бажніц прамаўляюць да нас праз асфальт.



Здымак Васіля Цітова

толькі там заўважаць — хай чакае непрыемнасьцяў з боку міліцыі. Толькі ў той дзень мала хто не знайшоў падставы выехаць у цэнтар. Адзін казаў — касэт магнітафонных набыць вырашыў, другі красоўкі, трэцяму тэрмінова спатрэбіліся рыбацкія кручкі... У горадзе быў такі тлум, што можна было падумаць, што гэта не малалеткі будуць невядома нашто (пра эпатаж магілёўцы маюць даволі цьмянае ўяўленьне) сьвяткаваць нарадзіны Гітлера, а прыйдзе Мэсія. Столькі народу не зьбіралі нават такія любімыя народам сьвяты як 7 лістапада й 1 траўня. Усе чакалі нечага, чарговай маскоўскай навінкі. Але сьвята ў поўным аб'ёме не адбылося. Прыхільнікі фюрэра проста былі зьбітыя на пад'езьдзе да гораду магілёўскімі нашчадкамі справы яго суседа па гараскопу й панкі так і не падсмажылі яечні на вечным агні, што гарыць у гонар змагароў за Савецкую ўладу на Магілёўшчыне.

Сродкі масавай інфармацыі пра гэтае здарэньне прамаўчалі, а мой аднаклясьнік Андруха Серафімовіч распавядаў пра подзьвігі свайго дзядзькі, камсамольскага функцыянэра трэцяй рукі, як ён гераічна цягаў за «іракезы» юных «фашыстаў».

«Гэтыя сымбалі для нас сьвятыя», — казалі мне ў 1991-м мае аднагодкі, што стаялі на варце №1. Я браў у іх інтэрвію для абласнога радыё. «Гэты агонь будзе гарэць вечна», — казалі яны. Перадача пра камсамольцаў, што з жалязякамі стаяць на варце сымбаляў імпэрыі прайшла па абласным радыё, а літаральна праз колькі тыдняў пагас вечны агонь другога магілёўскага манумэнтальнага комплексу, прысьвечанага ахвярам другой сусьветнай вайны. Пра гэтую падзею ў даволі зларадңай форме паведамілі газэты. Старая ісьціна — няма нічога вечнага на гэтым сьвеце. Пераконваць у гэтым гадаванцаў школы камуністычнай моладзі не было сэнсу. Самі ўрэшце пабачылі...

МАГІЛЁЎ ЛІТАРАТУРНЫ

Дзіўна, але горад амаль не фігуруе ў гісторыі беларускага прыгожага пісьменства. Апроч Купалы, здаецца, ніхто з клясыкаў не зьвяртаўся... Ніхто зь іх тут не нарадзіўся, ніхто не перажываў тут першага каханьня і не прыймаў баявога хрышчэньня. Прынамсі, не прызнаюцца. Магілёў не авеяны такім рамантычным арэолам, як тая ж Вільня або Нясьвіж. Хоць сюжэтаў для раманістаў горад за гады свайго йснаваньня стварыў процьму. Нават, калі падняць толькі падзеі нашага стагодзьдзя. Апошняя стаўка расейскага імпэратара, зьнікненьне крыжа Еўфрасіньні Полацкай, перанос сталіцы зь Менску...

У расейскай жа літаратуры горад над Дняпром рэгулярна зьяўляецца на мізансцэнах ня самых горшых пісьменьнікаў — Сіманаў, Салжаніцын, Блок, Забалоцкі. У свой час тут пабывала плённая літаратарка й па сумяшчальніцтву расейская імпэратрыца Кацярына II, Пушкін быў праяжджаў, і не аднойчы, дзекабрысты... Расейскія літаратурныя міты квітнеюць на магілёўскай глебе. Стаіць помнік А.Пушкіну, дзейнічае музэй дзекабрыстаў. Беларусы ж сваёй міталёгіі тут ня маюць. Сьціплая шыльдачка у гонар А.Пысіна ня ў лік. А пра магілу Цішкі Гартнага ведаюць адно зацятыя нацыяналісты.

ФАТАГРАФІЯ

Раней людзі любілі фатаграфавацца, і не абы як, а добра ўсьведамляючы адказнасьць моманту. Апраналіся ў самае лепшае, прыводзілі ў парадак фрызуры і ўсёй сям'ёй ішлі ў атэлье, дзе іх чакаў зухаваты нашчадак іўдзейскага племені. Доўга рассаджваліся перад аб'ектывам, старанна чакалі «птушку». Здымкі клеіліся ў альбом, альбо адсылаліся сваякам... Праца фатографа ў атэлье службы быту шанавалася. Гэта раней... Цяпер у эпоху танных аўтаматычных фотакамэр карыстацца імі ў стане любы — націснуў на кнопку, і ўсё астатняе за цябе зробяць у лябараторыі. Сёньня супрацоўнікі фотаатэлье гораду пераведзеныя з разраду мастакоў у звычайныя станочнікі, ад якіх калі што й патрабуецца, то мінімальнае падабенства арыгіналу з пашпартным здымкам.

Раней на глебе магілёўскай бытавой фатаграфіі працавалі выключна жыды, і вучняў да сябе бралі выключна жыдоўскага паходжаньня. Гэта нармальна. Скажам, у Маскве вам толкам можа пачысьціць абутак толькі стары абісінец з выгляду больш падобны на старога цыгана, альбо ня больш прыцягальнай зьнешнасьці абісінка. Але вернемся да Магілёва й фатаграфіі. Недзе ў сямідзясятых сытуацыя пачала зьмяняцца. Асавечаныя нашчадкі іўдзеяў пачалі здаваць свае пазыцыі ў галіне бытавой фатаграфіі. Уладальнікі ніколі ня бачаных птушак сталі набіраць сабе вучняў славянскага паходжаньня. Рабілі гэта ня вельмі ахвотна. Старыя майстры лічылі, што няма цяпер моладзі здольнай у поўнай меры пераняць досьвед настаўнікаў. Адзін жыд дзеля выпрабаваньня сваіх вучняў нават прысылаў нэгра, якому нібыта было неабходна даслаць сваёй нэгрыцянскай маме картачку. Заданьне было ня столькі цяжкае, колькі зьбівала з панталыку. І толькі пасьля абавязковага здымку прадстаўніка чужое расы, дапускалася фатаграфаваць, так бы мовіць, белых людзей.

Зрэшты, можа быць, гэта ўсё толькі варыяцыі фатографаў на актуальную некалі жыдоўскую тэматыку. Так, напрыклад, да дзесяці год я быў упэўнены, што жыды ядуць грыбы лісічкі два разы. Адзін раз, і пасьля колазвароту яшчэ раз. Так казаў мой дзед, а дзеду я верыў...

Сёньня амаль ужо ня ходзяць фатаграфавацца «на памяць» у атэлье. Не заміраюць у паставах, падказаных фатографам. Сямейныя альбомы сёньня нашмат менш цікавыя. З працэсу замацаваньня імгненьня зьнік момант сакрамэнту — націснуў на кнопку і ўсё... Каста магілёўскіх фатографаў размылася як атавізм. Але я люблю разглядаць старыя альбомы. Тады й срэбра ў фотапаперу клалі больш.

БЭЙСБОЛ

Гэтай восеньню я быў у Магілёве праездам, літаральна пару гадзін. Нават дамоў не пасьпеў заскочыць. Некалькі гадзін, напоўненых фрустрацыяй — перасадка з аднаго аўтобуса на другі. Дом блізка, вось ён, рукой падаць, за Дняпром. Каб была зіма, то перайшоў бы, відаць, па льду.

Я сядзеў на лаўцы ў сквэрыку, што перад будынкам колішняга зямельнага банку (зь якога й быў выкрадзены Крыж Еўфрасіньні, дзе пасьля месьцілася рэдакцыя «Магілёўскай Праўды», а цяпер — карцінная галерэя) і ад няма чаго рабіць чысьціў люльку. Зьлёгку імжыла. Побач на газоне падлеткі гулялі ў нейкую незнаёмую мне гульню. Адзін кідаў другому маленькі, ня больш за тэнісны, мячык, які трэба было адбіць бітай, якая відавочна задумвалася як чаранок для рыдлёўкі, трэція пачыналі ў гэты момант бегчы ў непрадказальным накірунку. Здагадка прыйшла толькі пасьля таго, як перапрафіляваны тэнісны мячык быў удала адбіты й патрапіў у рэклямны шчыт банку «Дукат». Бэйсбол — «дзікі захад» і «гульня амэрыканскіх бязьдзельнікаў», — менавіта такія параўнаньні выплылі з падсьвядомасьці. Падумалася, што прыехаў не туды, куды ехаў. Зрэшты, так яно заўсёды бывае — у адну раку двойчы ўвайсьці нельга.

Я набіў люльку й старанна яе раскурыў. Саладкаваты дым пашчыпваў язык. Да майго аўтобуса заставалася амаль паўгадзіны...



Няслушна было б лічыць, што праблемы з рэстаўрацыяй магілёўскага Станіславаўскага касьцёла ўзьніклі ўчора і ўпершыню згаданыя ў «НН» №8-9. Тое, што першая спроба рэстаўрацыі помніка такога ўзроўню (па-сутнасьці, архітэктурна-мастацкага комплексу) у Беларусі сутыкнулася з мноствам праблемаў — наогул нармальна. Было б сюрпрызам, каб рэстаўрацыя беларускага помніка ў наш час праходзіла дасканала. Ненармальна тое, што ў Беларусі для прафэсійных рэстаўратараў не знайшлося іншай трыбуны.

Будаўніцтва мураванай бажніцы пры кляштары кармэлітаў у Магілёве распачалося ў 1738 г. Праз 14 гадоў яна была высьвячана як касьцёл Усьпеньня Божае Маці. На пачатку стылістыка касьцёла ўдавала на позьнебарочную, а ў 1782 г. касьцёл атрымаў шыкоўныя клясыцыстычныя шаты. У гэтым сэнсе ўбраньне касьцёла нашмат апярэдзіла зьяўленьне клясыцызму ў іншых рэгіёнах Беларусі. Напэўна, тут адбіўся выкшталцоны густ самога арцыбіскупа С.Багуша-Сестранцэвіча, у гонар якога касьцёл стаў звацца Станіславаўскім.

Інтэр'ер бажніцы, наадварот, захаваўшы позьнебарочную трактоўку сваёй структуры, атрымаў дадаткова шмат ракаковых элемэнтаў аздобы і апынуўся на мяжы эстэтычнага канфлікту з манумэнтальным і ляканічным фасадам.

Асноўная частка росьпісаў была выканана ў 1765-67 г. мастакамі Пятроўскім і Главацкім пры ўдзеле вучняў Пятра, Лук'яна й Рыгора. Лягічнае дапушчэньне, што касьцёл быў дадаткова аздоблены да прыезду Кацярыны II ў 1778 г, зь якою мастак Антоні Главацкі быў знаёмы асабіста. Натуральна, жывапіс быў падноўлены і пасьля 1782 г., з прызначэньнем арцыбіскупам Богуша-Сестранцэвіча. Пазьнейшыя перамалёўкі XIX-XX ст., у значнай ступені скажаючы некаторыя фрагмэнты, усё ж падпарадкоўваліся агульнай лёгіцы асноўных цыкляў росьпісаў і ў пэўнай ступені — стылістыцы.

Правядзеньне мастацкіх работаў у інтэр'еры Станіславаўскага касьцёла нанесла непапраўныя страты. Часткова жывапіс страчаны незваротна без папярэдняе фіксацыі, часткова зроблена імітацыя росьпісу XVIII ст. й г.д. Пра што й вялася гутарка ў нататцы, якая адкрывала тэму сусьветнай спадчыны ў 8-9-м нумары «НН». З-за тэхнічных прычынаў пры друку выпаў подпіс аўтара нататкі Вадзіма Гліньніка, за што рэдакцыя прыносіць яму свае прабачэньні.

Разам з тым мы атрымалі ліст канкрэтнага адказчыка за работы ў касьцёле — Фэлікса Янушкевіча, які й зьмяшчаем побач з артыкулам — вытлумачэньнем пазыцыі В.Гліньніка.

Перад намі, бадай, першы прыклад палемікі, якая разгортваецца ўсярэдзіне беларускай культуры і мае найперш культурныя матывацыі.

Сяргей Харэўскі

АДКРЫТЫ ЛІСТ

«рупліўца» Беларускае Каталіцкае Грамады

30 кастрычніка 1994, Менск

Шаноўны спадар рэдактар,

Зьвяртаюся да Вас — рэдактара газэты «Наша Ніва», якую праглядаю зь цікавасьцю. Чытаючы апошнюю газэту №8-9, я быў заскочаны інфармацыяй, якая ідзе наперадзе «Міжнароднай Хартыі ў справе кансэрвацыі й рэстаўрацыі помнікаў і гістарычных мясьцін».

Спадзяюся, хоць «Вы ад нас далёка», аднак памятаеце людзей, якія жывуць у межах сучаснай Беларусі, якіх асабіста ведаеце здаўна. Тады рупліўцаў лічылі на пальцах, асабліва ў рэстаўрацыі. Слыць руплівым у дзяржаўнай рэстаўрацыі было небясьпечна. Сыстэма стаяла моцна.

Дзіўна чытаць такое пра сябе сёньня, калі многае, што некалі абмяркоўвалася, зьдзейсьнілася. Ёсьць Дзяржава, Мова не ў падпольлі і ёсьць дзе адкрыта праявіць свае магчымасьці Беларусу. А большага, я ўпэўнены, мы таксама дасягнём. Бо Жыве Беларусь!

Па свайму зьместу інфармацыя ў «Нашай Ніве» абразьлівая для мяне, паколькі я кірую Мастацкай майстэрняй БКГ і нясу адказнасьць за стан рэстаўрацыі Магілёўскага Катэдральнага Касьцёла. Інфармацыя падрывае аўтарытэт БКГ, які заслужана, хоць і зь цяжкасьцямі, нарастае працай хрысьціянскіх рупліўцаў па розных напрамках нашай статутнай дзейнасьці. Згадайма толькі пра адроджаны пэрыядычны часопіс «Хрысьціянская Думка», іншыя выданьні. Вы, як выдавец, добра ведаеце, якіх высілкаў каштуе такая справа. І ўсё — без прызнаньня de jure нашай арганізацыі мясцовай каталіцкай адміністрацыяй. А колькі было супраць БКГ заяў, зваротаў і судовых позваў, напрыклад, Саюза Палякаў на Беларусі, БелДзяржФілярмоніі.

Да Генэральнага пракурора і ў Вярхоўны Савет РБ таксама толькі ўжо па справах рэстаўрацыі ў Магілёве зьвярталіся «рупліўцы» і ад дзяржаўнай рэстаўрацыі. Ім вельмі закарцела асудзіць нас за нібыта парушэньні Закона па ахове помнікаў. Спынілі і ненадоўга затрымалі працэс рэстаўрацыі. А вынік... Мы далей рэстаўруем Катэдру, паколькі фактаў зьнішчэньня ня выяўлена. Адразу пасьля заканчэньня пракурорскага дасьледаваньня ДЗІНАС выдала нам ліцэнзію за №33 на працяг работы. Дарэчы, тымі ж «рупліўцамі БКГ» зроблены макет ліцэнзіі, якую зараз атрымліваюць і дзяржаўныя рэстаўратары.

Беларуская рэстаўрацыя: кодэкс

Вадзім Гліньнік, *сябра ICCROM*

«Restoration, so called, is the worst manner of destruction».

John Ruskin (1849) «The Seven Lamps of Architecture».

У 1979 г. Амэрыканскі Інстытут Рэстаўрацыі (AIC) распрацаваў «Кодэкс этыкі й стандарты практыкі» рэстаўрацыйнае прафэсіі. Патрэба ў гэткім дакумэнце грунтавалася на тым, што «рэстаўрацыя гістарычных і мастацкіх твораў — гэта занятак, які патрабуе шырокае падрыхтоўкі й спэцыяльнага пакліканьня. Ён аддае ў рукі рэстаўратара культурныя абсягі агромністае каштоўнасьці й гістарычнае значнасьці. Каб адпавядаць патрабаваньням такога высокага даверу, неабходна валодаць пачуцьцём высокае маральнае адказнасьці» (AIC. Code of Ethics and Standards of Practice // Museum News, March-April. 1980. P.28-34).

Амэрыканскі «Кодэкс этыкі...» стаўся першай спробаю стварэньня нацыянальнага «зводу прынцыпаў і нормаў, якімі мусіць кіравацца рэстаўратар паводле этычнае практыкі прафэсіі». Цягам наступнага дзесяцігодзьдзя на гэтым кірунку ў ЗША, Нямеччыне, Англіі, Канадзе ды ў іншых разьвітых краінах быў створаны цэлы шэраг міжнародных і нацыянальных нарматыўных дакумэнтаў, якія рэгулююць этычныя аспэкты рэстаўрацыйных прафэсіяў.

Беларускага «Кодэксу этыкі рэстаўратара» у гэтым шэрагу пакуль няма. Але тое ня значыць, што наша краіна ня мае ў ім патрэбы. Адсутнасьць нацыянальнага кодэксу прафэсійных паводзінаў рэстаўратара змушае зьвярнуцца да замежнага досьведу й выканаць свой маральны абавязак перад грамадзтвам у частцы прафэсійнае адказнасьці перад ім: «У сваіх узаемастасунках з публікай кожны рэстаўратар мусіць выкарыстоўваць любую магчымасьць дзеля асьветы публікі адносна мэтаў, задачаў і намераў свае прафэсіі, з тым, каб спрыяць лепшаму грамадзкаму разуменьню рэстаўрацыі» (AIC. Code of Ethics...)

У прадмове да публікацыі ў «НН» тэкста «Міжнароднае хартыі ў справе кансэрвацыі й рэстаўрацыі помнікаў і гістарычных мясьцінаў» (Вэнэцыянская хартыя) сярод характэрных прыкладаў беларускіх рэстаўрацый, якія не адпавядаюць прынцыпам гэтага агульнапрынятага ва ўсім цывілізаваным сьвеце міжнароднага дакумэнта, былі згаданыя аднаўленчыя работы, якія праводзіліся Беларускай каталіцкай майстэрняй мастацтваў Беларускае Каталіцкае Грамады (БКММ БКГ) у сярэдзіне магілёўскага Станіславаўскага касьцёла (сьвядомае парушэньне мэтодыкі падчас рэстаўрацыйных работаў прывяло да поўнага зьнішчэньня некалькіх насьценных росьпісаў і частковага пашкоджаньня ўнікальнага позьнебаракавага цыклю.

Рэакцыя на публікацыю ў «НН» прадэманстравала непрыняцьце калегамі з БКММ крытыкі з боку прафэсійных рэстаўратараў і спэцыялістаў у ахове гісторыка-культурнае спадчыны. Таму дарэчы будзе ўзгадаць пра тое, што паводле ангельскага этычнага кодэксу, «перад тым, як распачаць працу на аб'екце, рэстаўратар абавязаны прыняць да ўвагі парады калегаў і асобаў, адказных за аб'ект» (United Kingdom Institute for Conservation. Guidance for Conservation Practice. — London, UKIC, 1981), а таксама тое, што ў Амэрыцы «рэстаўратар ня мае права здаць работу без адпаведнага водгуку другога рэстаўратара, і невыкананьне гэтага правіла можа мець наступствам пашкоджаньне мастацкіх і культурных каштоўнасьцяў» (AIC. Code of Ethics...).

Ва ўмовах айчыннага рынку няўвага да думкі калег-канкурэнтаў зусім зразумелая. Паспаліты недавер да прафэсіяналізму наогул ёсьць знакам нашага часу. Пры гэткім стане грамадзкае сьвядомасьці лёгка можа быць народжаны чарговы каляпалітычны міт аб наяўнасьці мафіёзнага афіцыйна-рэстаўрацыйнага лобі, якое ўсяляк замінае беларускаму народу рухацца да нацыянальнага адраджэньня. Сучаснае становішча рэстаўрацыйнае гаспадаркі ў дзяржаве сапраўды катастрафічнае. Але гэтае становішча вынікае не з засільля прафэсіяналізму рэстаўрацыі, але якраз зь яго недахопу. Ва ўмовах адсутнасьці дзяржаўнай манаполіі на рэстаўрацыю, роўна як і дзяржаўнага кантролю за рэстаўрацыяй, натуральнае жаданьне грамадзтва павялічыць аб'ёмы аднаўленчых работаў, і прысьпешыць іхняе завяршэньне (да юбілею, да фэсту, да выбараў і г.д.) можа перакінуцца незваротнымі стратамі гісторыка-культурнае спадчыны. Цяперашні стан сьценапісу магілёўскага Станіславаўскага касьцёла — таму вельмі яскравы прыклад. І прыклад гэты ня будзе апошні, калі тэрмінова не паставіць стыхійны рамонтна-аднаўленчы працэс у краіне на трывалы грунт рэстаўрацыйнае мэтадалёгіі.

Сытуацыю са стратаю магілёўскіх размалёвак варта разгледзець асобна ў сьвятле этычных праблемаў рэстаўрацыйнае прафэсіі.

Перадусім трэба сказаць, што ўжыты ў прэамбуле да «Вэнэцыянскае хартыі» («НН» №8-9, 1994) у дачыненьні да плёну працы БКММ прафэсійна-жаргонавы выраз «змыць фрэскі» патрабуе ўдакладненьня. Сьценапіс, які быў зьнішчаны ў часе татальных расчыстак росьпісаў ад пазьнейшых напластаваньняў, паводле тэхналёгіі быў ня фрэскавы, але клея-крэйдавы. Што да спосабу зьнішчэньня, дык сьценапіс быў ня змыты, а мэханічна абадраны. Як бы там ні было, але беларускай культуры прычыненыя непапраўныя страты. Парадокс сытуацыі ў тым, што зроблена гэта, як казалі продкі — «стараньнем і коштам» грамадзкай супольнасьці, вядомай, дзякуючы плённай дзейнасьці яе сяброў на ніве нацыянальна-культурнага станаўленьня.

Прасочым разьвіцьцё сюжэту паводле афіцыйных дакумэнтаў, якія захоўваюцца ў архіве Дзяржаўнае інспэкцыі па ахове помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь (Дзінас).

Паводле пратаколу нарады ў начальніка Дзінас ад 27.02.1992 з удзелам БКММ і прафэсійных рэстаўратараў, якія на той час ужо працавалі ў Станіславаўскім касьцёле, была адзначана «недапушчальнасьць нескаардынаванага правядзеньня работ па рэстаўрацыі росьпісаў асобнымі групамі выканаўцаў» і вырашана «ў мэтах паскарэньня работ па рэстаўрацыі касьцёла, затрымка тэрмінаў вытворчасьці якіх пагражае беззваротнымі стратамі каштоўных вартасьцяў помніка (?!), прызнаць мэтазгодным арганізацыю сумеснай работы на аб'екце спэцыялістаў Менскага абласнога рэстаўрацыйнага ўпраўленьня і Беларускай каталіцкай майстэрні мастацтваў БКГ».

Але ўжо ў траўні на нарадзе ў касьцёле Станіслава, уважаючы «на грубыя парушэньні вядзеньня рэстаўрацыйных работ БКММ», а таксама на «поўнае ігнараваньне заданьня, выдадзенага БКММ навуковым кіраўніком», было канстатавана, што «без папярэдняй навукова-дасьледчай дакумэнтацыі свавольна праведзены татальныя расчысткі люнэтаў, гзымсаў, алтара. Расчысткі праведзеныя бессыстэмна, без папярэдняй праектна-рэканструкцыйнай працы, з грубымі парушэньнямі тэхналягічных мэтадаў». Пратакол нарады завяршаецца папярэджаньнем — «калі рэстаўрацыйная дзейнасьць БКММ ня будзе спынена, помніку пагражаюць беззваротныя страты». Аб тым, што «без папярэдняй графічнай фіксацыі стану жывапісу да рэстаўрацыі, хімічных дасьледаваньняў, дасьледчых зандажоў, распрацоўкі мастацкай і тэхналягічнай канцэпцыі... рэстаўрацыі помніка і зацьвярджэньня мэтодыкі выкананьня работ, зроблены свавольныя расчысткі жывапісу люнэтаў, алтара, гзымсаў» паведамляецца і ў дакладной запісцы афіцыйнага навуковага кіраўніка на імя старшыні Дзінас. Можна зразумець прафэсійнага мастака-рэстаўратара, які паводле «Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» нясе «пэрсанальную адказнасьць за зьберажэньне адметных вартасьцяў і ўнікальных фрагмэнтаў гісторыка-культурных каштоўнасьцяў, а таксама за навуковую і мэтазгодную абгрунтаванасьць... рашэньняў, якія прымаюцца і рэалізуюцца» (Артыкул 57).

У кастрычніку 1993 г. навуковы кіраўнік праз немагчымасьць выконваць свае законныя абавязкі адмовіўся весьці аўтарскі нагляд за ходам рэстаўрацыйных работаў, бо ў часе яго адсутнасьці «Беларуская Каталіцкая Грамада непапраўна пашкодзіла росьпісы» (дакладная запіска ад 18.11.93).

У лістападзе кампэтэнтныя экспэрты канстатавалі парушэньне заканадаўства пры вядзеньні рэстаўрацыі насьценнага жывапісу ў Станіславаўскім касьцёле. У пратаколе было адзначана, што «па-першае, без адпаведных узгадненьняў праекту рэстаўрацыі і дазволу БКММ былі самавольна распачатыя работы ў цэнтральным і бакавым нэфах касьцёла па татальнай расчыстцы жывапісу, таніроўцы фрагмэнтаў, рэканструкцыі страчаных фрагмэнтаў кампазыцый. Па-другое, поўнасьцю зьнішчана выява «Хрост» цэнтральнага нэфа,



Станіслаўскі касьцёл 8 кастрычніка 1981 году

Як на справе выглядае працэс рэстаўрацыі Храма да і пасьля нашага прыходу, я дакладваў у траўні бягучага году ў Менску на навуковай канфэрэнцыі «Барока на Беларусі». Яна праводзілася Дзяржаўным Мастацкім Музэем і Акадэміяй Навук Беларусі. Матэрыялы канфэрэнцыі будуць надрукаваныя.

З прыкрым сарказмам пісаць пра «змытыя» фрэскі і не згадаць пра раскрыцьцё старажытных фрэсак, зробленае згодна сучаснай рэстаўрацыйнай мэтадалёгіі; не абмовіцца аб адкрыцьці больш 70-ці кампазыцый унікальнага насыценнага жывапісу (па аўтэнтычнасьці яны ня маюць аналягаў у Беларусі і за яе межамі); называць прафэсійную работу саматужнай, калі з намі працуюць вядомыя майстры рэстаўрацыі (прыгадайма тут Віктара Лукашэвіча, які рэстаўраваў фрэскі Мікалаеўсай царквы ў Магілёве, ляпніну і жывапіс Полацкай Сафіі, ратаваў фрэскі ў Бялынічах, адрэстаўраваў абраз Маці Божай Будслаўскай, заступніцы ўсіх каталікоў Беларусі, для якой творыцца чацьвёртая ў сьвеце Малая Базыліка) — па меншай меры абсурдна.

Мы сваіх справаў ад грамадзкасьці не хаваем. Шкода, вы не наведалі экспазыцыі «Барока на Беларусі. Выстава паводле рэстаўрацыі Катэдральнага Касьцёла Магілёва ў 1992-1994 годзе» ў галерэі Пушкіна ў Віцебску пад час Шагалаўскіх дзён. То быў годны астравок Беларушчыны, які па волі сёньняшняга імклівага часу Вы абплылі. Эстэцкая ж газэта «Наша Ніва», якая чуйна рэагуе на неардынарныя мастацкія зьявы, таксама не дала свайму чытачу рэляцыю пра першую ў гісторыі Беларусі выставу па рэстаўрацыі. Дарэчы, як і пра Міжнародны фэстываль хрысьціянскай музыкі «Магутны Божа». Ён ужо другі раз праходзіў у адрэстаўраваным намі касьцёле. Непасрэдны ўдзел у арганізацыі і правядзеньні яго прымалі «рупліўцы БКГ», зь лёгкай рукі якіх зьявілася сама назва фэстывалю.

Вельмі зьдзіўляе, што паведамленьне пра нашу нібыта некампэтэнтную дзейнасьць пайшло ў газэту пасьля заканчэньня пракурорскага дасьледаваньня, калі ў дзяржаўнай рэстаўрацыі ведаюць вынікі, але чамусьці ўпарта працягваюць даваць дэзынфармацыю, кампрамэтаваць БКГ.

Памятаючы тое, што з «Нашаю Нівай» супрацоўнічалі Янка Купала, Якуб Колас, браты Луцкевічы, М.Багдановіч, М.Гарэцкі, іншыя шанаваныя Беларусьсю Адраджэнцы, прашу Вас быць больш пільнымі да сучасных аналітычных крыніц. А інфарматар, калі не адмовіцца ад напісанага і публічна не прынясе прабачэньня БКГ на старонках Вашай газэты, атрымае судовую позву згодна грамадзянскага кодэксу Рэспублікі Беларусь аб ахове гонару і годнасьці (ст.7), паколькі такая антырэкляма адбіваецца на справах нашай арганізацыі.

Улічваючы матывы і ўсе акалічнасьці майго звароту да Вас аб абароне гонару БКГ, настойваю на публікацыі адкрытага ліста ў «Нашай Ніве».

Зычу ўсяго найлепшага ў Вашай высакароднай справе,

з павагай

Фэлікс Янушкевіч,
Старшыня Беларускае
Каталіцкае Грамады

этыкі, якога няма

выкананая ў клея-крэйдавай тэхніцы, плошчай 9,5м^2 і часткова зьнішчана выява «Гісторыя Магілёва» цэнтральнага нэфа, плошчай 9,5м^2».

Па факту зьнішчэньня росьпісаў у касьцёле Сьв. Станіслава была праведзеная экспэртыза, вынікі якой пацьвердзілі, што ў часе рэстаўрацыйных работаў «мастакамі-рэстаўратарамі БКММ цалкам расчышчаны ад запісаў сярэдзіны XIX ст. дзьве кампазыцыі», а таксама выдалены пазьнейшыя напластаваньні яшчэ чатырох кампазыцыяў, а «ў месцах стратаў выканана рэканструкцыя». Экспэртызу праводзілі спэцыялісты Дзяржаўнага мастацкага музэя РБ, у сувязі з чым яго дырэктар у лісьце на імя старшыні Дзінас палічыў неабходным «навядзеньне парадку ў рэстаўрацыі помнікаў манумэнтальнага жывапісу ў Рэспубліцы», маючы на ўвазе сярод іншага і «пераатэстацыю рэстаўратараў з прадстаўленьнем права вядзеньня рэстаўрацыйных работ» (ліст №60 ад 3.02.1994).

Тым часам, Дзяржінспэкцыя па ахове гісторыка-культурнай спадчыны перадала ў пракуратуру матэрыялы па фактах парушэньня заканадаўства пры рэстаўрацыі магілёўскага сьценапісу...

У гэтым месцы гісторыі рэстаўрацыі магілёўскіх размалёвак варта запыніцца з тым, каб патлумачыць сутнасьць праблемаў, якія паўсталі перад мастакамі-рэстаўратарамі і прааналізаваць падыходы, якія, урэшце, прывялі да стратаў. Але перад тым неабходна зрабіць невялікую выправу ў бок рэстаўрацыйнае тэорыі.

У нетрах масавае сьвядомасьці бытуе ўяўленьне, што рэстаўрацыя мае на мэце вяртаньне помніку нейкага «першапачатковага выгляду», або прывядзеньне формы помніка да нейкага «адзінага стылю» і г.д. Першая думка заганяе ў пастку — пашкоджаны помнік у прынцыпе ня можа быць вернуты ў «першапачатковы стан», ён толькі можа быць прыведзены ў адпаведнасьць з сучасным уяўленьнем аб тым, якім гэты стан мог (мусіў) бы быць. Да гэтай ідэі стасуецца міт аб тым, што мастак-рэстаўратар паводле прыроды свайго таленту можа пранікнуць у глыбіні страчанага вобразу й аднавіць яго. Гэты комплекс ідэй зь нетраў масавае сьвядомасьці пры спробе рэалізацыі на практыцы непазьбежна абарочваецца стратамі гісторыка-культурных напластаваньняў — сьлядоў творчае актыўнасьці пазьнейшых эпохаў, да якіх гэты тып сьвядомасьці не адчувальны. «Помнік архітэктуры — гэта кніга, у якой кожнае пакаленьне напісала па старонцы. Ня трэба псаваць аніводнай зь іх», — пісаў Анатоль Франс, крытыкуючы вынікі г. зв. «мастацкіх» рэстаўрацыяў канца XIX ст.

Тое ж самае з рэстаўрацыямі «стылістычнымі», якія маюць на мэце ачысьціць структуру помніка ад стылістычна «прыпадковых», неадпаведных «чысьціні стылю» элемэнтаў.

Абодва гэтыя накірункі шырока практыкаваліся ў рэстаўрацыі эпохі рамантызму і пазьней крытыкаваліся за гвалтоўнасьць і суб'ектывізм. Гісторыя эўрапейскае рэстаўрацыі XIX ст. дае багата прыкладаў таму, колькі стратаў ляжыць на шляху вяртаньня помнікам «першапачатнага выгляду», або «адзінага стылю» іхнім формам. Іранізуючы з вынікаў «мастацкіх» рэстаўрацый мінулага стагодзьдзя, слынны ангельскі мастацтвазнаўца Джон Раскін вызначыў рэстаўрацыю як «найбольш татальнае разбурэньне, якое будынак можа спазнаць». Стваральнік першае тэорыі рэстаўрацыі Віоле-ле-Дзюк выказаўся з гэтай нагоды ня менш адназначна — «лепей пакінуць хворага паміраць, чым забіць яго».

Эўрапейская цывілізацыя зрабіла высновы з памылак свае культурнае гісторыі, ствараючы сучасную рэстаўрацыйную тэорыю. Сучасная рэстаўрацыя — не мастацтва, але род навукова-дасьледчыцкай дзейнасьці. Стваральнік сучаснае тэорыі Джаваноні, пісаў, што «мастацтва рэстаўратара ня створана для палётаў. Яно складаецца з назіраньняў, цярплівай і маўклівай працы, з аналітычнага й дэтальнага дасьледаваньня і сыстэматызацыі, сьціплага самаабмежаваньня, якое штурхае рэстаўратара да таго, каб прысьвяціць сябе прафэсіі цалкам, каб разглядаць сваю працу як працу для помніка, а не для рэстаўратара».



Фрагмэнт размалёўкі сярэдзіны XIX ст., страчаны падчас рэстаўрацыі

Падобнае вызначэньне прафэсіі фіксуюць і сучасныя міжнародныя этычныя кодэксы. «Прафэсійная дзейнасьць рэстаўратара адрозная ад дзейнасьці мастака або рамесьніка. Асноўным крытэрыем гэтае адрознасьці ёсьць тое, што рэстаўратары па роду свае дзейнасьці не ствараюць новыя культурныя аб'екты» (The Conservator-Restorer: A Definition of the profession // ICOM News. 1986. V.39 Nr1. P.5-6).

Паводле «Вэнэцыянскае хартыі» мэтаю рэстаўрацыі помнікаў ёсьць «захаваньне іх як твораў мастацтва, а таксама як гістарычнага сьведчаньня» (Арт. 3). Іншымі словамі, кожны помнік культуры мае сваю адметную гісторыю бытнаваньня ў часе, цягам якой зь ім адбываюцца пэўныя зьмены (старэньне, рамонты, пераробкі, пашкоджаньні). Сьляды гэтых зьменаў сьведчаць ня толькі пра гісторыю ўласна помніка, але й нясуць інфармацыю пра гісторыка-культурныя эпохі, зь якімі яны храналягічна зьвязаны. Важна захоўваць фізычную цэласнасьць гістарычнага аб'екта, бо яго «дакумэнтальныя якасьці — базіс для дасьледаваньняў па гісторыі мастацтва, этнаграфіі, археалёгіі ды іншых навукова абгрунтаваных дысцыплінах» (The Conservator-Restorer...), адсюль — найпершая задача рэстаўратара — кансэрвацыя, то ж бо ўмацаваньне фізычнае структуры помніка і матэрыялаў, зь якіх ён складзены. Мэта кансэрвацыі — прыпыніць дэструкцыю помніка, стабілізаваць яго фізычны стан, бо цалкам спыніць разбуральныя працэсы ў прынцыпе немагчыма, можна адно запаволіць іх.

Закансэрваваны такім чынам аб'ект часьцяком недаступны для разуменьня звычайнага спажыўца гісторыка-культурнае спадчыны і патрабуе спэцыяльнага вытлумачэньня. Адсюль — задача другога рэстаўрацыйнага этапу — уласна «рэстаўрацыі» — «зрабіць разбураны або пашкоджаны артэфакт зразумелым, пры гэтым мінімальна ахвяруючы яго эстэтычнай і гістарычнай цэласнасьцю». (The Conservator-Restorer...).

Вяртаючыся да праблемаў рэстаўрацыі магілёўскага сьценапісу трэба ведаць, што створаныя ў сярэдзіне XVIII ст. фрэскі цягам наступнага часу колькі разоў panaўляліся, а ў XIX ст. некалькі росьпісаў былі перапісаныя наноў у клеявой тэхніцы. На пачатку нашага стагодзьдзя частка сьценапісу была закрыта слоем алейнай фарбы. Цяжкасьці паўсталі пасьля таго, як была пастаўленая некарэктная задача вярнуць інтэр'еру першапачатковы барокавы выгляд, а значыць, ачысьціць яго ад пазьнейшых гістарычных напластаваньняў. У выпадку алейнай зафарбоўкі рана ці позна, але яе трэба было б выдаляць, бо яе разбурэньне правакуе разбурэньне фрэскавага жывапісу. «Аднак, сьпяшацца з раскрыцьцём ня варта, бо пры сучаснай культуры расчыстак існуе вялікая пагроза страты верхніх лесіровачных слаёў жывапісу. Раскрыты з-пад пазьнейшых напластаваньняў помнік можна будзе выкарыстоўваць для вывучэньня сыстэмы жывапісу, але ён, амаль напэўна, страціць прызнакі асабістае манэры мастака» (Жлондзь А.Г., Маслов К.И. Несколько замечаний в связи с проблемой реставрации церковных росписей // Святыни и культура. Москва, 1992. С.52). Пра культуру расчыстак магілёўскага сьценапісу сьведчыць публічнае прызнаньне аднаго віцебскага матака: ён адзін з 1992 г. «адрэстаўраваў каля 2500 квадратных мэтраў старога жывапісу» (Аргументы и Факты в Белоруси. №43'94). Гэтак калі працаваць 360 дзён у год дык трэба расчышчаць па некалькі квадратных мэтраў штодня. У падобнай сытуацыі пры рабоце з фрэскамі Рублёва прафэсіянал вышэйшае катэгорыі расчысьціў 10 см^2 за месяц. Пры такіх тэмпах расчыстак страты магілёўскага сьценаісу былі непазьбежныя. Так была пашкоджана фальшмармуровая паліхромія гзымсу, якая была затым папросту зроблена наноў і цяпер замест сапраўднага бараковага фальшмармуру мы маем яго сучасную копію.

Што да зьнішчанага сьценапісу XIX ст., аб якім гаворка ішла вышэй, дык праблема яго захаваньня нават ня ставілася. Ён нават ня быў дасьледаваны й задакумэнтаваны. Тэхнічная праблема пры такой сытуацыі ў тым, што фарбавы слой «сухой» бараковай фрэскі (fresco-a-secco) дае тую ж самую дэструкцыю, як і клеявы сьценапіс верхняга слою. Таму без спэцыяльнай павелічальнай тэхнікі і інструмэнтаў хірургіі вока, роўна як і без спэцыяльнае мэтодыкі у прынцыпе немагчыма зьняць верхні слой, не сапсаваўшы ніжні. Бо яны між сабой фактычна перамяшаныя. Але нават калі дапусьціць крамольную для прафэсіянала думку адкрыць ніжні сьценапіс, дык была магчымасьць акуратна зьняць росьпіс XIX ст., расслаіўшы два жывапісныя слаі. Для гэтага, праўда, трэба было дзьве рэчы — добрая воля і ўмельства.


Асобна трэба адзначыць, што пасьля татальных расчыстак магілёўскі сьценапіс быў padноўлены. Пры гэтым не было выканана патрабаваньне «Вэнэцыянскае хартыі» у тым, што «элемэнты, якімі замяняюцца страчаныя часткі... мусяць адрозьнівацца ад арыгіналу такім чынам, каб рэстаўрацыя не фальсіфікавала мастацкі або гістарычны грунт» (Арт. 12). Адрозьніць аўтэнтычны жывапіс ад сучасных рэканструкцыяў у касьцёле Сьв. Станіслава непрафесіяналу цяпер немагчыма.

У выніку атрымаўся паноўлены сучаснымі мастакамі інтэр'ер, які адпавядае ўтылітарным патрэбам касьцёльнай грамады, але як гістарычны дакумэнт страціў свае якасьці.

Беларусь ня мае свайго кодэксу этыкі рэстаўратара. І пакуль пад аднаўленчыя работы ня будзе падведзены трывалы грунт навуковае мэтадалёгіі, пад прапагандысцкую траскатню аб «адраджэньні гісторыка-культурнае спадчыны» будзе й надалей адбывацца працэс яе якаснага перараджэньня. І пакуль грамадзтва, якое страціла густ аўтэнтычнасьці ўласнае культуры, не схамянецца, дагэтуль актуальнымі будуць словы Раскіна, узятыя за эпіграф гэтага артыкула: «Так званая рэстаўрацыя ёсьць найгоршым відам разбурэньня».

АПТЫМІЗМ ПАВОДЛЕ КЭНА КІЗІ

Томаш Мірковіч



Кэн Кізі ведамы ў нас пераважна дзякуючы свайму першаму раману «Палёт над зязюліным гняздом», яго тэатральнай адаптацыі, выкананай Дэйлам Васэрманам, а таксама ўзнагароджанаму пяцьма Оскарамі фільму Мілаша Формана. Твор узьнік на замову Кэрка Дагласа, які — захоплены раманам — купіў на яго правы й сам выступаў на Брадвэі ў ролі МакМэрфі. Доўгія гады ён таксама рабіў захады з мэтаю зьняць фільм. Пазьней нават дайшло да канфлікту паміж ім і сынам, Майклам Дагласам, які як прадзюсэр даручыў галоўную ролю ня бацьку, а Джэку Нікалсану. Гэты апошні аднак выканаў ролю з такім бляскам, што Кэрк Даглас публічна прызнаў, што не стварыў бы лепшага вобразу.

Раман бясспрэчна належыць да палітычнай літаратуры. Паводле задумы аўтара, ён скіраваны супраць Амэрыкі вялікіх карпарацыяў і банкаў, сымбалем якое выступае ўсяўладны Камбінат, дзе Вялікая Загадчыца Аддзелу — усяго дробная дэталька. Але ўнівэрсальная мэтафара Кізі стасуецца ва ўсім сьвеце на кожным узроўні. Якраз дзеля гэтага раман стаўся бібліяй збунтаванае моладзі, а Кізі — адною з галоўных постацяў контаркультуры. Легендаю. Прарокам. Богам.

Пачатак шасьцідзясятых гадоў — пераломны пэрыяд у гісторыі Амэрыкі. На сцэну пачало выходзіць новае пакаленьне, якое ўжо ня памятала вялікага крызысу, не брало ўдзелу ў другой сусьветнай вайне, не хацела згадзіцца з спажывецкім ладам жыцьця бацькоў. Выхаванае ў дабрабыце, яно прагнула чагосьці большага, чым памнажэньня матэрыяльных дабротаў, не хацела паміраць у Віетнаме, калі пасьля сьмерці Кэнэдзі вайна выбухнула з новай сілаю. Першыя студэнцкія страйкі й сутычкі з паліцыяй адбыліся ў Бэрклі ў 1964 годзе. Зь цягам часу яны пашырыліся на ўсю краіну, агарнуўшы ўвесну 1970 году чатырыста сорак восем унівэрсытэтаў, шмат зь якіх проста зачынілі, калі інакш не было як даць рады з дэманстрантамі. Умяшаньні паліцыі й аддзелаў Нацыянальнае Гвардыі рабіліся штораз больш жорсткія; 4 траўня ў Кэнцкім Штатным Унівэрсытэце чацьвёра студэнтаў загінулі ад куляў, дзевяцёра атрымалі стрэльныя раны.

На працягу ўсяго гэтага часу дзеці-кветкі, хіпі, напльвалі з розных куткоў краіны ў Хайт-Эшбэры ў Сан-Францыска, некалі ўлюбёны квартал бітнікаў. Ён стаўся іхнаю Мэккай, таму што якраз там усё пачыналася. А пачалося ўсё ад Кэна Кізі.

Кізі вывучаў тэатразнаўства й займаўся барацьбою ў Орэганскім Унівэрсытэце, выступаў у студэнцкіх спэктаклях, марыў стаць акторам. Але напісаў некалькі апавяданьняў і атрымаў стыпэндыю ў Стэнфардзе, дзе ў 1958 годзе пачаў вывучаць пісьменьніцтва пад кіраўніцтвам Ўолэса Стэгнэра, Мэлкама Коўлі й Фрэнка О'Конара. У адной групе з Кізі апынуліся між іншым два пазьнейшыя ляўрэаты Пуліцэраўскай прэміі — Лэры МакМэртры і Робэрт Стоўн, а таксама Пітэр Бігл, Эрнст Гэйнс, Тылі Олсэн, Ўэндэл Бэры, Гэрні Норман, Эд МакКлэнэхан, Кэн Бэбз, а таксама аўстралійскі пісьменьнік К.Дж.Кох. Кізі пасяліўся на Пэры Лэйн. Гэта быў аазіс багемы, тыповай для 50-х гадоў: чырвонае віно, чорныя швэдры, сандалі, джаз. Перад Кізі, які выхоўваўся на фарме, адчыніўся новы сьвет. Аднак найбольш ён пасябраваў зь Вікам Ловэлам, дактарантам аддзелу псыхалёгіі, які адкрыў яму таямніцы псыхааналізу, а пазьней намовіў да ўдзелу — у ролі «досьледнага труса» — у праграме досьледаў над псыхамімэтычнымі сродкамі, якія праводзіў шпіталь Вэтэранаў у Мэмла Парку. Шпіталь плаціў семдзесят пяць даляраў штодня, і за гэта трэба было толькі ляжаць у ложку й глытаць розныя парашкі. Пасьля аднаго зь іх Кізі пачуў, як вавёрка за акном кідае арэх; гук літаральна запоўніў увесь пакой. Пісьменьнік бачыў неверагодныя колеры, пульсаваньне сьвятла, бачыў і чуў адначасова... За два гады да экспэрымэнтаў Тыматы Ліры ў Харвардзе Кізі адкрыў для сябе ЛСД.

«ПЕРШЫ ЧАЛАВЕК»

Апошні раман Альбэра Камю ўпершыню апублікаваны ў Парыжы

Albert Camus. Le premier homme. Editions Gallimard, Paris, 1994.

Ён нарадзіўся ў Альжыры ў 1913 годзе, загінуў у 1960, у аўтамабільнай катастрофе ў Францыі. Літаратурную Нобэлеўскую Прэмію яму прысудзілі ў 1957 годзе за *сукуп творчасьці, што асьвятляе праблемы, якія наш дзень ставіць перад чалавечай сьвядомасьцю.* Альбэр Камю меў тады 44 гады — толькі адзіны Кіплінг быў маладзейшы, калі атрымаў гэтыя ляўры. Сярод ляўрэатаў Нобэлеўскае Прэміі далёка ня ўсе засталіся ў штодзённым ужытку, шмат хто стаўся клясыкам, іншыя зьніклі ў змроку гісторыі літаратуры. А які лёс напаткаў творчасьць Камю?

Сёлета быў выдадзены апошні, няскончаны раман Камю «Le premier homme» («Першы чалавек»), падрыхтаваны да друку з рукапісу дачкою пісьменьніка, Катрын. Гэта добрая нагода паразважаць над тым, наколькі спадчына Камю жыве й натхняе да мысьленьня пра сёньняшні сьвет; што важнае зь ягоных думак засталося, а што не перажыло свайго часу.

На пачатку пяцідзясятых гадоў палітычную пазыцыю Камю ў «Збунтаваным чалавеку», дзе мэтафізычны бунт супрацьстаўляецца рэвалюцыі, асудзілі камуністычныя вяршкі Парыжу. У Сартра Камю нават зарабіў эпітэт «буржуй», бо ў сваім часе быў адным зь нешматлікіх інтэлектуалаў, якіх ня звабіў абяцаны рай, кіраваны тэрорам. Пазьней ён выступаў у абарону перасьледаваных грэцкіх камуністаў і бэрлінскіх рабочых, што бунтавалі супраць камуністаў. У справе вызвольнай вайны ў Альжыры ён пастуляваў кампраміс, што не падабалася ні арабам, ні прагрэсыўным французам.

Калі сёньня вярнуцца да эсэ «Міт Сызыфа» й «Збунтаваны чалавек», да раманаў «Чума» й «Падзеньне», ясна відаць, што Камю быў маралістам і гуманістам, для якога чалавек — мера рэчаў. Ён абвяшчаў, што гісторыя ня мае сэнсу, што Бог не йснуе і што сам чалавек, змагаючыся з скандалам, якім ёсьць ягоныя прыродныя ўмовы йснаваньня, надае сэнс свайму жыцьцю й сьвету. Пры гэтым найперш меўся на ўвазе сэнс ня зборны, а індывідуальны, і толькі потым салідарны.

На сытым і лібэральным Захадзе, даўно сэкулярызаваным, сьмерць Бога ўжо здавён перастала быць праблемай. Разам з упадкам камунізму скампраметаваў сябе марксызм. Такім чынам Камю страціў сваіх ідэйных супраціўнікаў. З другога боку, усьведамленьне таго, што чалавек пакінуты сам сабе, безь ніякіх падпораў, сталася амаль усеагульным і само сабой зразумелым. Можа, толькі герой «Чужаніцы», ізаляваная й непранікальная асоба, мае сёньня шанцы знайсьці жывейшы водгук у самотным натоўпе.

Таму асабліва й ня дзівіць ні прывезенае з Парыжу меркаваньне, што шум вакол выданьня «Першага чалавека» — гэта толькі рабленьне бізнэсу, што папраўдзе Камю з сваім маралізмам мала каго сёньня кранае, ні вестка, што рэцэнзіі на кнігу спрэс нэгатыўныя. Пытаньне толькі ў тым, ці яе ўвогуле належала ацэньваць як літаратурны твор?

Амаль трыццаць гадоў сям'я не згаджалася на публікацыю з увагі на тое, што гэта быў першы накід, сыравіна, кніга не дапрацаваная аўтарам. Аднак добра, што яна выйшла. Бо яна ня гэтулькі літаратурны дакумэнт, колькі дакумэнт жыцьця пісьменьніка, які дазваляе лепей спазнаць жывыя крыніцы яго пазыцыі й творчасьці.

Матэрыял для рамана склала біяграфія Камю, а твор быў задуманы як сага францускіх альжырцаў. Назоў «Першы чалавек» Камю тлумачыў у інтэрвію ў 1954 годзе: «Той, які пачынае з нуля, які ня ўмее ні чытаць, ні пісаць, ня мае ні маралі, ні рэлігіі». Паводле сьведчаньня жонкі пісьменьніка, першы чалавек — гэта кожны. А ў гэтым выпадку гэта першае пакаленьне францускіх альжырцаў, якое асела там у сярэдзіне XIX стагодзьдзя. Гэта бацька Камю, народжаны ў Альжыры й забіты ў Францыі ў бітве пад Марнай на I сусьветнай вайне. Гэта нарэшце сам Камю, які гадаваўся ў

Кізі й Ловэл пачалі самастойна ўжываць мэскалін, пэётль, IT-290, знаёміць зь імі іншых жыхароў Пэры Лэйн. У тым самым часе пісьменьнік пачаў працаваць у псыхіятрычным аддзеле шпіталю ў Мэнла Парку — саніратам начной зьмены. Ён перапыніў пісаньне «Заапарку» — пачатага раней рамана пра спартоўцаў, і пачаў пісаць «Палёт над зязюліным гняздом». Шмат якія сытуацыі заснаваныя на сапраўдных здарэньнях, прататыпамі шмат якіх пэрсанажаў другога пляну сталіся хворыя, зь якімі ён сутыкаўся. Некаторыя часткі кнігі ён пісаў пад уплывам пэётлю, якраз тады яму прымроіўся індзеец; так да яго прыйшла думка зрабіць Вялікага Правадыра апавядальнікам у творы.

Скончыўшы кнігу, ён пераехаў на некалькі месяцаў з жонкай Фэй у Флорэнс, штат Орэган, у паселішча лесарубаў, дзе зьбіраў матэрыялы для свайго другога рамана. У лютым 1962 выйшаў друкам «Палёт над зязюліным гняздом». Дэбют дваццацішасьцігадовага пісьменьніка стаўся неверагодным посьпехам. Калі Кізі вярнуўся на Пэры Лэйн, ён быў ужо некім. Ад таго часу ўсё пачало круціцца вакол яго, прыяжджалі ўсё новыя людзі, якія хацелі зь ім пазнаёміцца й пакаштаваць яго славуты гуляш, прыпраўлены ЛСД. Прыехаў таксама Ніл Кэсыды, сябра Джэка Кэруака, якога апошні ўвекавечыў як «Дына Морыарты» ў найважнейшым рамане бітнікаў «У дарозе» (1957). Якраз ЛСД і пашырэньне ўласнай сьведамасьці было тым, што найбольш адрозьнівала невялікую супольнасьць, якая зараджалася вакол Кізі, ад бітнікаў. З ЛСД узяліся псыхадэлічныя фарбы. Новая музыка. Пазьней зьявіліся даўгія валасы й поўная свабода нораваў.

У 1963 годзе, калі будаўнічая фірма пачала разбураць Пэры Лэйн, Кізі купіў маёмасьць у Ла Хонда, Каліфорнія, і заснаваў там камуну. З даўнейшых сяброў пісьменьніка частымі гасьцямі там былі Лэры МакМэртры й Робэрт Стоўн, а стала там пасяліўся Кэн Бэбс, які якраз вярнуўся зь Віетнаму, дзе служыў у рангу капітана морскай пяхоты. Ён прывёз першыя весткі пра вайну ў выглядзе сатырычнага раману; аднак было яшчэ занадта рана як на такую кнігу. Яна не знайшла выдаўца.

Неўзабаве пасьля таго Кізі скончыў «Некалі вялікае паняцьце», свой другі раман, значна больш амбітны й напісаны з большым размахам за «Палёт». Насычаная фрэйдызмам, гэтая больш як на шэсьцьсот старонак кніга апавядае ня столькі пра людзей, колькі пра мясьціны — пра Орэган, родны штат пісьменьніка, які займае плошчу крыху большую за Беларусь, налічваючы пры гэтым няпоўныя два з паловай мільёны жыхароў. Гэта апошні штат, да якога дабраліся асаднікі, што імкнуліся на захад, дажджлівы, дзікі, зарослы спрадвечнымі лясамі, дзе й сёньня поўна аленяў, кугуараў, лісаў і мядзьведзяў. Яго краявіды й прырода ў аднолькавай ступені выступаюць героямі рамана, што й лесарубы. Гэтая заглыбленасьць у геаграфію, рэгіянальнасьць месьціць раман у адной традыцыі з творамі Купэра, Твэна й Фолкнэра, адтуль ён чэрпае сваю сілу й надчасовасьць, але разам з тым гэта й твор пра чалавечую годнасьць як найвышэйшую вартасьць, дзеля якой варта рызыкаваць і ахвяраваць усім.

Кізі зноў пісаў некаторыя кавалкі пад уплывам наркотыкаў, каб ужыцца ў прыроду, якую ён апісвае, а таксама ў шматлікіх пэрсанажаў, бо для большага эмацыйнага зараду апавяданьне вядзецца з гледзішча розных герояў. Раман напачатку не здабыў столькі авацыяў, як «Палёт», але з часам ягоная пазыцыя пачала ўмацоўвацца; у гэтую хвіліну ён лічыцца адным з найважнейшых амэрыканскіх раманаў. На яго падставе быў зьняты й фільм з Полам Ньюманам у галоўнай ролі.

З нагоды выданьня рамана Кізі пастанавіў вырушыць разам з кампаніяй сяброў з Каліфорніі ў Нью-Ёрк. Яны зрабілі падарожжа праз усю Амэрыку на школьным аўтобусе, размаляваным у псыхадэлічныя колеры, якім кіраваў Ніл Кэсыды. Яны назвалі сябе Merry Pranksters (Вясёлыя гарэзьнікі), каб падкрэсьліць элемэнт забавы й блазенства, так істотны для спантанных хэпэнінгаў, якія яны ладзілі й здымалі на стужку ў дарозе. Зрэшты, зьяўленьне размаляванага аўтобуса з грымлівымі дынамікамі на даху ўжо само па сабе было хэпэнінгам — і на сэгрэгаваных пляжах Алабамы, і на вуліцах Нью-Ёрку. І падарожжа, і аўтобус, які цяпер іржавее на фарме ў Кізі, сталіся сымбалямі рэвалюцыі шасьцідзясятых гадоў; вашынгтонскі Смітсанаўскі музэй зноў і зноў спрабуе выкупіць гэты транспартны сродак, але пісьменьнік не згаджаецца.

Вярнуўшыся ў Каліфорнію, пісьменьнік улучыўся ў пратэстацыйны рух, выступаў на мітынгах, удзельнічаў у дэманстрацыях супраць вайны ў Віетнаме. Ён ладзіў грандыёзныя прыёмы, на якіх усе мелі магчымасьць пакаштаваць ЛСД. Ён верыў, што ягонае пакліканьне — у пашырэньні сьведамасьці, адчыненьні перад людзьмі новых дзьвярэй. Ён зьбіраўся змантаваць фільм пра сваё падарожжа праз Амэрыку й аддаць яго для пашырэньня ў кінатэатрах, але пачаліся праблемы з паліцыяй. ЛСД тады яшчэ не было забароненае, але пісьменьніка двойчы арыштоўвалі за хаваньне марыхуаны. У студзені 1966 году Кізі пакінуў на пляжы адзежу, каб сымуляваць патапленьне, і ўцёк у Мэксыку. Вярнуўшыся ў Штаты, ён некалькі месяцаў хаваўся, але нарэшце трапіў у рукі FBI. У 1967 годзе ён правёў поўгода ў турме. Выйшаўшы на волю, ён вярнуўся ў родны Орэган, дзе жыве й да сёньня.

Падчас ягонага побыту ў турме, да яго прыйшоў Том Вулф, журналіст, які — разам з Хантэрам Томпсанам — лічыцца творцам «новага журналізму», аўтар славутай «С-Кадры», а таксама аднаго з найшумнейшых раманаў васьмідзясятых гадоў «Вогнішча пыхлівасьці» (1987), экранізаванага Бэрталючы. З размоваў зь пісьменьнікам і ягонымі сябрамі ўзьнікла кніга «The Electric Kool-Aid Acid Test» (1968), якая апісвае кар'еру Кізі, узьніклы вакол яго культ і аўтобуснае падарожжа. Пасьля зьяўленьня кнігі Вулфа, якая разыйшлася велізарным накладам, пісьменьнік стаўся проста мітычнай фігурай.

У 1973 годзе Кізі апублікаваў «Garage Sale», кнігу, ілюстраваную здымкамі й ягонымі ўласнымі малюнкамі. У яе ўвайшлі доўгі аўтабіяграфічны сцэнар фільму, лісты, нататкі з часу працы над «Палётам», энцыкляпэдычныя камэнтары на розныя тэмы, два інтэрвію, а таксама заўвагі сяброў-пісьменьнікаў. Яе мэтай было ачышчэньне перад сабою поля для пачатку працы над наступным раманам. Гэта найперш мусіла быць кніга, заснаваная на турэмным досьведзе аўтара, а пасьля — другі раман пра Орэган, некалькі ўрыўкаў зь якога зьявілася ў часапісе *Spit in the Ocean*, выдаваным самім пісьменьнікам. Пасьля гэтага настала доўгае маўчаньне Кізі.

Некаторыя пачалі баяцца, што ён больш нічога не надрукуе, што ён далучыцца да такіх пісьменьнікаў, як Ралф Элісан, аўтар найвыдатнейшага чорнаамэрыканскага рамана «Нябачны Чалавек» (1952), які маўчыць ужо сорак гадоў, або ня менш славуты Дж.Сэлінджэр, які ня выдаў нічога пасьля 1963 году. Доўгія перапынкі — ня дзіва для вядучых амэрыканскіх пісьменьнікаў. Джозэф Хэлер не друкаваў нічога на працягу дванаццаці гадоў пасьля «Параграфу 22» (1961), а Ўільям Стайран гэтулькі ж пасьля «Прызнаньня Нэт Тэрнэра» (1967); Томас Пінчан, аўтар «Вясёлкі гравітацыі» (1973), выдаў чародны раман «Vineland» празь сямнаццаць гадоў, а Ўільям Гэдыс, які дэбютаваў у 1955 годзе вялізным раманам «Прызнаньні», выдаў наступную, ня менш цудоўную кнігу «JR» — толькі праз дваццаць гадоў.

У 1984 годзе мінула якраз дваццаць гадоў пасьля публікацыі раману «Некалі вялікае паняцьце». У часапісе *Esquire* зьявіўся цудоўны фрагмэнт новага раману Кізі, прысьвечанага Алясцы. Аднак працу над кнігай спыніла сьмерць Джэда, малодшага сына пісьменьніка. Мікробус, якім барцоўская каманда Орэганскага Ўнівэрсытэту вярталася з спаборніцтваў, падчас сьнежнай завеі ўпаў з скалы. Джэд памёр праз колькі дзён пасьля выпадку, так і не апрытомнеўшы. Кізі апавядае, што шмат гадоў перад тым ён пад уплывам ЛСД пабачыў усё сваё жыцьцё ў калодзе картаў. Адна з картаў прадказвала сьмерць сына. Ён спадзяваўся, што падмануў лёс, калі Джэд быў яшчэ маленькі; тады ён выцягнуў яго непрытомнага з абломкаў разьбітае машыны й вярнуў да жыцьця штучным дыханьнем. Але не ўдалося. «Можна падмануць лёс, але нельга падмануць наканаваньне», — кажа ён.

У 1986 годзе я наведаў Кізі на фарме. Ён жыве ў вялізным гумне, перарobленым на дом; здалёк відаць намаляваную на франтоне белую зорку на блакітным тле. Гадуе скот, а таксама паваў, лямаў. Калі адзін рыбалоў злавіў непадалёк двухмэтровага ласося, пісьменьнік адразу захацеў яго купіць і пусьціць у сваё возера. Кэн Бэбс і іншыя сябры Кізі з часоў падарожжа на аўтобусе жывуць недалёка. Орэган — апошні аазіс хіпі; яны пераехалі сюды з Каліфорніі пасьля правалу руху. Ня так, як у Нью-Ёрку — да любога можна зайсьці без папярэджаньня, у любы час. Ідзе барацьба за легалізацыю марыхуаны. На полі перад домам Кізі рэгулярна адбываюцца фэстывалі паэзіі й канцэрты «Grateful Dead» ды іншых гуртоў.

Якраз мелася выйсьці новая кніга пісьменьніка — «Скрынка дэмана». Для прыхільнікаў Кізі ў Штатах, зачараваных ім і ягонай легендай, гэта была не абы якая неспадзяванка, але тых, хто чакаў новага раману, яна мусіла расчараваць. Як і «Garage Sale», гэта чародны «склад»: збор раней друкаваных рэпартажаў, фрагмэнтаў нясконченых раманаў і аўтабіяграфічных тэкстаў. Падбор, пра што гаворыць Кізі ў інтэрвію, не зусім выпадковы, яго лучыць у цэласьць постаць Дэўліна Дэбары, пісьменьнікавага другога «я».

Праз чатыры гады, у 1990 годзе, нечакана зьявіўся раман «Пячоры», выдадзены пад дзіўным, хоць і лёгка зразумелым псэўданімам: O.U.Levon — гэта запісаны наадварот назоў курсу пісьменьніцтва, які Кізі вёў у сваёй колішняй альма матэр («Novel, U[niversity of] O[regon]»). Гэта гісторыя аўтобуснага падарожжа кампаніі незвычайна маляўнічых постацяў у пячоры, дзе былі аднойдзеныя дагістарычныя насьценныя карціны. Калі іх даўнасьць пацьвердзіцца, гэта будзе значыць, што нейкія прымітыўныя плямёны засялялі Амэрыку задоўга да зьяўленьня там індзейцаў. Дасьледнікам аднак пагражаюць розныя небясьпекі, хтосьці ня хоча дапусьціць, каб яны адкрылі праўду.

Кізі напісаў раман разам з трынаццацьма слухачамі курсу. Ва ўступе ён тлумачыць, як узьнікла ідэя гэтага незвычайнага экспэрымэнту і якія былі прынятыя прынцыпы. Напрыклад, было вырашана, што кожны ўводзіць у раман адзін пэрсанаж, што дзея мусіць адбывацца ў часе, калі нікога з суаўтараў не было на сьвеце, а таксама што Кізі мае права вэта й сам напіша палову. У выніку выйшла цалкам забаўная й арыгінальная рэч.

У тым самым годзе Кізі выдаў таксама «Будучае расьсьледаваньне», багата ілюстраваны здымкамі сцэнар фільма пра Ніла Кэсыды й аўтобуснае падарожжа. Хадзілі чуткі, што ён зноў працуе над раманам пра Аляску.

Нарэшце летась ён зьявіўся, і ў форме кнігі, а не відэакасэты. «Марацкая песьня» («Sailor Song») налічвае больш за пяцьсот старонак; сама таўшчыня кнігі сьведчыць, што гэта ня жарты, што гэтым разам Кізі падыйшоў да справы паважна. Дзея адбываецца на Алясцы, у апошнім штаце, яшчэ да канца не запалоненым цывілізацыяй, на пачатку наступнага стагодзьдзя. У прыгожае рыбацкае паселішча, дзе жывуць недабіткі хіпі з усіх Штатаў і жменька эскімосаў, прыплывае карабель з акторамі й здымачнай групай, якая зьбіраецца экранізаваць старую эскімоскую легенду. Рэжысэр хоча, каб ягоны твор быў як мага вярнейшы легендзе, таму дзеля аўтэнтычнасьці рэаліяў ён прывозіць у паселішча племя, якое дагэтуль ня мела амаль ніякіх кантактаў зь белымі. Праблемы пачынаюцца, калі выяўляецца, што легенду прыдумалі зусім не эскімосы; у сапраўднасьці яе напісала настаўніца-пэнсіянэрка з Усходняга Ўзьбярэжжа. Паступова выяўляецца, што й іншыя рэчы выглядаюць ня так, як можна было б меркаваць. Усё толькі гульня ў праўдападабенства. У адрозьненьне ад двух ранейшых раманаў Кізі, гэты напісаны зь вялікай дозай гумару, а героі на яго старонках нагадваюць нечым пэрсанажаў танных камэдыяў; гэта аднак сьвядомыя захады, якія маюць падкрэсьліць галоўную ідэю кнігі — што чалавецтва зайшло занадта далёка ў зьнішчэньні асяродзьдзя, што настала пара адумацца пакуль ня позна, пакуль не настаў канец сьвету.

Пасьля доўгіх гадоў чаканьня прыемна чытаць новую кнігу Кізі, бачыць, як упэўнена ён вядзе аповед, зь якім майстэрствам ён снуе чарадзейства. Можна толькі спадзявацца, што нам не давядзецца трыццаць гадоў чакаць ягонага наступнага твору.

Працяг на старонцы 14


культурнай і гістарычнай пустцы, падкрэсьленай яшчэ й непісьменнасьцю ягонай сям'і.

Раман — дзёньнік высьпяваньня. Камю падрабязна апавядае пра сваё нараджэньне ў дарозе, у арабскай хаце, пра сваё дзяцінства. Пра невядомага, страчанага ў маленстве мітычнага бацьку, сьляды якога ён шукае. Пра маці, убогую ўдаву, запалоханую бабкай-тыранам, асобу ціхую й невучоную, лагодную й прыглухлую, якая слаба кантактуе з сынам, а той з гадамі ўсё больш яе любіць і захапляецца ёю. Пра навуку ў сярэдняй школе й пра настаўніка, які пераканаў сям'ю Камю, што хлопец мусіць вучыцца далей. Пра пачаткі ліцэю, які быў іншым сьветам, невыказна далёкім ад пралетарскага кварталу, дзе гадаваўся Камю. Усё гэта ахутана цяплом міжземнаморскай краіны, зь яго сьляпучым сонцам і морам, дзякуючы якім, як піша Камю, бядацтва не зрабіла яго нешчасьлівым, а нізкае становішча маці — яны выконвала паслугі ў чужых дамох — зайздросным. Галоўнай мэтай рамана меўся быць паказ любімай альжырскай бацькаўшчыны — мэтраполіі, выдатным грамадзянінам якое стаўся Камю.

Скачок, які выканаў бедны паўсірата да парыскага культурнага цэнтру і далей да Нобэлеўскай Прэміі, быў велізарны. Для глыбакадумнага чалавека нялёгка зжыцца з такой пераменай. «Першы чалавек» паказвае, што Камю стараўся трымацца сваёй першаснай тоеснасьці й не зракацца свайго паходжаньня, каб ня стаціа чалавекам зь ніадкуль.

Ён заплаціў за гэта, узносячы цяжар пачуцьця віны за стан бядоты й невуцтва, зь якога ён паходзіў і якому ў пэўнай меры здрадзіў. Адгэтуль у «Першым чалавеку» ідэалізацыя гэтага стану й ідэалізацыя постаці маці. Падвойнасьць сытуацыі Камю — сын непісьменнай жанчыны й славуты пісьменьнік — спараджае ў ім асаблівую адчувальнасьць у справах, якія іншыя вырашаюць, кіруючыся, як аўтаматам, пэўнай дактрынай, напрыклад антыкаляніяльнай. У сьвятле асабістых адчуваньняў пісьменьніка зразумелаю робіцца ягоная заява ў справе альжырскай вайны: *найперш я буду бараніць маці, а пасьля справядлівасьць.* Менавіта маці ён прысьвяціў сваю кнігу пра Альжыр, «Першага чалавека», кранальнымі словамі: *Табе, якая ніколі ня здолее прачытаць гэтае кнігі.* У гэтым прысьвячэньні закладзеная думка — наўрад ці модная сёньня — што маці й бацькаўшчына не мяняюцца.

Анна Шылер, *Ex libris*
Пераклад SS



АПТЫМІЗМ ПАВОДЛЕ КЭНА КІЗІ

Працяг са старонкі 13

Т.М. Шмат хто бачыць цябе крыху нібы Моцарта, як яго падае Форман у фільме «Амадэо»; яны ня могуць сабе ўявіць, як тып з амэрыканскай глухамані, ведамы з ужываньня наркотыкаў і схільнасьці да блазенства, можа быць адначасова надзелены такім неверагодным, дзівосным талентам, які дазволіў яму надрукаваць два вялікія раманы, «Палёт над зязюліным гняздом» і «Некалі вялікае паняцьце», яшчэ да спаўненьня трыццатага году жыцьця.

К.К. Можа. Але я хацеў бы цешыць сябе думкай, што я лепшы за таго асобніка зь фільму; гледзячы «Амадэо», я меў уражаньне, што ў любую хвіліну на экране зьявяцца ў поўным складзе ўдзельнікі перадачы «Saturday Night Live» — нагэтулькі там усё было на мяжы кічу. Я ведаю, які я добры й якім добрым я павінен быць; я ведаю, як я растраціў свой талент, і, праўду кажучы, мала аб гэтым шкадую. Былі хвіліны, калі, ведама ж, я б мог лепей яго выкарыстаць, але за доўгі час, што я не пісаў, я таксама быў увесь час заняты, проста я скіроўваў энэргію ў іншыя каналы. Я ладзіў зь сябрамі паэтычныя фэстывалі, удзельнічаў у палітычных кампаніях на ўзроўні штату, аднак найважнейшым лічу будаваньне сям'і. Гэты занятак вельмі падобны да стварэньня рамана, а я ня ведаю шмат пісьменьнікаў, чые сем'і здолелі б вытрымаць сапраўды інтэнсыўнае пісаньне. Звычайна пісьменьнікі мяняюць жонак з кожным раманам. Для мяне сям'я й сябры сто разоў важнейшыя за кнігі.

Т.М. Ці не таму ты перастаў пісаць пасьля выданьня двух цудоўных раманаў? Ці, можа, улучыўшыся ў рух пратэсту пасьля славутага падарожжа на аўтобусе, апісанага Томам Вулфам, ты адчуў, што раман памёр, вычарпаў свае магчымасьці, а тое, што адбываецца ў Амэрыцы, важнейшае за пісаньне прозы?

К.К. Відавочна, што падобна як і шмат людзей у тым часе, я адчуваў, што мы мінулі пэўны паварот, што традыцыйныя апавядальныя прыёмы патрабуюць зьменаў. Дылан, Ленан, Бэроўз, Роб-Грые, я й іншыя — мы хацелі сьведама пакончыць з тыраніяй сынтаксысу, пераніцаваць мову. Па-новаму, ня так, як Джэймс Джойс. Я надалей лічу, што вобразы, якія выклікаюць ва ўяўленьні песьні Дылана, былі абсалютна новыя, яны паклікаліся на нешта першабытнае, напрыклад: «Я распаліў агонь на Мэйн стрыт і прасыпаваў у ім сотні дзірак». Я ня ведаю, што гэта значыць. Ведаю аднак, што ў кожнага, хто чуе гэтыя словы, узьнікаюць у галаве нейкія вобразы.

Джозэф Кэмпбэл піша пра штосьці такое, што я й сам заўважыў падчас побыту ў Кітаі. Калі тамтэйшая курыца бачыць у паветры ястраба, яна крычыць дакладна тое самае, што й нашы куры. Яна крычыць: «Ястраб!» І ўсе кідаюцца хавацца. Нават малыя куранята ўцякаюць, калі бачаць ястраба; яго выгляд, калі ён пралятае над імі, выклікае ў іх нешта такое, што загадвае ім хавацца. Але калі мы зробім мадэль ястраба й пусьцім яго так, каб ён ляцеў задам наперад, тады яны не ўцякаюць. Калі пусьцім мадэль чайкі, таксама не ўцякаюць. Кэмпбэл высунуў гіпотэзу, што калі ў жывёлаў закадаваныя такія моцныя рэакцыі на пэўныя першабытныя вобразы, дык у людзей мусяць быць яшчэ мацнейшыя. Разам з Уільямам Бэроўзам і іншымі пісьменьнікамі мы прыйшлі да высновы, то наша сувязь з комплексам першабытных вобразаў парушылася; каб яе аднавіць, трэба зьнішчыць мову, якая дасталася нам у спадчыну ад віктарыянскай эпохі. Калі я чытаю лекцыі, я прашу студэнтаў, каб яны далі мне тры любыя кнігі... Ну, вось так.

Ён бярэ з паліцы тры кнігі, разгортвае іх наўгад і пачынае чытаць:

«Калі Ейтс напісаў, што надыходзіць дзень падобны да гаўна, гэта было чыстае дзікунства. Кран зваліўся на караля з каралевай; прадпрымальны, змагарны, а разам з тым занадта разумны, каб спрабаваць высьмяяць старую фірму. Урад падае разам з будынкам; яны бязладныя й засланяюць усё твае над. Трактар грэзьне ў балоце, а прадмесьці цывілізацыі стаюцца сапраўднай камэрай катаваньняў».

Мы пераканаліся, што фантазія можа дзеяць непадуладна розуму; мы пачалі экспэрымэнтаваць з аўтаматычным пісаньнем, ужываць наркотыкі. І ня толькі пісаць пад іх узьдзеяньнем, але й маляваць, выступаць у тэатры, сьпяваць, граць на інструмэнтах, жыць; мы ня толькі ўжывалі наркотыкі, але й мэдытавалі, праводзілі галадоўкі, абуджалі пачуцьці дзясяткамі спосабаў, каб зьнішчыць саліцёра, які завёўся ў нашай сьвядомасьці, хвост якога дасягаў амэрыканскіх банкаў. З нас высмокталі энэргію й скіроўвалі яе на камэрцыйныя рэйкі. Вось мы й змагаліся з гэтым, а пры нагодзе абаравалі лучнасьць зь мінуўшчынай, якая аднак надзвычай істотная, проста неабходная. Бах цудоўны і заўсёды будзе мець што запрапанаваць слухачу, незалежна ад таго, колькі людзей слухае ягоную музыку й колькі прадаецца кружэлак. Меркаваньне большасьці ня мае тут ніякага значэньня, як і ў выпадку з Шэкспірам або Пітагорам. Існуе штосьці такое, як аб'ектыўная ісьціна; тэарэма Пітагора была б аднолькава слушная, калі б яе сфармуляваў і Гітлер. Мы адыйшлі ад традыцый й мовы, а цяпер паволі да яе вяртаемся, узбагачаныя ўласным досьведам. Мы вяртаемся, бо зразумелі, што калі нашыя куры й куры ў Кітаі крычаць «ястраб», яны крычаць аднолькава, бо маюць тую самую мову. Тое самае датычыць і людзей; ёсьць толькі адна мова, але мы папераначвалі яе на сотні ладоў. Тыя нешматлікія словы, якія — як «агонь» або «кветка» — падобныя ў розных мовах, маюць значна большую моц за іншыя; гэта мае нешта агульнае з гукам, вобразам, пачуцьцём, зь нечым, чаго мы ня ўмеем назваць.

У шасьцідзясятыя гады мы ўсе спрабавалі скочыць у будучыню, а пасьля мы падзяліліся на дзьве групы. Адзін з маіх сяброў сфармуляваў гэта так: Мы нібыта сядзім у цягніку, які ляціць з гары, і бачым, што ўнізе паварот, занадта круты, каб удалося яго праехаць. Таму мы дзелімся на дзьве групы: адна ляціць наперад, каб разваліць стралку, і хай цягнік едзе невядома куды, да мэты, якой мы сабе нават уявіць ня можам, а другая група застаецца ў цягніку й стараецца пераканаць пасажыраў, што трэба запаволіць ход, каб усё ж праехаць паварот. Намі кіруе супольная думка, але мы выбралі розныя дарогі; я вырашыў застацца ў цягніку, супрацоўнічаць з адукацыйнай радай, удзельнічаць у палітыцы на штатным узроўні. Але ўсё гэта дзеля таго, што мы набліжаемся да такога моманту ў гісторыі, калі рэчы мусяць зьмяніцца або — цягнік сыйдзе з рэек.

Т.М. Неўзабаве мае выйсьці твая новая кніга, «Скрынка дэмана», а летась у часапісе «Эскўайр» зьявіўся фрагмэнт наступнага раману, дзея якога адбываецца ў Алясцы. Як даўно ты пастанавіў вярнуцца да пісаньня?

К.К. У мяне шмат шуфлядаў напханых рукапісамі. Трэба ўвесь час пісаць, гэтаксама як трэба ўвесь час даглядаць агарод, бо інакш усё зарасьце пустазельлем.

Т.М. Тады што цябе стрымвала ад выдаваньня? Ці час быў неадпаведны?

К.К. Галоўная прычына ў тым, што выданьне кніг адбываецца ў Нью-Ёрку. А завезьці туды сваю кнігу — гэта трошкі нібы прынесьці немаўля ў «маліну» Анёлаў Пекла. Выданьне чаго б там ні было складае для мяне рызыку. Калі б я да канца жыцьця нічога болей не надрукаваў, майму становішчу нічога б не пагражала. А калі я зноў нешта публікую, дык падстаўляю сябе пад удары.

Т.М. Мяне дзівіць, што пісьменьнік твайго ўзроўню можа баяцца крытыкі, бо я разумею, што ты якраз гэта маеш на ўвазе.

К.К. Калі хтосьці пора табе пальцам у вока, боль такі самы, ці твой рост мэтар шэсьцьдзесят або два мэтры. Крытыка робіць балюча, без увагі на тое, які ты славуты. Няма такіх вяршыняў, дзе б цябе не дастаў боль. Калі нешта публікуеш, ты выстаўляеш напаказ сваё найбольш безабароннае «я». А калі людзі затоптваюць цябе ў гразь, дык табе баліць, нават калі яны ня маюць рацыі. Баліць заўсёды. Калі я праводжу заняткі з навукі пісаньня, адна зь першых рэчаў, якую я раю запомніць студэнтам — тое, што напісаць кепскі раман гэтаксама цяжка, як і добры, аўтар укладае ў яго гэтулькі ж працы. І што крыўджаньне людзей не прыносіць ніякае карысьці, асабліва калі яны стараюцца рабіць добрую працу, але ў гэтай краіне ёсьць тэндэнцыя крыўдзіць, калечыць, паралізаваць. Было зьнішчана шмат амэрыканскіх пісьменьнікаў. Стэйнбэк. Хэмінгўэй. Фолкнэр увесь час хадзіў п'яны, дык яго й не ўдалося прыкончыць. Але Джон О'Хара звар'яцеў, чакаючы прызнаньня. Кожны раз, як я сядаю за машынку, я чую, як крытыкі адцягваюць куркі на стрэльбах. Толькі хлус сьцьвярджаў бы, што ўсё ня так. Уражлівасьць для пісьменьніка — рэч істотная, таму ён не павінен намагацца быць абыякавым. Трэба мець поўнае ўсьведамленьне. І трэба рызыкаваць.

Новая кніга — рызыка для мяне. Я лічу, што тое, чаго я ў ёй дасягнуў, датычыць ня столькі характару апавяданьня, колькі формы; я стварыў форму, да якой мог дапасаваць тэксты, створаныя з пэўнага гледзішча. Хантэр Томпсан дазволіў свайму Гонзу загнаць сябе ў рог. Калі ён піша, яму цяжка забыцца, што ён Хантэр Томпсан. Мэйлеру цяжка забыцца, што ён Мэйлер. А вось калі мы чытаем Шэкспіра, мы не адчуваем яго прысутнасьці. Перад намі толькі яго пэрсанажы, жывыя, шматвымерныя, з сваім голасам. У «Скрынцы дэмана» я — аўтар — выступаю ў ролі аднаго з герояў. Мае думкі й мая асабістасьць вельмі выразныя. А калі нехта як пісьменьнік хоча застацца вальнадумцам, дык так быць не павінна.

Т.М. Ці гэта аўтабіяграфічная кніга?

К.К. Гэта тое самае, што спытацца ў чарадзея, у чым сакрэт ягоных чараў. Рэч у тым, што мне няма справы да літаратуры, мастацтва, музыкі, танцу. Толькі да аднаго мне ёсьць справа: да чарадзейства. Чарадзейства — гэта такое маніпуляваньне сродкамі, каб нешта раптам выскоквала з старонкі, з партытуры, з сцэны або экрану. Тымчасам музыкі ў нас цяпер больш, чым калі-небудзь, мы глядзім болей фільмаў і чытаем болей кніг, аднак чарадзейства маем штораз меней. Калі глядач, чытач, слухач раптам забываецца хто ён такі, тады ён ведае, што мае дачыненьне з сапраўды вялікім чарадзеем. І ён заўважае, што ўсьміхаецца, і ведае, што чарадзей абыйшоўся зь ім лагодна, але зьдзівіў яго, паказаў яму нешта новае. Калі выдавецтва «Viking» зьвярнулася да мяне з пытаньнем, як яму назваць маю «Скрынку дэмана» — ці гэта раман, ці аўтабіяграфія, я ў адказ запрапанаваў адмовіцца ад этыкетак. Калі нешта раскладаецца па шуфлядах, зьмяншаецца ягоная сіла. Гэтая кніга — нешта новае. Можа, яна не здабудзе посьпеху, аднак калі я на працягу гадоў пісаў гэтыя кароткія тэксты, я загадзя зьбіраўся злучыць іх некалі ў нешта цэлае. Аднойчы Гэрні Норман, зь якім я вучыўся ў Стэнфардзе, сказаў: «Сыне, ты дваццаць гадоў быў на фронце, мы чакаем ад цябе рапарту. Пакажы, што ты маеш. Я дапамагу табе ўсё разам пасклейваць». Вось мы разам і перагледзелі ўсе скрыні й выбралі тое, што, на нашу думку, найлепей адно да аднаго пасавала.

Т.М. Я памятаю вядомы хіпі-раман Гэрні Нормана «Вандроўка боскага права». Ён, здаецца, таксама за доўгія гады нічога не друкаваў.

К.К. Аднак ён увесь час піша. Усе пісьменьнікі, якіх я ведаю, нястомна працуюць. Ёсьць шмат пісьменьнікаў, якія — так як я — маюць поўныя шуфляды, але ня хочуць нічога выдаваць, баючыся крытыкі; у сьвеце сапраўды ёсьць пачвары, якія напаўняюць нас страхам. Пісьменьнікі, што жывуць у Нью-Ёрку й рэгулярна выдаюць кнігі, маюць скуру таўсьцейшую за нашу. Мы жывем у вёсцы. Кожны раз, як я бываю ў Нью-Ёрку, тамтэйшыя людзі даюць мне зразумець, што я правінцыял. Прастак. А гэта не заахвочвае да напісаньня кніг. Хоць далатна ўплывае на саму літаратурную дзейнасьць, бо калі ня думаеш пра выданьне, больш экспэрымэнтуеш, замешваеш дзівосныя формы ў змрочных кухнях розуму.


Пакуль што я ня маю нічога гатовага, што б склала поўную порцыю. Я выдаў «Garage Sale» каб пазбыцца некаторых тэкстаў, ачысьціць поле перад сабою; там няма ніводнай галоўнай ідэі, якую я аднак хацеў мець у «Скрынцы дэмана». Я ўлічваю тое, што сэнс «Скрынкі» будуць выкручваць на дзесяць розных спосабаў, бо ніхто ня будзе ў стане паглядзець на яе бяз сувязі з маёй рэпутацыяй, кнігай Тома Вулфа й падарожжам на аўтобусе. Усё гэта вісіць над «Скрынкай», як смурод; таму я вырашыў выбраць гледзішча пэрсоны, якою нібыта ёсьць і я сам, хоць гэта толькі адна з роляў, якія я адыгрываю ў жыцьці. Хачу збыць яе з плеч. Інакш было б так, як бы Шэкспір раптам стаўся Фальстафам, бо Фальстаф быў яго найбольш папулярным пэрсанажам. Таму Шэкспір мусіць яго ўрэшце забіць. Ён прыкончыў яго раз і назаўсёды ў «Жыцьці Гэнры IV», бо хвост ужо пачынаў махаць сабакам.

Т.М. Шмат амэрыканскіх пісьменьнікаў, зь якімі я размаўляў, скардзяцца, што сёньня недастаткова пісаць, што трэба паказвацца публічна, чытаць урыўкі раманаў. Пісьменьнікі робяцца выканаўцамі, і гэта іх прыніжае.

К.К. Я так ня думаю. Я люблю чытаць; людзі атрымваюць зусім іншы вобраз маёй творчасьці, калі чуюць, як я чытаю, чым калі чытаюць самі. Тут мы зьвяртаемся да дагістарычных часоў; сьлібізаваньне сабе пад нос таго, што напісана на сьцяне пячоры, розьнілася ад слуханьня апавесьцяў дзівоснага старога з агнём уваччу й крывёю на зубах; жывы чалавек выклікае ўражаньне, якога ня ў стане выклікаць ніякая кніга.

Бо тут ёсьць чарадзейства: трэба выйсьці перад людзьмі й завалодаць іх думкамі, усё роўна што ты робіш — пускаеш цені на сьцяне, запальваеш фаервэркі або паказваеш балет на вадзе. Я ўжо пяць гадоў працую над балетам, да якога «Grateful Dead» абяцалі напісаць музыку. Гэта балет, дзея якога адбываецца тысячу гадоў таму, заснаваны на легендзе індзейцаў паютаў — таму ў мяне дома ўсе гэтыя індзейскія маскі — а яшчэ ўсё гэта зьвязана з маім раманам пра Аляску. Балет, маскі, легенды. Трэба не забывацца, што раман — досыць нялаўкая й мімалётная вынаходка. Задоўга да пісьменства йснавалі паданьні й апавяданьні; мне здаецца, што дзякуючы відзастужкам мы вяртаемся да чагосьці даўнейшага. Я сур'ёзна задумваюся, ці ня выдаць мне свайго рамана пра Аляску на відзакасэце. Я маю задуму формы, зь якой можа нічога й ня выйсьці, але я ведаю, што гэта прынамсі крок у слушным кірунку: я б сядзеў перад камэрай і чытаў. Адзін на адзін з публікай. Стужка магла б цягнуцца й шаснаццаць гадзінаў, а я сядзеў бы насупраць і чытаў з тэлеэкрана. Але гэта не было б чыстае апавяданьне, бо я б хацеў выкарыстаць здабыткі кінамастацтва, каб прысьпешыць падзеі. Я б ня мусіў казаць: «калі ён ішоў да машыны, падзьмуў вецер», бо камэра магла б выручыць мяне, паказваючы рух дрэваў, зыбеньне вады, чаплю; гэтыя вобразы дапаўнялі б вэрбальны аповед. Урэшце апісаньні не такія ўжо й істотныя; у Шэкспіра іх няма зусім.

Трэба шукаць новыя формы. Наша сьвядомасьць рухаецца павольна й няўклюдна, як пачвара Франкенштэйна; мы паднялі ўгору нагу й мусім паставіць яе на зямлю, толькі ня надта ведаем дзе. Наша сьвядомасьць ня ведае, куды яна кіруецца. Я часта спрачаюся аб гэтым з Алэнам Гінсбэргам, які вызьвяраецца на ўрад. Але я лічу, што тут не віна ўраду, тут заўсёды віна паэта. Урад не на тое, каб даць нам прыгожы вобраз. Вобраз мусіць ствараць мастак. У шасьцідзясятых гадох пачаў зьяўляцца новы вобраз. Ён быў сапраўды нечым новым, ён ня быў трохвымерны, мы вучыліся інакш думаць, інакш укладаць свае думкі. Калі паслухаць песьні Дылана або Ленана тых часоў, у іх можна пачуць іншасьць і моц; яны выклікалі ў нашых мазгох асацыяцыі як плямы ў тэстах Роршаха, нэўронныя рэакцыі, падобныя да тых, якія ў курыцы выклікае выгляд ястраба. Мы ня ведалі, што рыхтуецца, але адчувалі, што нешта мае адбыцца. І надалей у нас



яшчэ захоўваюцца абрысы таго вобразу, нібы не разьвітая да канца лічынка.

Т.М. Ці, гаворачы пра шасьцідзясятыя гады, сапраўды можна казаць пра зусім новы вобраз? Рух быў значна больш масавы за рух бітнікаў, але ці не ўяўляў ён сабою проста разьвіцьцё тае самае ідэі?

Не. Псыхадэлічны вобраз хіпі — гэта ўсё ж нешта іншае. У бітнікаў не было ЛСД. Іх вобраз палягаў у тым, каб будучы на дне адчуваць сябе на вяршыні. Гэты вобраз ня быў новы, ён быў вынікам існаваньня на ўзбоччы, быцьця чорным, зьвязаны з блюзам. Наш — быў новы, калектыўны вобраз, фармаваны супольнымі сіламі; гэта ня быў вобраз, створаны адным чалавекам, які зачыніўся ў вежы з слановае косьці, а пасьля выйшаў і спрабуе зацягнуць у яе іншых. Кожны адчуваў свой удзел, мы ўсе былі акушэрамі. Але нас затрымалі. Быў затрыманы ўвесь рух, ва ўсім сьвеце. Таму мяне арыштавалі, таму арыштавалі Лэры МакМэртры, Алэна Гінсбэрга. Уласна кажучы, усіх, каго я ведаў. Усе мы кудысьці імкнуліся, і нас затрымалі, засадзілі ў турмы, корпаліся ў нашых мазгох. Калі выйдзеш на волю, ты ўжо ня той самы чалавек. Падобнае было й з Кэнам Бэбсам і іншымі пасьля вяртаньня зь Віетнаму. Ты вяртаесься, функцыянуеш і нібы ўсё ў парадку, але шнар застаецца. Нас затрымалі ад страху, хоць мы нікому не хацелі зрабіць нічога кепскага. Ты бачыў фрагмэнты фільма, здыманага падчас нашага падарожжа аўтобусам; дык жа відаць, што ў нас няма небясьпекі, што мы поўныя добрае волі.

Т.М. З кнігі Тома Вулфа вынікае, што галоўнай мэтай падарожжа аўтобусам была прапаганда ЛСД, што ў гэтым палягала твая роля ў руху шасьцідзясятых гадоў.

К.К. Не. Я нікога б не намаўляў ужываць наркотыкі. Пра гэта ня думалі людзі, міма якіх мы праяжджалі на нашым аўтобусе. Мы нікому не казалі: «Ужывайце наркотыкі». Нічога падобнага нікому б і ў галаву не прыйшло, калі б Вулф пра гэта не напісаў. Ніхто ня ведаў, што мы ўжываем наркотыкі, і мы зусім не хацелі, каб хто-небудзь даведаўся. Нас была купка з дванаццацёх чалавек, што аб'яжджалі плянэту, спрабуючы сурочыць грамадзтва. Нас зусім не хвалявала, каб усе да нас далучыліся. Калі з гэтага нарабіўся вялікі вэрхал і рок'н'рол, я выйшаў з гульні. Мяне больш цікавяць маленькія купкі людзей, чым кандыдацтва на пасаду прэзыдэнта. Я заўсёды хацеў быць індывідуалістам, таму й ніколі не намаўляў людзей рабіць, як я. Хай кожны робіць тое, што сам найболей любіць; такая сытуацыя найздаравейшая.

Т.М. У тваім салёне заўсёды ляжыць барцоўскі мат. Ты, яшчэ калі быў студэнтам, займаўся барацьбой, пасьля навучыў сыноў. Джон Ірвінг таксама займаўся барацьбой, перш чым пачаў пісаць. Ці адчуваеш ты з гэтай прычыны нейкую сувязь зь ім?

К.К. Я мог бы зьесьці трох Ірвінгаў і запіць чаркай віна. Ён у лёгкай вагавай катэгорыі, а ягоная творчасьць з шмат якіх гледзішчаў непрыстойная. Прыблізна праз паўтара месяца пасьля сьмерці Джэда я быў запрошаны на сустрэчу з вучнямі школы, разьмешчанай недалёка ад таго месца, дзе адбыўся выпадак. Хоць тэрмін быў вызначаны загадзя, я мог адмовіцца, але адчуваў, што гэта нешта важнае, і вырашыў ехаць. Мне зарэзэрвавалі пакой у матэлі насупраць шпіталя, у якім памiраў Джэд. Выявілася, што гэта той самы пакой, у якім мы тады спыняліся з жонкай; я падумаў, што гэта невыпадкова. Цэлы дзень я гаварыў з вучнямі, якія ведалі пра майго сына, і гэта надавала маім словам выключную сілу. Увечары я вярнуўся ў матэль; гэта быў першы вечар пасьля сьмерці Джэда, калі мы з Фэй не былі разам. Сяджу я ў тым самым пакоі й думаю толькі пра тое, а якраз у тэлевізіі круцяць фільм «Сьвет паводле Гарпа», якога я раней ня бачыў. Я й кнігі да канца не прачытаў, бо ў нейкі момант яна проста пачала мяне злаваць. І вось я сяджу ды гляджу фільм, і штораз болей уцягваюся, бо закручваецца ўсё цікава, але пасьля выяўляецца, што ўвесь фільм, уся кніга зводзяцца да адной сцэны, калі Гарпава жонка адкусвае каханку чэлес. Бо ж Гарп страціў сына!

Усё гэта вялікае ашуканства, усё гэта сьмярдзіць, гэты тып ня ведае, што ён піша. Страта сына — гэта глыбокая й сур'ёзная справа, гэта ня мае ніякае сувязі з тым, што жонка адгрызла некаму чэлес! Нядаўна я пазнаёміўся з Робінам Ўільямсам, які выконваў галоўную ролю; у яго таксама ёсьць дзеці, і ён цалкам са мною згодны. Ты маніпулюеш намі, Ірвінг, а ў канцы нічога нам не даеш, у канцы нічога няма! Паміж людзьмі, якія перажылі трагедыю, узьнікае нешта незвычайнае. Повязь мацнейшая за тую, якую дае супольная радасьць. Чалавек мусіць прайсьці праз сабачае гаўно, каб знайсьці прыгожую кветку. Але несправядліва ставіць людзей у становішча, калі яны мусяць адчуваць боль, а пасьля разыграць гэта так, быццам бы гаворка йшла пра нейкую драбязу. Ірвінг прымушае нас пакутаваць і ўзамен не дае палёгкі. А ў гэтым заданьне пісьменьніка; ён мусіць зрабіць так, каб людзі чуліся лепей і лепей думалі пра іншых. Калі нечыя кнігі або музыка не прыносяць нам суцяшэньня, можна падцерці імі азадак, ня варта траціць на іх часу. Таму я не люблю творчасьць у стылі Кундэры; у канцы нічога не ўздымае нашага духу. У «Гамлеце» ўсе гінуць, аднак мы чуемся падмацаванымі. Мы слухаем IX сымфонію Бэтховэна і, выходзячы з залы, адчуваем, што ў нас ёсьць нешта такое, пра што мы раней не здагадваліся.

Але вось ідзеш на фільм Робэрта Алтмана і, выходзячы з кінатэатру, адчуваеш, як ты стаўся меншым. Шмат славутых сучасных фільмаў прымушаюць адчуваць сябе меншым. Героі большыя, Амэрыка большая, а чалавек меншы. Я лічу гэта паразай, няўменьнем стварыць вобраз, калі пачвара мусіць паставіць паднятую нагу. Мы ў палове экспэрымэнту: мы шукаем спосабу, каб пазьбегнуць канца сьвету. Або мы зьменім наш спосаб мысьленьня, або ўсё скончыцца.

Т.М. Я ня ўпэўнены, ці сапраўды можна вінаваціць мастацтва ў тым, што яно паказвае людзям, якія яны малыя. Калі кніга або фільм разбураюць самазадаволенасьць чалавека, гэта часта мае вельмі станоўчы вынік. Шчасьлівыя канцы ўвогуле бываюць даволі банальныя. Раней мы гаварылі пра фільм Джорджа Рамэра «Ноч жывых нябожчыкаў». На тваю думку канец там...

К.К. Брыдкі!

Т.М. Аднак калі б ня змрочны канец, калі б чорны, што бароніцца ад нябожчыкаў, ня быў застрэлены, фільм быў бы значна горшы.

К.К. Не. Шмат людзей памыляюцца, лічачы, што дастаткова змрочнага канца, каб нарадзілася сапраўднае мастацтва. Няпраўда. Я не настойваю, каб усе выжылі; як я сказаў, у «Гамлеце» гінуць усе. Але ж мы зусім інакш чуемся, паглядзеўшы п'есу Шэкспіра, чым пасьля фільму «Ноч жывых нябожчыкаў»! Бо паглядзеўшы яго, маеш уражаньне, што ўсе вакол — гаўно. Нішто гэты фільм не апраўдвае. Я ведаю, што гэткія карцінкі маюць посьпех і іх будуць вырабляць заўсёды. Ня думаю, што трэба гэтаму перашкаджаць, але я лічу, што той, хто марнуе жыцьцё й талент на пісаньне такога сьмецьця, будзе мучыцца ў чысцы. Гэта сапраўды непрабачальна. Лёгка знайсьці ў парку сабачае гаўно, лёгка знайсьці ва ўсім штосьці адмоўнае, лёгка крытыкаваць, але пры гэтым трэба ўмець прайсьці праз гаўно й знайсьці цудоўную кветку. А што дае прыгнятаньне чытача або гледача?

Дастаткова паглядзець на «Герніку». Гэта суворая, уражальная карціна, але стаіш перад ёй і адчуваеш, што гэта страшна выдатная карціна. Яна ўздымае твой дух, неяк дакранаецца да цябе; ты ведаеш, што Пікаса паказвае табе вайну, але ня кажа, што яна будзе цягнуцца вечна, што няма іншага выйсьця.

Людзі робяцца штораз больш матэрыялістычныя, штораз больш прыземленыя. І сапраўды цяпер усё цяжэй глядзець у далячынь, глядзець у будучыню, не наварочваючыся ў будызм і не ўпадаючы ў наркаманію, бо ўсё — зямля, неба — забруджанае. Калі людзі чытаюць «Сьвет паводле Гарпа» й вераць, што сьвет менавіта гэтак выглядае, дык раман забруджвае нашу дарогу да вобразу будучыні. Кожны думае, што ў рукі яму трапіла кніга, якая кудысьці яго прывядзе, скажа яму нейкую праўду пра людзей, а пасьля вывядзе яго. Тым часам Ірвінг вядзе чытача ў глухі кут. Гэтак кожны можа. Таму «Мобі Дык» такі цудоўны раман. Ён прыгнятае, але паказвае нам выхад зь лябірынту, апавядае пра першабытную сілу, уяўляе сабою ўслаўленьне жыцьця як такога. Нельга чытаць «Мобі Дыка» і не адчуваць узьняцьця духу. Як кажа Біблія: цешыцца маё сэрца.

Т.М. Я пачынаю разумець. Хоць МакМэрфі гіне ў канцы «Палёту над зязюліным гняздом», смутак разраджаецца ўцёкамі Вялікага Правадыра, чытач нешта атрымвае ў канцы.

К.К. Слушна. Бо калі б індзеец таксама загінуў... Кашмар! Хоць я мушу прызнацца, што падчас спэктаклю мне хочацца ўстаць, калі ўсе ўгаворваюць МакМэрфі, каб ён уцякаў, а ён упіраецца, што яшчэ крыху застанецца. Мне хочацца ўстаць і крыкнуць з залі: «Уцякай, дурань! Бо ж мы ўсе ведаем канец! Уцякай! Пакінь усіх астатніх на сцэне, яны як-небудзь дадуць сабе рады й безь цябе, штосьць прыдумаюць! Уцякай хутчэй!» Я б хацеў, каб ён і сапраўды скочыў праз вакно. Бо можна паўтараць тую самую памылку пэўную колькасьць разоў. Урэшце трэба ўмець сабе сказаць, што гэтым разам я знайду лепшае рашэньне. Гэтым разам зраблю ногі.

Але вяртаючыся да таго, што я казаў раней — мы ўсе маем патрэбу ва ўзьняцьці духу. Вельмі мала пісьменьнікаў гэта робіць. Таму я люблю Тома Робінса. Ён надзвычай забаўны, крыху звар'яцелы, выклікае цудоўны настрой... А калі я чытаю Апдайка, я сабе думаю, нічога дзіўнага, Апдайк, ты ніколі не высоўваў носа далей за Ўсходняе Ўзьбярэжжа, прыедзь да нас на Захад і паглядзі, як у сапраўднасьці выглядае сьвет, мы прасунуліся значна далей за цябе. Нельга ўгрэзнуць у адным месцы й няспынна паўтараць, што гарады занепадаюць, што людзі ў іх паміраюць, бо гэта нібы маеш шоры на вачох і сам пачынаеш паміраць. Няшмат раманаў апісвае больш змрочныя справы, чым «Гронкі гневу» Стэйнбэка, і аднак гэтая кніга ўздымае наш дух, бо ў ёй адчуваецца перакананьне, што незалежна ад таго, як усё кепска, справы неяк уладзяцца, сьвет будзе йснаваць надалей, чалавецтва выжыве. Гэтага пачуцьця не выклікае «Рэмба» або іншыя сучасныя фільмы, сучасная літаратура. Яны паказваюць нам героя, які прыходзіць і выцягвае ўсіх з самых безнадзейных сытуацыяў, такі нібы-Хрыстос з стрэльбай, але апрача гэтага яны нічога нам не даюць.

Т.М. Падчас нашых размоваў пра літаратуру мяне зьдзівіла, што нягледзячы на вагу, якую ты надаеш экспэрымэнтаваньню й пашырэньню магчымасьцяў мовы, ты ня цэніш Джойса, Дос Пасаса й Набокава так высока, як Хэмінгўэя й Стэйнбэка, якія мне падаюцца даволі традыцыйнымі: я мяркую, што сёньня яны ўжо ня шмат чаго маюць нам запрапанаваць.

К.К. Трэба думаць пра іх на фоне іхнага часу; літаратурная творчасьць, як і бокс, праходзіць розныя фазы, мяняецца стыль, але ў сваім часе гэтыя двое былі сапраўды вялікія. Хэмінгўэй гэта волат. Шмат пісьменьнікаў падаюцца добрымі на фоне сваёй эпохі, але па нейкім часе адыходзяць у нябыт. Мэлвіл, Фолкнэр або — глянуўшы яшчэ далей у мінуўшчыну — Шэкспір, напэўна маюць больш трывалую пазыцыю за Джойса. Я й цяпер у вольныя хвіліны люблю чытаць Хэмінгўэя, бо ў яго шмат чаму можна навучыцца, хоць, ясная справа, не таму, пра што гавораць крытыкі. Найбольш істотнаю я лічу ягоную псыхадэлічнасьць. Бальшыню часу ён мусіў хадзіць добра ўклаўшы, піць значна болей абсынту, чым нам здаецца.

Ён не стварыў вялікага амэрыканскага рамана, бо ягоныя кнігі не пра Амэрыку. Не стварыў і Фолкнэр, бо ягоныя раманы занадта статычныя. Для мяне вялікі амэрыканскі раман мусіць мець у сабе рух, так як «Мобі Дык» або «Прыгоды Хаклбэры Фіна». Ён мусіць быць зьвязаны з амэрыканскім прызначэньнем, з пэрыядам, важным для гісторыі краіны, і неяк уставіць туды пэрсанажы. Якраз таму я лічу «На поўдзень ад Бразас» Лэры МакМэртры сапраўды вялікім раманам, вялікім амэрыканскім раманам. Але цяжка параўноўваць пісьменьнікаў; літаратурная творчасьць — гэта не спартовыя спаборніцтвы. Калі выходзіць добрая кніга, ад гэтага выйграюць усе пісьменьнікі. Ведучы заняткі, я часта паўтараю студэнтам, што яны не павінны спаборнічаць між сабою. Кожны раз, як нехта з нашай старой кампаніі з Стэнфарду выдае новую кнігу й заваёўвае посьпех, у мяне робіцца цёпла на сэрцы — як калі Лэры атрымаў Пуліцэра. Але тое самае датычыць таксама іншых пісьменьнікаў; посьпех аднаго прыносіць славу нам усім. Я ганаруся, што займаюся тым самым рамяством, што й Джозэф Конрад. Калі я пішу, я прагну быць гэткі ж верны сваёй прафэсіі, як і Конрад, Хэмінгўэй, Дос Пасас. Яны былі шляхетнымі ваярамі, а ўважаючы, што творчасьць — гэта сапраўдная барацьба, трэба імкнуцца да таго, каб змагацца як яны — з гонарам.

Ex Libris
Пераклаў SS

Палёт над гняздом хахулі

abc

«Вось сымбаль твой, забыты краю родны!»

... У хахулі таксама няма гнязда...

Нягледзячы на неверагодную сьпёку, сёлета вада ў нашых рэках ня ўпала так, як тое было ў 92-м. Выпраўка традыцыйнае штогадовае экспэдыцыі «НН» гэтым летам была ў поўным сэнсе мэтаваю. Мы дасьледавалі раку Асьцёр, прайшоўшы яе ад Смаленскай вобласьці да Сажа па Клімавіцкім і Крычаўскім раёнах у пошуках істоты, якая для нас стала сымбалем і пачаткам рубрыкі «abc» («НН» №2 1991).

Апошні раз хахулю (Dosmana moschata), бачылі ў гэтых раёнах усходняе Магілёўшчыны ў 1955 г. Асьцёрская (сажанская) папуляцыя беларускага падвіду хахулі з 1951 г. была апошняй натуральнай папуляцыяй у нашым краі. Чырвоная Кніга Беларусі, што выйшла ў 1993 г. ужо не фіксуе хахулю, такім чынам выкрэсьліўшы яе зь беларускай фаўны. Спраўдзіць гэта й была прызначана дасьледчыцкая група «НН» на Магілёўшчыне 12.06.1994.

У 1849 г. у бухце Даскі (паўднёвая выспа Новае Зэляндыі) паляўнічыя злавілі невядомую раней птушку, якая порстка бегала па сьнезе й адважна супраціўлялася спробам яе злавіць. Гэта вялікая груваcткая птушка зь зялёным пер'ем, сінімі грудзямі й галавою мае вялікую магутную дзюбу й моцныя ногі ярка-барвовага колеру — такахе (Notornis hochstetteri). Да 1898 г. было выяўлена толькі чатыры такія птушкі. Аднак, у 1948 г. на зьдзіў усяму сьвету натуралістаў, такахі былі адкрытыя зноў у маленькай даліне Навазэляндзкіх Альпаў блізу маляўнічага возера Тэ-Анаў. Вывучэньне пацьвердзіла наяўнасьць звыш сотні асобнікаў гэтае птушкі. Каб захаваць такахе, ды яшчэ адну унікальную папугу — какапа (Strigops habroptilus) на гары Бруса быў створаны дзяржаўны рэзэрват дзеля разьвядзеньня гэтых птушак. Адкрыцьцё такахе другі раз праз паўстагодзьдзя — нярэдкі прыклад для Новае Зэляндыі, дый для сусьветнае практыкі.

Адно з наймацнейшых уражаньняў сёлетняе экспэдыцыі на Магілёўшчыну — гэта няспынная гаспадарчая дзейнасьць у так званых «радыяцыйных» раёнах. Паўсюль на палях машыны, паўсюль нехта нешта будуе...

Асьцёр — глыбокая, даволі хуткая рака з маляўнічымі пустыннымі берагамі. У Беларусі яна пачынае выкручвацца, берагі становяцца месцамі зусім стромкія. Распараныя сонцам трысьнягі, мята, безьліч кветак б'юць гострым водарам, як вечаровыя флёксы на могілках.

Нашая пільнасьць, зь якою мы ад пачатку ўгляданіся ў кожны корч, у норы на берагох са спадзевам убачыць тое, дзеля чаго плылі, пачала прыгасаць ад сьпякоты. Ажно нарэшце на пляскатых берагох каля ўпадзеньня ў Асьцёр Сасноўкі (зьлева), мы пабачылі на ранішнім мокрым пяску даўгія пісягі ад хахулiных хвастоў і адбіткі іхніх лапаў, якія ні з чым іншым зблытаць ня можна. На наступную раніцу, яшчэ да сьвітанку, мы йшлі ўжо на тое месца, што было ўсыпана аскепкамі сьлімаковых ракавінаў — рэшткамі начнога баляваньня хахуляў.

Калі ж з супрацьлеглага стромкага берагу пачуўся гогат ці то качкі ці то парсюка — сумневаў не засталося. Яны яшчэ ёсьць. Ёсьць тыя істоты з качынымі лапкамі, якія, наеўшыся, дурэюць, засунуўшы сабе хобат у рот, — задаволена гагочуць.

За тыя тры дні, што мы прабылі на поўначы Клімавіцкага раёну з 16.06 па 19.06 нам давялося пабачыць хахуляў двойчы. Бліжэйшае знаёмства зь імі было немагчымае, а каб сфатаграфаваць іх патрэбная адмысловая тэхніка. Спробы затрымаць хахуляў мы не рабілі, бо яны адчайна енчаць і скуголяць, выяўляючы сваю кранальную безабароннасьць, нягледзячы на ўсю порсткасьць, зь якой яны лавіруюць у падводных зарасьцях.

Тут, на сумежжы Магілёўшчыны й Смаленшчыны, балазе пасьля прыпыненьня мэліярацыі й зьніжэньня тэмпаў гаспадараньня наогул (усё ж радыяцыя...), хахулі здолеюць выжыць. Аднак без нацыянальнае аховы гэта немагчыма. Галоўнымі ворагамі гэтых жывёлаў на сёньня сталіся норкі ды андатры, непрадумана інтрадукаваныя за савецкім часам.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Валянціну І. зь Менску. «Наша Ніва» — ня тое выданьне, чытачоў якога трэба было б пераконваць у гэтым.

Алесю М. зь Віцебску. Газэты раздражняюць, калі *вашай* сярод іх няма. Але кожны робіць тое, што можа і што лічыць патрэбным.

Ігару Ц. зь Віцебску. Беларусі не развал можа пагражаць, а падзел, бо яна ўсё яшчэ аб'ект палітыкі іншых дзяржаваў. Сваёй галавы пакуль няма... Газэту атрымалі. Але досыць пра кепскае. Напішыце што-небудзь добрае.

Віталю зь Менску. Пра маладзёжны рух можна даведацца ў Менску на вул. Варвашэні, 8.

Андрэю Ш. зь Менскага раёну. Калі ўзяць адзін з эпізодаў і зрабіць зь яго сюжэтнае апавяданьне (перад тым пачытаўшы, напрыклад, Эдгара По), то вашыя пачуцьці могуць стаць зразумелыя ня толькі вам.

Фундатары «НН»:

Магілёўская Рада БНФ — $600
Сяргей Мурог зь Менску — $20
Віталь Кажан з ЗША — $30
Аўген Протас з ЗША — $40
Gan Ainm — Cúig Chéad Punt

Вялікі дзякуй!



НАША НВА №11(29) Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Рэдактар Сяргей Дубавец. Заснавальнік і выдавец Павал Жук. Адрасы для допісаў: 220123 Менск, а/с 71 альбо 2041 Вільня, а/с 2082. Падпісны індэкс 63125, Steigimo liudijimas Nr.1178. Рэдакцыя (Менск, Іванаўская 56 альбо Вільня, Жыгімонта 12/2): Алег Дзярновіч (адк. сакратар), Сяргей Харэўскі (маст. рэдактар), Андрэй Антонаў (набор); пры ўдзеле Сяргея Шупы. Афсэтны друк. Фармат А3. Агульны наклад 20 тыс. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом Друку» (220041 Менск, пр. Скарыны, 79). Кошт дамоўны. Падпісана ў друк 21.12.94. Замова 1795